# ПАМЯЦЬ

## МІЁРСКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА»
1998

# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ...

### Так пачыналася вайна

Вестка аб пачатку вайны была ўспрынята жыхарамі Міёршчыны насцярожана, са страхам і трывогай. У гэтым прыгранічным раёне яшчэ не забыліся на ваенныя дзеянні, якія вяліся не так даўно, у 1939 г. Партыйнымі і савецкімі органамі Міёрскага раёна ў адпаведнасці з дырэктывай урада была праведзена работа па ўзняцці працоўных на адпор ворагу. Літаральна з першых дзён камітэтам партыі пачалі арганізоўвацца групы і атрады, якія дапамагалі часцям Чырвонай Арміі, што вялі баі на тэрыторыі раёна, а затым сталі асновай створаных партызанскіх атрадаў. Адначасова вяліся аператыўныя работы па захаванні калгаснай маёмасці. Аднак ажыццявіць намечаныя планы не ўдалося. Фронт імкліва набліжаўся. 3-я нямецкая танкавая група да 4 ліпеня 1941 г. захапіла невялікі плацдарм на ўсходнім беразе Заходняй Дзвіны ў раёне Дзісны. Часці 22-й арміі адступалі з цяжкімі баямі.

Вось як аб тых трагічных падзеях расказваюць дакументы 126-й стралковай дывізіі, якой камандаваў генерал-маёр Кузняцоў.

«2 ліпеня ў раёне м. Казяны часці дывізіі фарсіравалі р. Дзісна...

3 ліпеня праціўнік стаў перапраўляцца ўброд праз р. Дзісна. Наша артылерыя адкрыла агонь. Завяршылі разгром часцей праціўніка камандзір мінамётнай роты 690-га сапёрнага палка лейтэнант-ардэнаносец Дарашэнка і камандзір кулямётнай роты гэтага палка старшы лейтэнант Сіянаў...

4 ліпеня ўвесь дзень вялася моцная артылерыйская дуэль...

Праціўнік кідаў у бой усё новыя і новыя сілы, ствараючы вялікую перавагу ў тэхніцы і колькасным саставе. Часці нашай дывізіі вымушаны былі адысці на новыя рубяжы ў раёне р. Зах. Дзвіна. У ноч на 5 ліпеня фарсіравалі раку, заняўшы абарону на заходнім беразе ў раёне фальварка Казуліна.

У час фарсіравання ракі часці дывізіі падвергліся абстрэлу штурмавой авіяцыі праціўніка. У 18.00 дывізія выступіла ў напрамку Боркавічы—Баравуха-1».

У журнале баявых дзеянняў гэтай дывізіі за перыяд з 28 чэрвеня па 7 ліпеня 1941 г. запісана: «Дывізія адыходзіла па прылеглай да Полацка мясцовасці. Адыход здзяйсняўся пад бесперапыннымі налётамі бамбардзіровачнай і штурмавой авіяцыі і ўздзеяннем наземнага праціўніка, пры адсутнасці харчоў і фуражу, гаручага і сувязі з вышэйстаячымі штабамі (11-й арм.)».

Дывізія пераправіла ўброд людзей

і абоз праз рэкі Вілія, Заходняя Дзвіна, Дрыса. Яна адступала па тэрыторыі ад Германавіч да Дзісны і фарсіравала Заходнюю Дзвіну ля Валынцоў. Услед за ёй праз Дзісну наступалі 19-я танкавая дывізія і часці 14-й мотадывізіі 57-га корпуса праціўніка, за імі рухаліся 81-я і 206-я пяхотныя дывізіі 23-га корпуса. Вядома, устаяць супраць такіх сіл савецкія воіны не маглі. 4 ліпеня 1941 г. апошнія часці Чырвонай Арміі пакінулі гэтыя мясціны. Па тых жа дарогах яны будуць вяртацца праз тры гады.

А пакуль ашаламляльна хутка наступаў вораг, палалі вёскі, лілася кроў, разбураўся прывычны ўклад жыцця. Міёршчына была акупіравана праз два тыдні пасля нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз — 2—3 ліпеня 1941 г.

## З дзённіка І. А. Лапіцкага

У пачатку ліпеня 1941 г. першыя бежанцы прайшлі праз Дзісну. Эвакуіраваліся сем'і служачых. Неўзабаве пачаўся рух адступаючых воінскіх часцей з танкамі, артылерыяй, абозамі. Праходзілі праз горад, мост, скіроўваліся на Полацкую вуліцу. Чутны былі ўзрывы бомбаў, нямецкія бамбардзіроўшчыкі рабілі налёты на адступаючыя савецкія войскі і скапленні бежанцаў. Трэба было і нам тэрмінова перабрацца ў вёску Слабада да родных за 7 км ад Дзісны.

Не паспелі мы выехаць з горада, як з'явіліся два варожыя бамбардзіроўшчыкі. Яны праляцелі ў бок Полацка і адразу павярнулі назад, засыпалі бомбамі кварталы, пераправу праз Дзісну. Былі разбураны будынкі пошты, ваенкамата, забіта і паранена шмат людзей.

На перакрыжаванні галоўных вуліц нас напаткала ноч. У паніцы і шалёным адчаі беглі людзі, не разумеючы, куды бягуць, абы ўратавацца. Навокал палымнеюць пажары, чорныя хмары дыму плывуць над зямлёй, засцілаюць неба. Наўкола забітыя, раскіданыя рэчы, перакуленыя павозкі, у сутаргах корчацца параненыя. У цяжкім маўчанні грукочуць салдацкія тачанкі, гудуць варожыя самалёты, чуюцца моцныя ўзрывы бомбаў і частыя стрэлы зенітак.

У лесе ля Шарагоў нас затрымалі савецкія салдаты, якія акапаліся ўздоўж дарогі. Яны суправаджалі павозку да Пагулянкі, а там параілі ехаць хутчэй і не вельмі глядзець па баках. Відаць, баяліся нямецкага паветранага дэсанта.

У Мікалаёве былі ўжо эвакуіраваны сельсавет, сельпо і пошта. Толькі начальнік пошты яшчэ заставаўся ля тэлефона.

Па бальшаку Германавічы — Дзісна адступалі савецкія войскі, якія ў абход Дзісны ад Сіцькова скіроўваліся на Дзянісава і Грыгаравічы да Дзісны, дзе перапраўляліся праз раку ўброд. Па дарозе Лужкі — Дзісна, што на правым беразе Дзісёнкі, наступалі немцы. Яны спяшаліся перарэзаць шляхі адыходу. Над адступаючымі савецкімі войскамі бесперапынна кружыліся нямецкія разведвальныя самалёты.

Неяк у Слабадзе і Мікалаёве ўзнялася вялікая трывога. Нехта сказаў, што ў 3 кіламетрах ад Слабады, у Сіцькове, акопваюцца савецкія войскі, немцы ідуць у напрамку Мікалаёва і Слабады, чакаецца бой. Многія сем'і з гэтых вёсак паўцякалі хто куды. Мы перакачавалі ў Лугаўцы-3 да родзіча Пятра Гіргеля. Да яго на хутар бесперастанку прыбягалі савецкія салдаты: адны — перакусіць, другія — папіць вады.

Мы былі сведкамі, як над нашым хутарам на невялікай вышыні сто цяжкіх нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў праляцелі ў бок Дзісны, сталі бамбіць савецкія ўмацаванні ў лесе за Дзвіной. Гаварылі, што там праходзіла «лінія Варашылава». Нам тады здавалася, што там усё разбіта ўшчэнт, але потым расказвалі: гэтая бамбёжка вялікай шкоды ўмацаванням не нанесла.

# З успамінаў А. М. Манцэвіч

Аляксандра Міхайлаўна Манцэвіч напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працавала настаўніцай у Міёрскім раёне. У гады вайны — камісар падпольнага партызанскага атрада «Масква» 4-й Беларускай брыгады. Узнагароджана пяццю медалямі.



А. М. Манцэвіч

Великая Отечественная война застала нас с мужем в деревне Малая Ковалевщина, где мы работали учителями. Эвакуироваться не успели. Старшая дочь, 20-летняя Тоня, только что проводила на войну своего мужа, первого секретаря Миорского РК ЛКСМБ И. И. Мельника. Вскоре появились фашистские мотоциклисты — наглые, самоуверенные, жестокие.

Как-то к нам зашли двое окруженцев — командиры красной Армии Кудаев и Светлолобов. Мы помогли им переодеться в гражданскую одежду, накормили, приютили. Они устраивали засады у фашистских переправ через Двину, проводили беседы с населением, укрепляли у людей уверенность в победе над врагом. Вскоре эти парни собрали группу окруженцев и ушли, рассчитывая прорваться через фронт. Больше мы о них ничего не слышали, но в трудную пору они оказали нам большую моральную поддержку.

Нашлись предатели, которые донесли фашистам на моего мужа. Его арестовали и через несколько дней казнили в Полоцке. Но смерть любимого человека не сломила моего духа. Я решила продолжать борьбу. Вскоре арестовали и меня. И не быть бы мне на свободе, если бы не находчивость односельчан. Они убедились, что гитлеровцы падки на взятки, и выкупили меня.

В деревнях стали создаваться подпольные группы, первоначально состоявшие из 2—3 человек и еще не имевшие единого центра. Я поддерживала связь со всеми подпольщиками. В июле их уже насчитывалось 27 человек. Помню Ивана Федоровича Лакотко, Ивана Васильевича Лакотко и их родителей, Дмитрия Борка и его родителей, Виктора, Игнатия и Павла Сушко, Иосифа, Павла и Сергея Счастных. В дальнейшем количество подпольщиков и подпольных групп неуклонно росло.

Первоначально мы помогали выходившим из окружения советским воинам, снабжая их гражданской одеждой и продуктами питания, укрывали их, помогали переправляться через Западную Двину и Дисну. Кроме того, нарушали телефонную связь, перерезали провода, спиливали столбы, разрушали мосты. Так, подпольщики разрушили мост на дамбе в Черессах.

Меня снова арестовали фашисты, но, ничего не добившись, вынуждены были освободить и на этот раз. Предложили работать учительницей в Чересской школе, где директором была моя дочь Тоня. Коллектив в школе подобрали неплохой. Кроме меня и дочери здесь работали Алексей Милун, Мария Казюлина (позже жена Сергея Счастного). Работать приходилось в условиях жестокого фашистского террора.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 478.*

## Дакументы сведчаць

### З АКТА МІЁРСКАЙ РАЁННАЙ НАДЗВЫЧАЙНАЙ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННІ ЗВЕРСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

**19 красавіка 1945 г.**

В 1941 г. в июле месяце в м. Миоры прибыла немецкая комендантская воинская часть, по указанию которой было собрано мирное население м. Миоры и прилегающих других населенных пунктов, после чего указанная немецкая воинская часть произвела кровавую расправу над собранным мирным населением. По нескольку сот человек немецкие варвары загоняли людей в лес в урочище Крюковка, северо-восточную окраину м. Миоры, где немцы и производили расстрел ни в чем не повинных советских людей, в результате чего было расстреляно 678 человек. Кроме того, были расстреляны цыгане и пленные красноармейцы. Расстрел производил комендант жандармерии Куба и его помощники обер-лейтенант Шур, Франке Вильгельм и Бродский Эрнст...

*Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 7021. Спр. 217. Воп. 92. Адз. зах. 276.*

# АКУПАЦЫЯ І АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ

Тэрыторыя Міёрскага раёна была поўнасцю захоплена нямецкімі войскамі 5 ліпеня 1941 г. Дзісна акупіравана яшчэ раней — 30 чэрвеня. 1 ліпеня па ўказу каменданта палявой жандармерыі обер-лейтэнанта Галя была праведзена аблава на жыхароў горада. Кожны пяты з захопленых немцамі быў расстраляны.

Фашысцкае камандаванне адразу ж прыступіла да ўвядзення «новага парадку» на тэрыторыі раёна. Увогуле германская акупацыйная палітыка ўяўляла сабой шырокі комплекс мер, неад'емнымі часткамі якіх разам з жорсткім тэрорам і вынішчэннем насельніцтва былі ліквідацыя ідэалагічных і палітычных асноў дзяржавы, разбурэнне яе прадукцыйных сіл, масавае рабаўніцтва жыхароў, паўсюднае ўвядзенне рабска-прыгоннай арганізацыі працы. Што датычыць Беларусі наогул, тут быў адразу праведзены адміністрацыйны падзел, у адпаведнасці з якім Віцебская вобласць (і Міёршчына) была аднесена да так званай вобласці армейскага тылу групы армій «Цэнтр». У сваю чаргу яе тэрыторыя, як і іншыя, падзялялася на акругі (гебіты). Тэрыторыя Дзісеншчыны і Міёршчыны адыходзіла да Глыбоцкай акругі. Акругу ўзначальваў нямецкі стаўленік — гебітскамісар. У Браславе знаходзілася павятовая ўправа на чале з бургамістрам, у Міёрах і Дзісне — валасныя ўправы. У кастрычніку 1941 г. для Міёрскай воласці быў зацверджаны штат упраўлення, куды ўваходзілі «9 солтысаў грамадскіх».

«Новы парадак» пачаўся з арыштаў і расстрэлаў партыйна-савецкага актыву. У першыя дні акупацыі быў схоплены і пасля жорсткіх катаванняў расстраляны ў Полацку дэлегат Народнага сходу Заходняй Беларусі Ф. Д. Манцэвіч.

У маёнткі вярталіся былыя памешчыкі, пачало ўзнімаць галовы кулацтва і нямногія з асаднікаў, якія тут засталіся. Землі калгасаў, усю грамадскую маёмасць фашысты аб'явілі ўласнасцю Германіі. Насельніцтва абкладалася шматлікімі падаткамі. Каб хоць неяк дабіцца «прыхільнасці» насельніцтва, «новая» ўлада ішла на некаторыя ўступкі ў культурна-асветнай галіне, мясцовым адміністрацыйным кіраванні, працы з моладдзю. Гебітскамісар Глыбоцкай акругі Паўль Гахман распрацаваў план работы ў напрамках палітыкі, эканомікі, школьнай справы і інш., каб супрацьстаяць «бандытам», як немцы называлі партызан. Аднак ніякія «добрыя» захады не маглі прыкрыць сапраў-

дныя намеры фашыстаў у вынішчэнні тых, хто не адносіўся да абранай арыйскай расы. З ростам скрытага, а потым і адкрытага супраціўлення мясцовага насельніцтва ўсё часцей сталі праводзіцца карныя аперацыі супраць мірных жыхароў, яўрэяў. Паводле архіўных даных, у тагачасным Міёрскім раёне былі замучаны і спалены жывымі 1902 чалавекі (па іншых звестках — 3000 чалавек). У Дзісенскім раёне фашысты знішчылі 4584 чалавекі без уліку яўрэяў. Ад карнікаў найбольш пацярпелі жыхары Ліпацінскага, Мікалаеўскага, Заазёрскага, Язненскага і іншых сельсаветаў раёна.

Пачынаючы з 1942 г. працаздольных маладых людзей пачалі адпраўляць у Германію. Усяго за час вайны з Дзісеншчыны было вывезена 8000 чалавек, з іх 3815 мужчын і 4185 жанчын. З Міёршчыны на прымусовыя работы ў Германію адправілі больш 2000 чалавек.

На працягу ўсіх гадоў акупацыі нямецкія захопнікі мэтанакіравана выконвалі асноўную задачу сваёй палітыкі — планамернае знішчэнне насельніцтва. Для гэтага існавалі канцлагеры, турмы, праводзіліся карныя аперацыі.

## Трагедыя ў Блошніках

На расшырэнне народнага супраціўлення нямецка-фашысцкія захопнікі адказвалі масавымі расстрэламі мірнага насельніцтва. Толькі ў адной брацкай магіле ў пясках за Дзісной пахаваны 3722 жыхары горада. Масавыя расстрэлы праводзіліся і ў Міёрах, звычайна на хутары Крукаўка (паблізу мясакамбіната).

Жудасная трагедыя адбылася ў Блошніках — так называлася раней сучасная в. Калінавае, што ў саўгасе «Юбілейны» (Язненскі сельсавет). У пачатку лістапада 1943 г. у родныя мясціны завіталі маладыя партызаны Міша Фяськовіч і Саша Ермакоў. Заначавалі яны ў Сямёнчыках. На бяду, туды наведаліся самаахоўцы. Партызаны паспелі ўцячы, але ў спешцы забыліся сумку, у якой захоўваліся спісы насельніцтва, што дапамагала народным мсціўцам. Самаахоўцы расправіліся ў Сямёнчыках з сем'ямі У. С. Папялы, дзе спыніліся хлопцы, і В. М. Сапеля, спалілі іх хаты.

А нядзельным днём у Блошнікі прыехалі карнікі. Вёску акружылі, паставілі кулямёты, пачалі страляніну. Усіх жыхароў сабралі разам, выстраілі ў шарэнгу насупраць царквы. П'яныя карнікі спачатку стралялі кожнага пятага, потым — праз аднаго. Тут загінулі Пётр Фадзеевіч, Павел Іванавіч, Рыгор Іосіфавіч, Рыгор Фадзеевіч Дармаковічы, Міхаіл Жойдзік і многія іншыя, нават 10-гадовая Марыя Кавалёнак. Фашыст падышоў да дзяўчынкі, пагладзіў па валасах, штосьці сказаў і стрэліў у галоўку.

У той дзень хавалі жыхара вёскі В. І. Кавалёнка. Усіх, хто ішоў за труной, таксама паставілі ў тую ж шарэнгу. Конь з нябожчыкам на возе хадзіў па вёсцы цэлыя суткі.

Адначасова карнікі палілі хаты. У агні загінулі 70-гадовая Еўдакія Фяськовіч, Марыя Дармаковіч, настаўнік Д. Е. Хвашчоў. Выратаваліся толькі тыя, хто паспеў схавацца або ўцячы. Сярод уцёкшых была дачка настаўніка Люда. Яна паведаміла аб трагедыі партызанам. Жудасная расправа спынілася, калі з боку Сямёнчыкаў раздалася аўтаматная чарга: стралялі народныя мсціўцы. Іх было толькі трое, але карнікі ў паніцы пачалі ўцякаць. Усе людзі кінуліся ў розныя бакі. Ім было наканавана жыць.

Сярод жывых — Вера Іосіфаўна Сыратокіна. Яна ўспамінае:

— Мяне клікалі на рынак, але я не пайшла. Навязала карову. Мамка цапліла печ, татка стаяў ля вакна і казаў: «Снілася сёння, што прыйшлі немцы і пачалі на вокнах ставіць крыжы». Хутка сапраўды ля хаты з'явіліся немцы. Карнікі выкінулі нас у сені. Падпалілі сеннікі, падушкі. Пачаўся пажар. Фельд-

фебель стаў расстрэльваць — спачатку тату, маму, потым мяне. Па мне стралялі шэсць разоў, а я засталася жыць. Першая куля адбілася ад пальца (я засланілася рукой), прайшла па краю вачэй і пераносіцы. Я засталася сляпой. Два раненні ў шчаку, адна куля трапіла ў плячо і затрымалася ў ватоўцы. Я вывалілася на вуліцу з сяней. Неяк адсунула бервяно, якое тут ляжала. Фашыст заўважыў, што я жывая, і выстраліў яшчэ два разы. Адна куля трапіла ў плячо, другая — у шыю, прайшла ля соннай артэрыі. Я ляжала пад яблыняй. Партызаны перашкодзілі завяршыць суд над усімі намі...

Толькі з адной вёскі вайна забрала 60 жыццяў. А яшчэ карнікі поўнасцю спалілі вёскі Залесся. Нярэдка палаючыя дамы станавіліся магіламі для іх гаспадароў. Брацкія магілы вайна пакінула ў Язне, Новым Пагосце, іншых населеных пунктах раёна.

*Н. В. Папёл*

## Трагедыя ў Дзісне

### З дзённіка І. А. Лапіцкага

У Лугаўцах-3 мы былі тры дні і вярнуліся ў Слабаду, калі рух савецкіх войск спыніўся. У Мікалаёва і Дзісну ўступілі немцы. Пачалася ўзмоцненая прапаганда. У Слабадзе, Мікалаёве, Сурханаве былі ўстаноўлены гучнагаварыцелі, і ў перадачах немцы гаварылі аб поспехах сваёй арміі, што Масква акружана і хутка здасца. У адной з такіх перадач гучаў зварот сына Сталіна, узятага ў палон, да бацькі з заклікам аб капітуляцыі.

На другі дзень пасля прыходу немцаў жонка накіравалася ў Дзісну, каб даведацца, у якім стане знаходзіцца пакінутая там наша маёмасць. Усё было разрабавана. У кутку кватэры сядзела старая яўрэйка Шульман са сваімі рэчамі, а ў двары ля вогнішча гаспадарылі немцы.

У гэты ж дзень на вуліцы Агароднай, дзе знаходзілася наша кватэра, немцы здзейснілі страшэннае зверства супраць мясцовага насельніцтва. Жонка расказвала, што нямецкія жандармы сагналі з вуліцы ўсіх мужчын і паставілі ў рад. Потым прыйшоў палкоўнік і спытаў: «Хто з вас ноччу перарэзаў тэлефон?» Усе ад жаху проста акамянелі і маўчалі. «Калі не выдасце віноўніка, будзеце ўсе расстраляны». Усчаўся лямант і плач: «Мы нічога не ведаем, мы не вінаватыя!» Палкоўнік адабраў 10 чалавек, у асноўным падлеткаў, і даў знак салдатам адвесці іх да агароджы. Лямант і плач так узмацніліся, што заглушылі кулямётную чаргу, якая скасіла ахвяр. Дзеці былі расстраляны на вачах маці. Сярод іх два браты Грэйнеманы, сын Салкі, Збышак Нароўскі. З апошнім атрымалася так. Калі немцы зганялі мужчын, яго не было дома. Ён з'явіўся потым і кажа маці: «На вуліцы відаць, што немцы выстройваюць людзей для адпраўкі на работу, пайду і я». Маці адгаворвала яго, папярэджвала, але ён не паслухаў. «Я і ўчора працаваў у іх на мосце. Добра заплацілі», — сказаў і пабег. Стаў у рад, калі палкоўнік адбіраў людзей для расстрэлу.

Ці быў у сапраўднасці перарэзаны тэлефон? Не. Самі немцы потым гаварылі, што ўсё гэта ўчынена для застрашвання.

## Устанаўленне ўлады. Тэрор

### З дзённіка І. А. Лапіцкага

У гарадах і сельскай мясцовасці пачалося аднаўленне органаў кіравання, што існавалі пры палякахх. Бургамістрам Дзісны быў назначаны Брынкевіч, сакратаром — Сонцаў, камендантам паліцыі — Свінярскі. Войтам Мікалаеўскай гміны — Бялевіч, сакратаром — Багуцкі, камендантам паліцыі — Ваўжынец Малькевіч і яго намеснікам — Стах Альхімовіч. Палякі лічылі, што такія парадкі немцы захаваюць назаўсёды, а таму стараліся дагадзіць ім, заслужыць іх давер.

Пачалося праследаванне беларусаў, паляванне па падазрэнні ў прыналежнасці да камуністычных арганізацый і за беларускімі дзеячамі. Шмат было арыштавана і расстраляна. Сярод іх вядомы ў раёне як свядомы беларус настаўнік Кузьма Крук. У ім палякі бачылі небяспечнейшага ворага і ўсімі сіламі імкнуліся знайсці хоць нейкую прычыну для арышту і расстрэлу. Ім доўга не давялося шукаць. У суседняй вёсцы адбывалася вечарына, арганізаваная мясцовай моладдзю. На вечарыне з'явіўся няпрошаны п'яны паліцэйскі з вінтоўкай. Ён пачаў паводзіць сябе брыдка, наводзіць свае парадкі. Занепакоеная гэтым моладзь, даведаўшыся, што ў вёсцы выпадкова знаходзіцца настаўнік Крук, звярнулася да яго за парадай, што рабіць. Крук параіў адабраць у паліцэйскага вінтоўку і здаць яе войту ў гміне. У выніку Крука абвінавацілі ў падштурхоўванні да паўстання, арыштавалі і на наступны дзень расстралялі.

З першых жа дзён акупацыі немцы пачалі прымяняць цялесныя пакаранні. Бесперапынна была ў дзеянні «бочка». Правінавачаных клалі на бочку і гумай збівалі да паўсмерці.

Так немцы пры дапамозе палякаў вялі суд і расправу над беларускім насельніцтвам.

У Слабадзе на беразе Дзісёнкі, у Смычку, немцы арганізавалі лагер для савецкіх ваеннапалонных, абнесены калючым дротам, з вартавой вышкай. Харчоў палонныя ад немцаў не атрымлівалі. На працягу двухтыднёвага тэрміну існавання лагера іх карміла мясцовае насельніцтва. Нават з аддаленых вёсак па рацэ на лодках дастаўляліся малако, хлеб і інш. Пры ліквідацыі лагера немцы адабралі шэсць палонных «цёмнаскурых» і расстралялі на вачах у мясцовага насельніцтва. А колькі расстраляна па дарогах пры эскорце на захад! Расстрэльвалі ўсіх змучаных і хворых, што не маглі ісці. Расказвалі пра такі выпадак. Па дарозе Дзісна — Лужкі немцы прыкладамі падганялі адстаўшых палонных. Адзін з іх выхапіў у немца вінтоўку і прыкладам разбіў яму галаву. Палоннага, вядома, расстралялі на месцы. Але побач з яго целам ляжаў труп фрыца.

У верасні 1941 г. немцы раздалі шмат ваеннапалонных вяскоўцам для палявых работ. Ім былі выдадзены кантрольныя кніжкі, з якімі яны павінны штотыднёва з'яўляцца ў паліцыю для праверкі.

Зямельныя ўчасткі, коней, статак і інвентар калгасаў вернуты іх уладальнікам, ураджай падзелены паміж былымі калгаснікамі пароўну. Гаспадаркамі памешчыкаў у маёнтках кіравалі немцы праз давераных мясцовых жыхароў, якіх кантралявалі афіцэры-гаспадарнікі.

## Дакументы сведчаць

### НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІЯ ЗАХОПНІКІ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЛІ КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ Ў МІЁРСКІМ РАЁНЕ

1. Куба — комендант жандармерии. По его приказу производились расстрелы еврейского населения.

2. Франке Вильгельм — обер-мейстер, лейтенант. Помощник коменданта жандармерии. Проводил расстрелы населения в м. Миоры.

3. Бродский Эрнст — лейтенант. Участвовал в расстреле еврейского населения м. Миоры.

4. Гамбер — жандарм, лейтенант. Производил расстрелы граждан Леонпольского с/с.

5. Трам — производил массовые расстрелы в м. Миоры и участвовал в угоне граждан в Германию.

*Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 7021. Спр. 217. Воп. 92. Л. 66.*

## З ЗАГАДУ КАМЕНДАНТА БЕЛАРУСІ КАМАНДУЮЧАГА ВЕРМАХТА «ОСТЛАНД» БЕХТОЛЬСХЕЙМА

Пераклад з нямецкага

**20.09.1941**

14. В целях безопасности по всей Белоруссии для гражданского населения вводится комендантский час с 20-00 до 5-00. В это время ни одно гражданское лицо не имеет права находиться на улице. В особо срочных случаях, например, врачи, акушерки и лица, занятые на специальных работах, должны иметь от этих учреждений пропуск сроком на 48 часов. Нарушители приказа будут задерживаться патрулем, а при попытке к бегству расстреливаться. Бургомистры должны довести до населения изложенное выше распоряжение.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 10.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак*

## З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

Пераклад з нямецкага

**7.07.1941**

II. **О запрещении оставления квартир в ночное время**

1. В период с 21-00 до 5-00 утра населению запрещается покидать квартиры.
2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях, врачами, акушерками, на машинах скорой помощи.
3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

VIII. **Создание вспомогательной полиции**

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь в вспомогательную полицию надежных «фольксдойче», белорусов и, если таковых не имеется, то поляков и использовать эту полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.

2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатцкомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.

3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью «Вспомогательная полиция».

4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а впервые к 20.7.1941 года, сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 2, 4 5.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак*

## З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

Пераклад з нямецкага
**7.07.1941**

**I. О назначении бургомистров в волостях**

1. На должности бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица по возможности из числа белорусов.

2. Бургомистр является представителем волости.

3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.

4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.

5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.6.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.

6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Он должен всеми средствами предотвращать акты саботажа. В его обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.

8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 000 жителей назначает комендант полевой комендатуры.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак*

## З ДАКУМЕНТАЎ МІЁРСКАЙ ВАЛАСНОЙ УПРАВЫ, 1941—1942 гг.

Браслаўская павятовая ўправа
7.10.1941 № 719-ш
Волостному старшине в Миорах

Для вашей волости утвержден штат 9 (девять) солтысов громадских, с коих солтыс громады получает по 100 руб. в месяц начиная с 1.10. 1941 года...

Начальник уездного управления
др. Ковальский

* * *

Браслаўская павятовая ўправа
6.1.1942 № 167/41
Валасному старшыні ў Міёрах

Пан Гебітскамісар распараджэннем ад 21 снежня 1941 г. зацвердзіў найменаванне вуліц у мястэчках вашай воласці, каторыя падаю ніжэй на нямецкай і беларускай мовах:

| | |
|---|---|
| Städtchen Miory | м-ка Мёры |
| Strassenname: | найменаванне вуліц: |
| Grossestr. | Вялікая |
| Kirchenstr. | Касцельная |
| Uferstr. | Надбярэжная |
| Schulstr. | Школьная |
| Sportstr. | Спартыўная |
| Markstr. | Рынкавая |
| Gartenstr. | Садовая |
| Poststr. | Паштовая |
| Neuestr. | Новая |

Пры гэтым даручаю Вам дакладна праверыць ужо напісаныя найменаванні вуліц і згодна з гэтым распараджэннем натыхмястова заступіць новымі надпісамі ў нямецкай і беларускай мове, звяртаючы пільную ўвагу на правідловае выкананне надпісаў.

Старшыня павятовай управы
др. Кавальскі

**АБ'ЯЎЛЕННЕ**

Згодна распараджэння Павятовага Гаспадарніка (Зондэрфюрэра) ад 2 траўня 1942 года паведамляецца, што сяляне, каторыя гоняць самагонку, будуць расстрэлены.
Кажды спатканы ў п'яным выглядзе будзе пры хуткім разборы справы асуджаны.

Старшыня валаснай управы

* * * *

Дня 21 траўня 1942 г.
Гебітскамісар
Глыбокае

Глыбокае, дня 27.8.1942 г.
Начальніку раёна
ў Міёрах

Справа: Ахова ўраджаю.

Каб сабраць і забяспечыць ураджай, абавязкова каб усё насельніцтва, а мяноўна кожны чалавек, ці гэта селянін ці рамеснік, праз свой асабісты ўдзел чынна памагаў, каб унемажлівіць знішчэнне ўраджаю праз сабатаж. Помач у ліквідаванні выступаючых у раёне бандаў ёсць абавязкам кожнага жыхара. Кожны жыхар, каторы сяброў банд дакавіць нямецкім уладам, або сваім мальдункам паліцыйным уладам, або іншым нямецкім уладам, дапаможа знішчэнню банд, дакажа ў гэты спосаб, што мае добрую волю дапамагчы ў адбудове і тады можа чакаць узнагароды. Паліцыя поўніць свае абавязкі. Разам з ёй можа прыняць безгранічны ўдзел кожны асобны чалавек пры збіранню і забеспячэнню ўраджаю, канечна патрэбнага, ня хопіць гэтага, каб ураджай толькі зьвясьці, але трэба яго плянова сьцерагчы. Гэта работа павінна быць праведзена праз насельніцтва. Калі б паміма маёй адозвы цэнны ураджай быў знішчаны праз сабатаж, тады б быў бы змушаны правясьці проціў раёна найцяжэйшыя рэпрэсыі наложаныя. Натуральныя налогі, нягледзячы на ніякія акалічнасці, павінны быць выпаўненыя, калі б кожнага чалавека трэба было б па-

цягнуць да выпаўненьня гэтага. Дзеля гэтага ёсць у асабістым інтарэсе кожнага жыхара, пры забеспячэнні ўраджаю, праз свой удзел перашкодзіць усякім пробам сабатажу проці ўраджаю. Жыхары, каторыя асабліва адзначыліся пры нішчэнню банд, павінны быць мне мальдованы асобым рапартам аб дастарчанай помачы. Распараджэнне гэта трэба натыхмястова падаць да ведама насельніцтва раёну. Прашу зараз жа даць загад усім краёвым уладам, а асабліва старшыням і солтысам.

Гебітскамісар
Гахман

* * *

Міёрская раённая ўправа
№ 557

Атрымана 28.8.1942 г.
Усім валасным старшыням
Міёрскага раёна

...набор у Германію на працу ўжо закончаны. З Глыбоцкай акругі больш работнікаў браць не будуць. Цяперашні час вымагае пільнай працы ўсім супольна.

Як стала вядома спадару Гебітскамісару, у часе набору ў Германію многа мужыкоў ухілілася ад выезду, а на месца таго пайшлі ў лясы, згрупаваліся ў асобныя банды і час ад часу грабяць насельніцтва, вандруючы па краю. Усе сем'і, члены якіх знаходзяцца ў такой вандроўцы, павінны зараз жа паведаміць іх, каб як найхутчэй вярталіся дамоў да сваёй спакойнай працы.

Хто да 15.9.1942 г. вернецца да сваёй працы, той не будзе караны за свае праступкі. Хто пасля гэтага часу не вернецца дамоў, а будзе бадзяцца па лесе і калі будзе злоўлены, палічыцца разбойнікам і будзе караны паводле ваеннага часу — расстраляны.

Сп. сп. валасныя старшыні, солтысы і выбарныя павінны ўжыць усіх сродкаў, каб гэткія асобы былі звернуты да сваёй дамовай ціхай працы.

Хто зьвернецца дамоў, на аснове гэтага распараджэньня, валасным старшыням не трэба аб гэтым даносіць. Данясці трэба толькі аб тых, якія хочуць у другой мясцовасці жыць, хаця яны там ніколі не жылі або там працавалі і пакінулі тую мясцовасць перад наборам у Германію.

З боку нямецкіх улад не будуць карацца сем'і тых, хто дапусціў гэтага праступку, калі пакінуць гэтым займацца. А калі не, дык нямецкія ўлады за ўсе шкоды цялесныя і матэрыяльныя, зробленыя нявіннаму насельніцтву, адплацяць строгай карай тым сем'ям, члены якіх бадзяюцца па лясох.

Начальнік раёна

## РАСПАРАДЖЭННЕ
## АБ КАРНАЙ УЛАДЗЕ РАЁННЫХ НАЧАЛЬНІКАЎ

Глыбокае, дня 15.12.1942 г.

У цэлю ўтрымання публічнага парадку ў гебіце пастанаўляю:

**1.**

Раённыя начальнікі маюць права выдаваць карныя распараджэнні адносна тых асоб, каторыя падлягаюць мясцовай судовай уладзе. Мясцовай судовай уладзе не падлягаюць немцы, прыбыўшыя з Нямеччыны.

**2.**

Карнымі распараджэннямі могуць быць караныя выступленні супроць загаду раённага начальніка і падлягаючых яму службовых устаноў.

3.

Кара можа быць наложана толькі тады, калі справа добра выяснена і віна сцверджана.

4.

Лёкальна прыналежны ёсць раённаму начальніку, на тэрыторыі каторага каральны ўчынак быў папоўнены, як і той, на тэрыторыі якога вінаваты прабывае.

5.

Накладаныя могуць кары да 50 РМ, у выпадку паўтарэння найвышэй да 100 РМ.

6.

Кара абвінёнаму павінна быць падана да ведама пісьмова (карнае паведамленне).

7.

Апэляцыі супроць карных паведамленняў могуць унасіцца пісьмова.

8.

Распараджэнне гэта ўходзіць у сілу з дня 15.12.1942 г.

Сцверджана
*подпіс неразборлівы*
Рэферэнт гебіту

Гебітскамісар
У З.
Пэтэрсан
Гебітскамісар

Дзяржархіў Віцебскай вобласці. Ф. 2841. Воп. 1. Спр. 1. Зв. 1. С. 1, 6, 8, 13, 37, 48, 91, 98, 120.

## Выжыў цудам

У 1994 г. жыхар в. Аблятова С. М. Кашкур атрымаў ліст з Германіі.

«Шаноўны пан Кашкур!

Мы перасылаем Вам як вынік нашых пошукаў выпіску-дакумент аб Вашым арышце.

Калі ў Міжнароднай службы пошукаў з'явяцца ў будучым новыя даныя, то Вы атрымаеце без заяўкі адпаведны адказ».

У афіцыйным дакуменце ўказваецца, што Станіслаў Кашкур, рускі ці паляк, нарадзіўся 2.8.1914 г. у в. Аблятова, рымска-каталіцкай веры. Фермер, парабак, будаўнічы рабочы, халасты. Арыштаваны 18 ліпеня 1942 г. у Любау дрэздэнскай паліцыяй.

Вось што расказаў у сувязі з гэтым сам Станіслаў Міхайлавіч Кашкур, які і цяпер жыве ў в. Аблятова:

— Асабліва запомніўся чэрвень 1942 г., а дакладней — 22 чэрвеня. У гэты дзень павесткі солтыса сабралі шмат моладзі ў Александрыне, колішнім цэнтры гміны, сельсавета, а затым і мясцовай акупацыйнай улады. Былі гэта ўсё нежанатыя хлопцы і незамужнія дзяўчаты — моладзь з Рачнёва, Александрыны, Паташні, Сташулёў і іншых навакольных вёсак. Ці добраахвотна ехалі? Як на гэтае пытанне адказаць, калі клікала і абавязвала ехаць жорсткая акупацыйная ўлада? Але ад'язджалі яшчэ без узброенай варты. На падводах даехалі да Браслава. У Браславе прайшлі камісію, потым па вузкакалейцы дабраліся да Дукштаў, далей на вялікім цягніку і ўжо з аховай праз Варшаву скіраваліся ў Нямеччыну. Выгрузілі нас у нейкі халодны хлеў, дзе пераначавалі. Потым адправілі ў агароджаны зборны пункт, дзе сабралася шмат рускіх, украінцаў, беларусаў, палякаў. Адтуль нас бралі на працу. Трапіў у невялікі гарадок, памяць не захавала нават яго назвы. Там працаваў разам прыкладна з дваццаццю землякамі на пілараме. Праца і дома на зямлі была не лёгкая, але тут пры вельмі дрэнных харчах жыццё здавалася невыносным. Таму згаварылася нас восем чалавек уцячы. Былі сярод іх людзі з Дубавых, Тарарак, іншых нашых мяс-

цін. Лавіць нас пачалі адразу, таму, каб лягчэй было ратавацца, разбегліся. Мы засталіся ўдваіх, харчаваліся маладой бульбай, елі жытнёвыя каласы. Раніцай, калі мы, знясіленыя, спалі, на нас натрапіў узброены ляснік. Адбылося гэта 18 ліпеня 1942 г. у Любау, арышт правяла дрэздэнская паліцыя. Амаль месяц трымалі ў турме, вялі допыты, катавалі. 18 жніўня пад нумарам 9070 дастаўлены ў канцэнтрацыйны лагер Бухенвальд. У паперах адзначалася: абаронны арышт, палітычны вязень.

У канцлагеры ўтрымліваліся рускія, украінцы, беларусы і палякі. Адразу стаў сведкай, як павесілі на шыбеніцы чатырох рускіх, якія збіраліся ўцячы. І гэта з-пад калючага дроту ў тры рады, які яшчэ знаходзіўся пад напругай, пры пастаянных вартавых на вышках. Ураджанне было вельмі моцнае, знясільваючае, як праца ў каменяломні. Парадак у лагеры быў такі: ні секунды без працы і без справы. Закурыць можна было толькі два разы на дні, і курава тое даставалі ў нямецкіх повараў за пайку хлеба. Калі заняцца не было чым, пераносілі каменне з месца на месца. Каменне ад нас на павозках адвозілі яўрэі, запрэжаныя замест коней па восем чалавек. Яшчэ займаліся будаўнічымі работамі, перавозілі і пераносілі цэглу.

Напэўна, такая палітыка была ў немцаў, што доўга заседжвацца ў адным месцы не дазвалялі. А таму 12 кастрычніка 1942 г. аказаўся я ў Кёльне, канцлагеры Бухенвальд-3. Тут знаходзілася будаўнічая брыгада СС. Яна займалася ўзвядзеннем новага канцлагера. Па рацэ на баржах прывозілі шчыты зборных будынкаў, мы тыя шчыты па 8—10 чалавек неслі ў лагер, дзе з іх хутка манціравалі будынкі. Умовы былі тут не лепшымі, раніцай хлеб з вадой, у абед суп-баланда. І ўсё ж аказалася, што гэта яшчэ не самае горшае месца ў нямецкай няволі.

Асабіста для мяне самым горшым быў канцлагер Натцвайлер, куды трапіў 15 снежня 1942 г. Знаходзіўся ён на вышыні 1 км над узроўнем мора на адзіночнай гары, да вяршыні якой аўтамашыны дабіраліся па спіралі. Тут давялося ўбачыць шмат французаў. Усе мы працавалі ў каменяломнях, кіркамі дзяўблі камяні, з якіх насыпалі пляцоўкі. Штодзень гінулі людзі, пастаянна дыміўся дымок у крэматорыі. Мне не пашанцавала, вельмі пабіў нагу каменем, да ўрача звяртацца пабаяўся. Калі ж вымушаны быў пайсці, пачуў: «Трэба было ўчора прыходзіць, а то трапіш у крэматорый». Напэўна, той нямецкі ўрач быў не з горшых. Загаіў ён нагу, хаця шрам застаўся на ўсё жыццё.

Яшчэ адна асаблівасць канцлагера — білі нас бязлітасна. Ад пабояў, халадоў і знясільваючай працы толькі французаў памірала штодзённа па восем чалавек. Нас з 200 чалавек, якія прыбылі ў лагер адначасова, выжыла восем. Сярод васьмі гэтых быў я, тады нумар 1925. Дарэчы, па прозвішчы нас ніколі не называлі. На грудзях і штанах былі прышыты чырвоныя трохкутнікі з нумарам. Гэта ўсё, што ў канцлагеры заставалася ад чалавека.

Пасля Натцвайлера канцлагер Дахау, куды трапіў 11 верасня 1943 г. пад нумарам 50 894, здаўся ледзь не раем. Тут білі значна менш. Да таго ж трапіў у кухонную каманду з васьмі чалавек, якая чысціла бульбу і моркву. Значыць, ужо так, як раней, не галадаў. Але ў Дахау затрымаўся не вельмі доўга. 20 красавіка зноў аказаўся ў лагеры Натцвайлер, толькі не ў тым месцы, дзе раней. Калі памяць не падводзіць, гэта быў Азбург. Нумар мой быў 12410. Сюды даходзілі чуткі аб справах на фронце. 26 ліпеня зноў чакаў канцлагер Дахау. Менавіта тут і вызвалілі мяне амерыканцы. Хаця апошнія тыдні былі не такімі простымі. Ганялі нас з лагера ў лагер, пакуль у адным з іх не заўважылі, што немцаў на вышках няма. Тады прарвалі дрот. Мне запомнілася, што натрапіў на поле капусты кальрабі, наварыў яе, наеў і адчуў сябе крыху мацнейшым. А нас ужо два дні не кар-

мілі. Было гэта 1 мая 1945 г. Выйшаў на дарогу, па якой рухаліся амерыканскія войскі. Салдаты, убачыўшы чалавека ў паласатым адзенні, зняволенага, кідалі цукеркі, шакалад, кансервы. Мы ўсё падбіралі. У адным населеным пункце мяне сустрэў амерыканскі афіцэр, які крыху разумеў па-польску. Ён прынёс нямецкі касцюм, кавалак масла. Потым амерыканцы крыху падкормлівалі нас, але не вельмі. Суп таксама давалі раз у дзень, хаця гэта была ўжо не нямецкая баланда, а нармальная ежа. Калі параніў палец на назе, то заўважыў, што нават кроў памяняла колер. Яна стала нейкая шараватая. Але самае страшнае ўжо было ззаду. Наперадзе — вяртанне дамоў, у роднае Аблятова, у якім пражыў потым усё жыццё.

*Запісаў Л. А. Матэленак*

## З успамінаў Галіны Маркаўны Барклянскай (Алеська), непаўналетняга вязня канцлагера ў Лодзі

— Летам 1942 г. у нашай в. Труды, што на Узмёншчыне, з'явіліся карнікі. Наша сям'я дапамагала партызанам, і таму ўсіх нас арыштавалі. Не пашкадавалі яны і мяне, сямігадовую малую. Прывезлі нас у Грамы, што ля Полацка. Там размясцілі ў сырых цэментаваных складах, выдалі па бохану хлеба. Дарэчы, гэты хлеб у параўнанні з тым, што нам давялося есці потым, яшчэ быў найлепшым.

Неўзабаве нас пасадзілі ў таварныя вагоны з кратамі. Прывезлі спачатку ў лагер у Саласнілсе, дзе ўсіх абстрыглі і вымылі пад халодным душам. Далейшы наш маршрут ляжаў у Штуцэр. Там аддзялілі мужчын, разам з імі бацьку і братоў, Хрыстафора і Расціслава. Потым сталі адбіраць дзяцей у жанчын. У некаторых з іх былі немаўляты, і трэба было бачыць, як матулі з нечалавечай сілай прыціскалі малых да сябе. Тады фашысты пачалі секчы шаблямі па руках жанчын... Ля лагера была вырыта траншэя, і некаторыя маці жывымі кlаліся ў яе разам з забітымі дзецьмі. Пасля ўсіх пагналі па бараках: жанчын у адзін бок, дзяцей — у другі.

Барак, дзе знаходзілася я, размяшчаўся побач з мужчынскім. Іх раздзялялі толькі два рады калючага дроту. Нас, рабят, кармілі такой жа пахлёбкай, як і дарослых.

Жанчыны, якія жылі ў суседнім бараку, у тым ліку і мая мама, прыносілі нам страву са шчаўя, у якой варылі гнілое мяса. Здаралася, што ў гэтым варыве мы бачылі чарвей, аднак увагі на іх не звярталі: галодныя і змучаныя, мы з'ядалі ўсё, што нам давалі.

Аднойчы паглядчыцы (а імі былі нямецкія жанчыны) заўважылі, як мама прынесла мне сваю пахлёбку, і яе за гэта жорстка збілі.

Дзеці ў лагеры не хварэлі, яны проста паміралі ад холаду і голаду. Зусім аслабеў і мой брат Хрыстафор. Яго нават выкінулі ў трупярню, з якой быў адзін шлях — у крэматорый. Але палякі з ліку ваеннапалонных, якія абслугоўвалі гэтыя страшэнныя печы, заўважылі, што хлопчык яшчэ жывы. Яны яго абагрэлі, падкармілі і зноў адправілі ў барак.

Праз некаторы час усіх дзяцей сабралі і павезлі ў Лодзь. Там нас адразу ж пусцілі пад душ. Прычым вада ў ім была то вельмі халодная, то гарачая. Відаць, фашысты выпрабоўвалі, хто з малых здольны выжыць.

У лагеры была ваенная дысцыпліна. Па камандзе ўставалі, ішлі ў сталовую, садзіліся за стол. Калі хто-небудзь не паспяваў выканаць каманду, яго чакала жорсткае пакаранне. Слабых і абяссілеўшых малых маглі гадзінамі ганяць па тэрыторыі лагера, прымушалі стаяць пад халодным дажджом.

Адзін з баракаў у лагеры быў агароджаны, і мы не ведалі, што робіцца за перагародкай. Іншы раз адтуль чуўся піск. Аднойчы ноччу нам усё-такі ўдалося заглянуць у гэтае памяшканне. На

падлозе мы ўбачылі дзяцей. Яны былі ледзь жывыя, падобныя на шкілеты. Нават крычаць ці плакаць у малых не было сіл, і яны толькі пішчалі. Там жа стаялі штатывы з замацаванымі трубачкамі, прабіркі, а днём хадзілі людзі ў белых халатах.

Мая сястра разам з іншымі старэйшымі рабятамі працавала ў памешчыка. Вечарам іх дастаўлялі зноў у лагер. І калі была магчымасць, то кожны са старэйшых стараўся прынесці хаця б некалькі буракоў, каб падкарміць малых. Якая гэта была радасць для нас! Буракі з'ядаліся тут жа, імгненна, нямытымі.

Лагер быў агароджаны калючым дротам, і на ўсёй яго тэрыторыі, дакуль магла дастаць дзіцячая рука, уся трава і карэнне былі вырваны і з'едзены рабятамі...

Ніколі не забуду радасныя хвіліны вызвалення. Мы кінуліся да нашых салдат, хапалі іх за рукі, ногі, яны ж, дарослыя, прайшоўшы ўсю вайну, плакалі, гледзячы на нас.

Савецкія воіны даставілі нас у медсанбат, а потым, раздабыўшы нам адзенне, развезлі па дзіцячых дамах. Я аказалася ў Саратаўскай вобласці. Сястра Феня так і не дачакалася Дня Перамогі. Яна памерла ў Лодзі. Нябожчыцы «пашанцавала» ў тым, што яе не спалілі ў крэматорыі, як многіх іншых. Якраз у гэты час прыехалі прадстаўнікі Чырвонага Крыжа, і немцы вымушаны былі зрабіць сапраўднае пахаванне. Сястра ляжала ў труне, я і браты стаялі побач. Нас сфатаграфавалі, а затым нават выдалі па булачцы з маргарынам.

*Запісала Ф. К. Шугальская*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ ГЛЫБОЦКАГА АКРУГОВАГА КАМІСАРА ПАЎЛЯ ГАХМАНА ГЕНЕРАЛЬНАМУ КАМІСАРУ БЕЛАРУСІ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЦЫВІЛЬНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ ГЛЫБОЦКАЙ АКРУГІ З ВЕРАСНЯ 1941 г. ДА ЛІПЕНЯ 1944 г.

**16 жніўня 1944 г.**
**г. Данцыг-Лангфур**

Глубокский округ был принят под немецкое гражданское управление 20.9.1941 г. Исходя из понимания того, что покорение территории в 11 000 кв. км с населением в 400 000 человек требует способного и оперативного административно-управленческого аппарата, сначала со всей интенсивностью началось в Глубоком создание такого управленческого аппарата. Я был вынужден как можно быстрее укомплектовать местный управленческий аппарат способными и надежными работниками. Эта необходимость с самого начала отвечала моим целям: использовать в округе для выполнения поставленных вермахтом и рейхом задач, имеющих важное и решающее значение, только самое незначительное число немецких сил.

После того как созданный местный управленческий аппарат стал отвечать поставленным задачам, округ был разбит на три района: Глубокский, Поставский и Браславский, волости и общины, во главе которых был поставлен немецкий руководящий штаб, возглавляемый окружным комиссаром. Тотчас же началась работа в хозяйственной, продовольственной, сельскохозяйственной, а несколько позже и в трудовой областях. Этим самым были приняты необходимые меры для обеспечения снабжения фронта промышленной и сельскохозяйственной продукцией. Задачи гражданского управления были направлены на удовлетворение нужд фронта. Для более интенсивной эксплуатации территории вскоре оказалось необходимым разделение Глубокского округа на 9 районов вместо существовавших трех: Глубокский, Дуниловичский (позже Воропаевский), Поставский, Браславский, Дисненский, Миорский, Плисский, Шарковщинский и Докшицкий (позже Парафьяновский). Это новое административное деление оказалось крайне целесообразным во всех отношениях. Оно привело к дальнейшему повышению производительности в промышленности и в особенности в сельскохозяйственном производстве.

Глубокский округ почти исключительно сельскохозяйственного направления с огромными озерами, в особенности в Миорском и Браславском районах, первоначально занимал

территорию в 11 000 кв. км с населением в 400 000 человек, из которых примерно 2/3 составляли белорусы и 1/3 поляки.

Осуществление разносторонних задач гражданского управления на первых порах не встречало никаких затруднений. К сожалению, во второй половине 1942 г. вследствие появления то там, то здесь бандитов наступили трудности, которые на первых порах не мешали осуществлению поставленных задач. Однако такое положение систематически и во все возрастающих масштабах изменялось, так как постоянно и все больше вражеские силы просачивались через линию фронта, и, кроме того, противник выбрасывал на парашютах активных руководителей НКВД и сотрудников. Дополнительных собственных сил для борьбы с противником, действующим отныне как бандиты, в нашем распоряжении не имелось. Слабые немецкие силы начальников СС и полиции, а позже и коменданта полиции округа с навербованными местными полицейскими даже сообща были не в состоянии покончить с бандитской деятельностью. Вермахт для этих целей не выделял военных сил. Мои постоянные усилия расквартировать в сельской местности располагающиеся в Глубоком немецкие части, штабы и обозы оказались безуспешными.

Бандитская обстановка с конца 1942 г. и до эвакуации из Глубокского округа 1 июля 1944 г. безудержно обострялась, что привело к тому, что уже в 1943 г. ездить по районам округа без надежной и достаточной охраны было невозможно. Грабежи и диверсионные акты бандитов постоянно возрастали и превзошли всякую допустимую меру. Полицейских сил коменданту полиции округа едва хватало, чтобы обеспечить охрану и безопасность окружного центра и районных городов с находящимися в них под немецким командованием слабыми постами жандармерии. Но и в них стали неизбежны нападения бандитов и диверсионные акты. Особенно угрозе подвергалось местное население, работающее на пользу немцев. Бандиты убивали и грабили имущество этих лиц. Под давлением бандитов некоторые волостные управления и многие сельские старосты без надлежащей охраны едва ли могли выполнять поставленные перед ними задачи. Во многих случаях волостные управления преобразились в районные центры, в особенности в Воропаевском, Поставском, Шарковщинском и Дисненском районах. Население в особо угрожаемых бандитами районах полностью находилось под давлением банд. Созданные много позже так называемые «оборонные деревни» не выполняли своих целей, так как за это время бандитская деятельность приняла такие размеры, с которой могли справиться лишь крупные немецкие гарнизоны вермахта, разбросанные по всей территории округа. И созданная в марте месяце 1944 г. Белорусская краевая оборона (БКО) ни в какой мере не была в состоянии покончить с бандитской деятельностью. «Оборонные деревни» и БКО подверглись таким нападениям большевистских банд, с которыми могли справиться только немецкие силы. И все же следует отметить, что те части населения, которые не подвергались постоянному давлению со стороны банд, по возможности выполняли свои обязанности. В особенности в Глубокском, Плисском, Браславском и частично в Шарковщинском и Дисненском районах были достигнуты положительные успехи, особенно в сельскохозяйственном производстве, в то время как Воропаевский, Миорский, Поставский и отчасти Парафьяновский районы в большей или меньшей степени находились под воздействием банд. Несмотря на эти иногда кажущиеся непреодолимыми трудности, работа продолжалась с большим усердием.

## Политика

Исходя из необходимости использования всей рабочей силы местного населения исключительно для окончательной победы, на первый план работы выдвигалась задача строгого политического руководства и ориентации населения. В политической подготовке на первый план выставлялась история белорусского народа, который после длительного рабства только благодаря фюреру и его вермахту получил возможность национального развития в интересах собственного будущего и отныне должен делать все, чтобы внести свой вклад в окончательную победу немцев, а тем самым и в будущее новой Европы. Трудности в осуществлении этих политических задач, к сожалению, заключались в том, что часть белорусской интеллигенции была ликвидирована или бежала. Возвратившиеся в округ после оккупации его немецкими войсками и приема его под гражданское управление белорусы позже рассматривались основной массой населения как эмигранты, которые покинули страну в трудный для нее час. К тому же трудности состояли и в том, что более чем за 20-летний период польского господства сохранилось очень мало белорусов-патриотов своего белорусского государства, так как все руководящие инстанции были заняты поляками. Даже направленный в 1944 г. в округ довольно неудачно подобранный окружной уполномоченный БЦР не мог изменить положения. Окружной уполномоченный БЦР

доставлял немецкому управлению больше хлопот и работы, чем все население округа в смысле важных требований, обусловленных военным временем. У окружного уполномоченного БЦР отсутствовало всякое политическое чутье, которое так необходимо, чтобы решать целенаправленно задачи в округе с польским и белорусским населением. О доверии белорусского населения к уполномоченному БЦР в округе не может быть и речи. Широкие круги белорусского населения по-прежнему со своими заботами и нуждами обращались в немецкое гражданское управление. Позже я также потерял доверие к окружному уполномоченному БЦР, когда установил, что окружной уполномоченный БЦР не ограничивался кругом определенных ему задач, а более того, критиковал мероприятия немецкого руководящего штаба, так что в конце концов я вынужден был поручить СД надзор за ним. В будущем неотлагательно необходимо придавать БЦР при введении местного самоуправления немецкий руководящий штаб, который будет в состоянии контролировать возложенные на БЦР задачи и проверять их исполнение. Поэтому и неудивительно, что преимущественное большинство сельского населения придерживается польской ориентации, так как население посещало польские школы и 20 лет находилось под управлением административных органов. Однако следует отметить, что население в основном дружественно настроено по отношению к немцам и проявило готовность к сотрудничеству, чего нельзя сказать об отношении местного населения к полякам в генерал-губернаторстве.

**РЫФ Шымса Залманавіч,** н. у 1915.
**РЫФ Эля Эльхонавіч,** н. у 1887, рабочы.
**РЫФ Эстэр Залманаўна,** н. у 1927.
**РЫЦ Берка Янкелевіч,** н. у 1904, кравец.
**РЫЦ Зісьля Гершаўна,** н. у 1912, настаўніца.
**РЫЦ Ліўша Гіршаўна,** н. у 1900, гаспадыня.
**РЫЦ Мотля Літаўна,** н. у 1870.
**РЫЦ Соня Гіршаўна,** н. у 1908, настаўніца.
**РЫЦ Сорка Хаймаўна,** н. у 1904, краўчыха.
**РЫЦ Хая Абрамаўна,** н. у 1875, работніца.
**РЫЦ Хена Янкелеўна,** н. у 1860.
**РЫЦ Янкель Беркавіч,** н. у 1930.

**РЭБРУХ Беньямін Эльевіч,** н. у 1875, кравец.
**РЭБРУХ Хана Янкелеўна,** н. у 1875, краўчыха.
**САМЕРСАВА Фрэйда Самуілаўна,** н. у 1870.
**САСНОВІК Язэп Эльевіч,** н. у 1928.
**САСНОВІК Залман Эльевіч,** н. у 1936.
**САСНОВІК Саламон Эльевіч,** н. у 1925.
**САСНОВІК Сора Эльеўна,** н. у 1934.
**САСНОВІК Хая Абрамаўна,** н. у 1895, работніца.
**САСНОВІК Элія Борухавіч,** н. у 1890, рабочы.
**СВІРСКІ Аба Явелевіч,** н. у 1928.
**СВІРСКАЯ Дзіна Абрамаўна,** н. у 1890, аптэкар.
**СВІРСКАЯ Роха Явелеўна,** н. у 1915, фатограф.
**СІЛІН Ісак Янкелевіч,** н. у 1930.
**СІЛІН Эля Янкелевіч,** н. у 1927, рабочы.
**СІЛІНА Злата Янкелеўна,** н. у 1925, работніца.
**СІЛІНА Хая Іселеўна,** н. у 1900, работніца.
**СОРКІН Абрам Залманавіч,** н. у 1910, рабочы.
**СОРКІН Берка Залманавіч,** н. у 1914, рабочы.
**СОРКІН Залман Міхолавіч,** н. у 1880, рабочы.
**СОРКІН Міхель Абрамавіч,** н. у 1938.
**СОРКІН Хайм Залманавіч,** н. у 1912, рабочы.
**СОРКІНА Блюма Мордухаўна,** н. у 1910, работніца.
**СОРКІНА Дора Давідаўна,** н. у 1882, работніца.
**СРАГОВІЧ Рыва Більямінаўна,** н. у 1938.
**СТАЛЬНІЦКАЯ Хая Хонаўна,** н. у 1905.
**СТАЛЬНІЦКІ Ерухім Шлёмавіч,** н. у 1939.
**ТРЫБУХОВА Лея Янкелеўна,** н. у 1890, работніца.
**ТРЫБУХОВА Бася Хаймаўна,** н. у 1930.
**ТРЫБУХОВА Сара Хаймаўна,** н. у 1935.
**ТРЫБУХОЎ Давід Хаймавіч,** н. у 1920, цырульнік.
**ТРЫБУХОЎ Іцык Хаймавіч,** н. у 1925, цырульнік.
**ТРЫБУХОЎ Моўша Хаймавіч,** н. у 1927.
**ТРЫБУХОЎ Хайм Гіршавіч,** н. у 1934.
**ТРЫБУХОЎ Хайм Моўшавіч,** н. у 1890, рабочы.
**ТРЫБУХОЎ Хацкель Гіршавіч,** н. у 1935.
**ТРЭЙСЦЕР Сора Хаймаўна,** н. у 1937.
**ТРЭЙСЦЕР Суля Нафтолеўна,** н. у 1905, работніца.
**ТРЭЙСЦЕР Хайм Шлёмавіч,** н. у 1890, рабочы.
**ТРЭЙСЦЕР Хая Хаймаўна,** н. у 1935.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Абрам Ісакавіч,** н. у 1870.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Геня Шмуйлаўна,** н. у 1870.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Гершэн Абрамавіч,** н. у 1900, рабочы.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Гірша Гершэнавіч,** н. у 1924.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Моўша Гершэнавіч,** н. у 1926.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Самуіл Гершэнавіч,** н. у 1922, рабочы.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Шайка Моўшаўна,** н. у 1900, работніца.
**ТЭЙЦЕЛЬБАЎМ Шлёма Гершэнавіч,** н. у 1920, рабочы.
**УСТОЕВА Віхна Залманаўна,** н. у 1935.
**УСТОЕВА Хая Мэндалеўна,** н. у 1892, работніца.
**УСТОЕЎ Давід Залманавіч,** н. у 1920, бляхар.
**УСТОЕЎ Залман Мордухавіч,** н. у 1890, бляхар.
**УСТОЕЎ Лейба Залманавіч,** н. у 1926.
**УСТОЕЎ Самуіл Залманавіч,** н. у 1920, бляхар.
**ФАЙН Арон Бенцыонавіч,** н. у 1910, цырульнік.
**ФАЙН Ента Іоселеўна,** н. у 1915, цырульнік.
**ФАЙН Нехама Аронаўна,** н. у 1938.
**ФАЙНВЕЦ Біньямін Моўшавіч,** н. у 1890, пекар.
**ФАЙНВЕЦ Завель Біньямінавіч,** н. у 1930.
**ФАЙНВЕЦ Моўша Біньямінавіч,** н. у 1928.
**ФАЙНВЕЦ Рыва Біньямінаўна,** н. у 1925.
**ФАЙНВЕЦ Сора Завелеўна,** н. у 1900, пекар.
**ФАЙНШТЭЙН Аба Самуілавіч,** н. у 1927.
**ФАЙНШТЭЙН Мордух Самуілавіч,** н. у 1929.
**ФАЙНШТЭЙН Хоя Азрыэлеўна,** н. у 1910, работніца.
**ФРУМІН Залман Іоселевіч,** н. у 1880, рабочы.
**ФРУМІН Моўша Іоселевіч,** н. у 1870.
**ФРУМІН Хайм Маісеевіч,** н. у 1941.
**ФРУМІНА Соня Іоселеўна,** н. у 1900, работніца.
**ФРУМІНА Фрэйда Маісееўна,** н. у 1913, работніца.
**ФРЭЙДКІН Абрам Рубінавіч,** н. у 1932.
**ФРЭЙДКІН Лейзер Рубінавіч,** н. у 1937.
**ФРЭЙДКІН Мордух Давідавіч,** н. у 1939.
**ФРЭЙДКІН Рубін Залманавіч,** н. у 1905, рабочы.
**ФРЭЙДКІНА Зэлда Рубінаўна,** н. у 1935.
**ФРЭЙДКІНА Сіфра Залманаўна,** н. у 1900, работніца.
**ФРЭЙДКІНА Соня Давідаўна,** н. у 1932.
**ФРЭЙДКІНА Хася Хаймаўна,** н. у 1906, работніца.
**ФУРМАН Залка Ізраілевіч,** н. у 1940.
**ФУРМАН Ізраіль Мэндалевіч,** н. у 1912, загадчык клуба.
**ФУРМАН Мэндаль Абрамавіч,** н. у 1880, настаўнік.
**ФУРМАН Рафол Ізраілевіч,** н. у 1937.
**ФУРМАН Роха Аўсееўна,** н. у 1881, работніца.
**ФУРМАН Шэйна Рафолаўна,** н. у 1913, работніца.
**ХАНІН Лейба Ліпавіч,** н. у 1907, рызнік.
**ХАНІНА Ліба Лейбаўна,** н. у 1936.
**ХАНІНА Фейга Лейбаўна,** н. у 1907, работніца.

ХАНІНА Эстар Лейбаўна, н. у 1938.
ХІДЭКЕЛЬ Рахміль Шлёмавіч, н. у 1885, кравец.
ХІДЭКЕЛЬ Сора Бейнусаўна, н. у 1885, краўчыха.
ХІДЭКЕЛЬ Шляма Рахмілевіч, н. у 1920, кравец.
ХОДАС Абрам Рафаілавіч, н. у 1938.
ХОДАС Ліба Рафаілаўна, н. у 1936.
ХОДАС Майка Янкелеўна, н. у 1905, работніца.
ХОДАС Рафаіл Янкелевіч, н. у 1905, гарбар.
ХОДАС Сіфра Рафаілаўна, н. у 1934.
ХОДАС Сорка Рафаілаўна, н. у 1932.
ЦЫПІН Абрам Янкелевіч, н. у 1912, механік.
ЦЫПІН Самуіл Янкелевіч, н. у 1914, механік.
ЦЫПІН Янкель Абрамавіч, н. у 1870, механік.
ЦЫПІНА Гіта Янкелеўна, н. у 1922, работніца.
ЦЫЦІНА Роза Хаймаўна, н. у 1918, работніца.
ЦЫЦІНА Рыва Мордухаўна, н. у 1920, работніца.
ЦЫЦІНА Хася Абрамаўна, н. у 1875, работніца.
ЦЭНЦІТОР Гершэн Хаймавіч, н. у 1880, піквар.
ЦЭНЦІТОР Соня Гершэнаўна, н. у 1920, рахункавод.
ЦЭНЦІТОР Сціса Іцыкаўна, н. у 1885, рахункавод.
ШКОЛЬНІК Беньямін Мордухавіч, н. у 1910, рабочы.
ШКОЛЬНІК Трайна Янкелеўна, н. у 1912, работніца.
ШМІРЫН Лейба Мэндалевіч, н. у 1940.
ШМІРЫН Мэндаль Эфраімавіч, н. у 1910, каваль.
ШМІРЫНА Хася Мэндалеўна, н. у 1916, работніца.
ШНЭЙДЗЕР Маша Фалкаўна, н. у 1920, работніца.
ШНЭЙДЗЕР Меня Зуськавіч, н. у 1938.
ШНЭЙДЗЕР Мікель Хаймавіч, н. у 1905, кравец.
ШНЭЙДЗЕР Сіма Зуськавіч, н. у 1936.
ШНЭЙДЗЕР Церна Янкелеўна, н. у 1870.
ШНЭЙДЗЕР Шмуйла Самуілавіч, н. у 1860.
ШНЭЙДЗЕР Янкель Шмуйлавіч, н. у 1914, кравец.
ШУЛЬЦ Лейба Моўшавіч, н. у 1936.
ШУЛЬЦ Малка Моўшаўна, н. у 1938.
ШУЛЬЦ Моўша Хаймавіч, н. у 1910, шавец.
ШУЛЬЦ Рыва Моўшаўна, н. у 1939.
ШУЛЬЦ Хана Лейбаўна, н. у 1910, работніца.
ШЭЙНАР Арон Саулавіч, н. у 1929.
ШЭЙНАР Іосель Саулавіч, н. у 1927.
ШЭЙНАР Моўша Саулавіч, н. у 1925.
ШЭЙНАР Самуіл Саулавіч, н. у 1931.
ШЭЙНАР Саул Моўшавіч, н. у 1900, шавец.
ШЭЙНАР Сора Хаймаўна, н. у 1901, работніца.
ШЭЙНАР Хава Саулаўна, н. у 1939.
ШЭЙНАР Хана Саулаўна, н. у 1936.
ШЭЙНАР Цыва Саулаўна, н. у 1933.
ШЭЙНЕР Абрам Рубінавіч, н. у 1923, бухгалтар.
ШЭЙНЕР Арон Янкелевіч, н. у 1895, кравец.
ШЭЙНЕР Бовель Лейбаўна, н. у 1900, работніца.
ШЭЙНЕР Гінка Мэндалеўна, н. у 1924, работніца.
ШЭЙНЕР Дора Мэндалеўна, н. у 1899, гаспадыня.
ШЭЙНЕР Залман Мэндалевіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Іеха Аронаўна, н. у 1923, краўчыха.
ШЭЙНЕР Іосель Абрамавіч, н. у 1880, рабочы.
ШЭЙНЕР Іоха Гдалеўна, н. у 1885, работніца.
ШЭЙНЕР Іцык Мэндалевіч, н. у 1925, рабочы.
ШЭЙНЕР Лейба Аронавіч, н. у 1937.
ШЭЙНЕР Лейба Іоселевіч, н. у 1917.
ШЭЙНЕР Меер Іоселевіч, н. у 1907, кравец.
ШЭЙНЕР Міна Рубінаўна, н. у 1927.
ШЭЙНЕР Моўша Аронавіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Мэндаль Рубінавіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Песя Рубінаўна, н. у 1925, бухгалтар.
ШЭЙНЕР Роза Шлёмаўна, н. у 1880, работніца.
ШЭЙНЕР Рохка Хаймаўна, н. у 1896, краўчыха.
ШЭЙНЕР Рубін Хонавіч, н. у 1895, бракёр.
ШЭЙНЕР Рыва Шмуйлаўна, н. у 1921, краўчыха.
ШЭЙНЕР Хацкель Абрамавіч, н. у 1870, рабочы.
ШЭЙНЕР Хона Абрамавіч, н. у 1870, рабочы.
ШЭЙНЕР Шмуйла Янкелевіч, н. у 1892, кравец.
ШЭЙНЕР Эта Ліпманаўна, н. у 1895, краўчыха.
ШЭЙНЕР Янкель Аронавіч, н. у 1925, кравец.
ШЭЙНЕР Янкель Шмуйлавіч, н. у 1928.
ШЭНІМАН Рыва Міхелеўна, н. у 1938.
ШЭНІМАН Хана Міхелеўна, н. у 1936.
ШЭНКМАН Бася Шлімаўна, н. у 1880, работніца.
ШЭНКМАН Гівін Іцакавіч, н. у 1920, настаўнік.
ШЭНКМАН Іцык Хаймавіч, н. у 1880, разнік.
ШЭНКМАН Хава Ідзелеўна, н. у 1905, работніца.
ЭДАЛЬМАН Абрам Борухавіч, н. у 1912, рабочы.
ЭДАЛЬМАН Дзіна М., н. у 1875, работніца.
ЭДАЛЬМАН Ідзель Борухавіч, н. у 1910, скурабракёр.
ЭДАЛЬМАН Ісак Ідзелевіч, н. у 1935.
ЭДАЛЬМАН Лейба Борухавіч, н. у 1938.
ЭДАЛЬМАН Лея Борухаўна, н. у 1918, работніца.

**ЭДАЛЬМАН Люба Ісакаўна,** н. у 1910, работніца.
**ЭДАЛЬМАН Нехама Боруxаўна,** н. у 1920, работніца.
**ЭДАЛЬМАН Рыва Боруxаўна,** н. у 1925, работніца.
**ЭДАЛЬМАН С. М.,** н. у 1872, рабочы.
**ЭДАЛЬМАН Хая Ідзелеўна,** н. у 1938.

**ЭЙДАЛЬМАН Бейля Боруxаўна,** н. у 1905, работніца.
**ЭЙДАЛЬМАН Борух Шэйбсавіч,** н. у 1940.
**ЭЙДАЛЬМАН Груня Рахнілаўна,** н. у 1933.
**ЭЙДАЛЬМАН Ізраіль Рахнілавіч,** н. у 1922, рабочы.
**ЭЙДАЛЬМАН Маісей Шэйбсавіч,** н. у 1928, рабочы.
**ЭЙДАЛЬМАН Моўша Рахнілавіч,** н. у 1930.
**ЭЙДАЛЬМАН Рахніль Іосавіч,** н. у 1880, рабочы.
**ЭЙДАЛЬМАН Рыва Шэйбсаўна,** н. у 1933.
**ЭЙДАЛЬМАН Самуіл Рахнілавіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЭЙДАЛЬМАН Фейга Моўшаўна,** н. у 1890, работніца.
**ЭЛЬМАН... Гіршавіч,** н. у 1927.
**ЭЛЬМАН... Гіршавіч,** н. у 1930.
**ЭЛЬМАН Герт Іошавіч,** н. у 1900, рабочы.
**ЭЛЬМАН Сара Іошаўна,** н. у 1900, работніца.
**ЭНГЕЛЬ Айзік Рахмілавіч,** н. у 1880, рабочы.
**ЭНГЕЛЬ Хая Боруxаўна,** н. у 1890, работніца.
**ЭНГЕЛЬ Хлойна Янкелевіч,** н. у 1924, рабочы.

**ЭСТАВА Ліба Моўшаўна,** н. у 1870.
**ЭСТАЎ Лейба Моўшавіч,** н. у 1870.
**ЭСТРАВА Алта Абрамаўна,** н. у 1890, работніца.
**ЭСТРАВА Бася Залманаўна,** н. у 1932.
**ЭСТРАВА Бейля Нахталеўна,** н. у 1900, работніца.
**ЭСТРАВА Віхна Іосераўна,** н. у 1930.
**ЭСТРАВА Гліко Кусіелеўна,** н. у 1908, настаўніца.
**ЭСТРАВА Голда Хацкелеўна,** н. у 1885, земляроб.
**ЭСТРАВА Ента Лейбаўна,** н. у 1885, работніца.
**ЭСТРАВА Люба Зуськаўна,** н. у 1932.
**ЭСТРАВА Мера Давідаўна,** н. у 1922, работніца.
**ЭСТРАВА Мера Залманаўна,** н. у 1915, работніца.
**ЭСТРАВА Міна Давідаўна,** н. у 1920, работніца.
**ЭСТРАВА Міна Моўшаўна,** н. у 1880, работніца.
**ЭСТРАВА Міна Янкелеўна,** н. у 1930.
**ЭСТРАВА Нехама Вульфаўна,** н. у 1925, работніца.
**ЭСТРАВА Нойма Янкелеўна,** н. у 1932.
**ЭСТРАВА Роха Моўшаўна,** н. у 1900, работніца.
**ЭСТРАВА Соня Ельеўна,** н. у 1895, работніца.
**ЭСТРАВА Фрэйда Хлаўнаўна,** н. у 1880, работніца.
**ЭСТРАВА Хая Боруxаўна,** н. у 1905, работніца.
**ЭСТРАВА Хая Давідаўна,** н. у 1924, работніца.
**ЭСТРАВА Хая Залманаўна,** н. у 1930.
**ЭСТРАВА Хая Янкелеўна,** н. у 1920, работніца.
**ЭСТРАВА Церна Ісераўна,** н. у 1922, паштальён.
**ЭСТРАВА Цыва Янкелеўна,** н. у 1920, работніца.
**ЭСТРАВА Эстра Рахмілеўна,** н. у 1900, работніца.
**ЭСТРАЎ Абрам Абрамавіч,** н. у 1938.
**ЭСТРАЎ Арам Янкелевіч,** н. у 1922, рабочы.
**ЭСТРАЎ Бейнус Беркавіч,** н. у 1927, вучань.
**ЭСТРАЎ Берка Вульфавіч,** н. у 1930.
**ЭСТРАЎ Берка Ізраілевіч,** н. у 1937.
**ЭСТРАЎ Берка Лейбавіч,** н. у 1890, рабочы.
**ЭСТРАЎ Вульф Зуськавіч,** н. у 1870.
**ЭСТРАЎ Давід Хацкелевіч,** н. у 1880, рабочы.
**ЭСТРАЎ Залка Кусіелевіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЭСТРАЎ Залка Халманавіч,** н. у 1910, рабочы.
**ЭСТРАЎ Залман Залкавіч,** н. у 1870.
**ЭСТРАЎ Залман Лейбавіч,** н. у 1875, рабочы.
**ЭСТРАЎ Зусман В.,** н. у 1900, рабочы.
**ЭСТРАЎ Ізраіль Ісеравіч,** н. у 1910, бракёр лесу.
**ЭСТРАЎ Ізраіль Хацкелевіч,** н. у 1890, рабочы.
**ЭСТРАЎ Ісер Ізраілевіч,** н. у 1926, столяр.
**ЭСТРАЎ Ісер Лейбавіч,** н. у 1870, земляроб.
**ЭСТРАЎ Кусіел Залкавіч,** н. у 1880, рабочы.
**ЭСТРАЎ Лёва Беркавіч,** н. у 1922, бухгалтар.
**ЭСТРАЎ Лейвіч Ісеравіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЭСТРАЎ Міхал Вульфавіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЭСТРАЎ Міхель Зуськавіч,** н. у 1936.
**ЭСТРАЎ Рубін Шалшавіч,** н. у 1924, вучань.
**ЭСТРАЎ Самуіл Кусіелевіч,** н. у 1925, рабочы.
**ЭСТРАЎ Хайм Кусіелевіч,** н. у 1935.
**ЭСТРАЎ Хайм Залманавіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЭСТРАЎ Хацкель Ізраілевіч,** н. у 1924, столяр.
**ЭСТРАЎ Хона Зуськавіч,** н. у 1930.
**ЭСТРАЎ Янкель Залкавіч,** н. у 1865.
**ЭСТРЫН Сара Абрамаўна,** н. у 1860.
**ЮДЗІНА Сора Моўшаўна,** н. у 1922, работніца.
**ЮДЗІНА Этка Ізраілеўна,** н. у 1890, работніца.
**ЮДЗІН Меер Моўшавіч,** н. у 1920, рабочы.
**ЯЛАВА Гінда Самуілаўна,** н. у 1890, пекар.
**ЯЛАЎ Фалка Хайсеевіч,** н. у 1920, пекар.

## ЯЗНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА БЛОШНІКІ (ЦЯПЕР КАЛІНАВАЕ)

**БАРАН Асар,** н. у 1896, кравец.

**БАРАН Ента,** н. у 1896, краўчыха.

**БАРАН Ефця,** н. у 1927, краўчыха.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Абрам Абрамавіч,** н. у 1929, школьнік.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Абрам Юдавіч,** н. у 1887, земляроб.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Берта І.,** н. у 1898.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Гіля Мэндалеўна,** н. у 1882.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Гіта Еселеўна,** н. у 1895.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Жэня Лейбаўна,** н. у 1920.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Лейба Юдавіч,** н. у 1880, земляроб.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Роза М.,** н. у 1883.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Саламон Лейбавіч,** н. у 1919, земляроб.

**ДЗІМЯНЦЕЙ Юда Абрамавіч,** н. у 1920, земляроб.

**ЛІЎШЫЦ Гіта М.,** н. у 1882.

**ЛІЎШЫЦ Шмуйла Рофавіч,** н. у 1915.

**СЛАВІН Гаўрыла,** н. у 1918, селянін.

**СЛАВІН Мэндаль М.,** н. у 1884, земляроб.

**СЛАВІН Моўша Мэндалевіч,** н. у 1921, земляроб.

**СЛАВІНА Сорка,** н. у 1886.

### ВЁСКА МУРАШЧЫНА

**ФІНКЕЛЬШТЭЙН Вульф,** н. у 1905, гандляр.

### ВЁСКА ЯЗНА

**ГОФМАН Бэля.**

**ГОФМАН Мэндаль І.**

**ГОФМАН Руман.**

**ГОФМАН Фейга.**

**ГОФМАН Хана.**

**ГОФМАН Эстар.**

**ПЭН Борка.**

**ПЭН Мордух.**

**ПЭН Эдля.**

**ФЕЙГЕЛЬ Берка Вульфавіч.**

**ФЕЙГЕЛЬ Вульф Беркавіч.**

**ФЕЙГЕЛЬ Міхал.**

**ФЕЙГЕЛЬ Сорка.**

# ПАДПОЛЬНЫ І ПАРТЫЗАНСКІ РУХ

Супраціўленне захопнікам пачалося літаральна з першых дзён. Вілейскі абкам партыі да 3—4 ліпеня арганізаваў каля дзесяці партыйна-партызанскіх груп, у тым ліку адну з 18 чалавек на чале з сакратаром Міёрскага райкама партыі Саўрэем.

Першапачатковы этап развіцця ўсенароднай барацьбы з акупантамі ў значнай ступені звязаны з аказаннем дапамогі савецкім воінам, якія трапілі ў акружэнне. А. М. Манцэвіч, жонка Ф. Д. Манцэвіча, успамінала, што аднойчы да іх у дом зайшлі два акружэнцы — камандзіры Чырвонай Арміі Кудаеў і Светлалобаў. Іх пераапранулі ў цывільнае адзенне, накармілі, далі прытулак. Яны арганізоўвалі засады ля фашысцкіх пераправаў праз Дзісну, праводзілі гутаркі з насельніцтвам, умацоўвалі ў людзей упэўненасць ў перамозе над ворагам. Неўзабаве камандзіры сабралі групу акружэнцаў і пайшлі на ўсход, разлічваючы прарвацца праз лінію фронту.

Савецкія воіны і камандзіры, якія аказаліся ў акружэнні, садзейнічалі кансалідацыі сіл супраціўлення. У вёсках Моцеўкі, Дзеверкі, Чэрасы, Картавыя, Татары, Пціцкія і інш., у Міёрах стварыліся падпольныя групы. Першапачаткова яны складаліся з 2—3 чалавек, не мелі кіруючага цэнтра. Яшчэ ў ліпені 1941 г. група з 27 падпольшчыкаў сфарміравалася вакол А. М. Манцэвіч. Сярод іх былі Іван Фёдаравіч і Іван Васільевіч Лакоткі, іх бацькі, Дзмітрый Барок і яго бацька, Віктар, Ігнат і Павел Сушко, Іосіф, Павел і Сяргей Шчасныя. Спачатку яны дапамагалі акружэнцам перапраўляцца праз Заходнюю Дзвіну, а потым пачалі парушаць тэлефонную сувязь, разбураць масты, у тым ліку на дамбе ў Чэрасах.

У сваю чаргу Дзмітрый Барок накіроўваў дзейнасць чэраскай падпольнай

камсамольскай групы, у якую першапачаткова ўваходзілі Антаніна Манцэвіч, Віктар Сушко, Іван Лакотка. Да восені да іх далучыліся Юрый Манцэвіч, яшчэ адзін Іван Лакотка, потым Вольга Крыштапёнак, Анастасія Мароз, Марыя і Сяргей Шчасныя, Фёдар Сцепулёнак, Вольга Грэцкая, Аляксей Мілун, Мікалай Пацеенак. Камсамольцы знайшлі некалькі вінтовак, гранат і нават кулямёт, падбіралі надзейных людзей.

Ядро камсамольска-маладзёжнай арганізацыі ў Старых Круках і Вялікай Глінаўцы складалі Уладзімір Канах, Пётр Грэцкі, Іван Ракоца, Віктар і Зінаіда Сушко.

Антыфашысты в. Моцеўкі (кіраўнік Н. А. Лутохін) збіралі звесткі аб гарнізонах у Міёрах і Глыбокім, мініравалі дарогі, пашкоджвалі тэлеграфна-тэлефонную сувязь.

Падпольшчыкі в. Пціцкія вялі разведку ў Міёрах і Дрысе, сістэматычна псавалі сувязь паміж гэтымі населенымі пунктамі. У в. Масеўцы яны спалілі торфазавод і нарыхтаванае паліва для мясцовага гарнізона.

Антыфашысцкая група в. Картавыя (кіраўнік Г. С. Арлоўскі) вяла палітычную работу сярод насельніцтва, збірала зброю і боепрыпасы, спаліла малочныя пункты ў сваёй вёсцы і Дворным Сяле.

Патрыятычныя групы дзейнічалі і непасрэдна ў Міёрах. Вядома, што адной з іх кіравала Ірына Гарбаценка. Антыфашысты забяспечвалі падпольшчыкаў, а затым і партызан дакументамі, выкралі ва ўправе пішучую машынку для падпольнага райкама камсамола, распаўсюджвалі лістоўкі, вялі пошукі зброі, боепрыпасаў і медыкаментаў.

З першых дзён акупацыі пачала аб'ядноўвацца моладзь Мікалаеўскага сельсавета Дзісенскага раёна. У жніўні 1941 г. тут была створана падпольная камсамольская арганізацыя, сакратаром якой пэўны час была Глафіра Васільеўна Рымдзёнак (Качан), а затым Андрэй Яленскі. У яе ўвайшлі Рыта Рымдзёнак з в. Бушава, Косця Яленскі з Лугаўцоў,



С. П. Шчасны

Марыя Лісоўская з Луначарска, Ціхан Федарэц з Федарцоў, Хрыстафор Федарэц, Максім, Віталь, Пётр, Іосіф і Ганна Мядзельцы з Шарагоў, Люба, Іван, Алена і Міленцій Свяцкія з Дзянісава, Валя і Зоя Чэрап з Бушава і інш.

Камсамольцы пачалі са збору зброі на месцах баёў за Дзвіной. Яны схавалі ў навакольных лясах два станковыя кулямёты, сем ручных, каля дваццаці аўтаматаў, некалькі дзесяткаў вінтовак і шмат патронаў. Устанаўліваліся сувязі з воінамі Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні і аселі сярод мясцовага насельніцтва. Першым далучыўся да падполля савецкі афіцэр Іван Зубкоў. А да вясны 1942 г. у арганізацыі налічвалася каля ста юнакоў і дзяўчат.

У кіруючае ядро падполля ўваходзілі Г. Рымдзёнак, І. Зубкоў, А. Яленскі. У красавіку 1942 г. яны прынялі рашэнне аб стварэнні партызанскага атрада. Аднак ажыццявіць намечанае камсамольцы не паспелі. Па даносу здрадніка пачаліся масавыя арышты. Асабліва жорстка на вачах родных і аднавяскоўцаў гітлераўцы дапытвалі Андрэя Яленскага і Ціхана Федарца. Яны загінулі, але таварышаў не выдалі. Астатніх падпольшчыкаў некалькі дзён трымалі ў падвалах, дапытвалі і збівалі іх. Аднак прызнання не дабіліся і вымушаны былі адпусціць.

Праз нейкі час паліцыя яшчэ раз схапіла 18 маладых патрыётаў і дапытвала іх некалькі тыдняў. Але і на гэты

раз нічога не дабілася. Усе выйшлі на волю, толькі дзейнасць падполля спынілася. I тым не менш многія камсамольцы ў далейшым актыўна ўключыліся ў партызанскую барацьбу.

Вясной і летам 1942 г. на тэрыторыі Міёрскага і Дзісенскага раёнаў узмацніўся рух партызанскіх груп. Яны ўстанаўлівалі кантакты з мясцовымі патрыётамі, прыцягвалі іх да збору разведвальных даных, зброі, выканання іншых даручэнняў. У прыватнасці, гэтым займаўся Павел Рыгоравіч Казлоўскі, які з мая 1942 па лістапад 1943 г. нелегальна жыў на хутарах Пліскага і Дзісенскага раёнаў. Пазней ён стаў палітруком узвода партызанскай брыгады імя Жукава, пасля вайны — кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

Летам 1942 г. у Міёрскім, Дзісенскім і Шаркоўшчынскім раёнах дзейнічала група ўпаўнаважанага ЦК і Вілейскага абкама партыі А. І. Шаўчэнкі. Аб'яднаўшыся з групамі П. Ф. Рудава і Н. З. Умінскага, яна наносіла адчувальныя ўдары па ворагу.

Невялікі атрад «Спартак» летам 1942 г. вырас з 60 да 400 чалавек за кошт партызанскіх і падпольных груп Міёрскага, Дунілавіцкага і Шаркоўшчынскага раёнаў. Ператварыўся ў брыгаду спецатрад «Няўлоўныя» (камандзір Міхаіл Сідаравіч Пруднікаў), які прыбыў у Дзісенскі раён з-за лініі фронту. У яе радах змагаліся з ворагам Мікалай Сцяпанавіч Шымуковіч з в. Анкуды, Ігнат Аляксандравіч Шчарбіцкі з Варонак, Генадзь Міхайлавіч Федарэц з Мазурына, Уладзімір Сідаравіч Дарашкевіч і Піліп Паўлавіч Басянок з Плігавак, Дар'я Ульянаўна Кадушка з Чэрасаў.

Група партызан брыгады «Няўлоўныя» пад кіраўніцтвам П. Н. Шырокава ў Міёрскім і Шаркоўшчынскім раёнах вырасла ў атрад, які вытрымаў карную блакаду і стаў ядром брыгады «За Радзіму».

Намеснік начальніка асобага аддзела партызанскага атрада, начальнік разведкі брыгады імя Жукава Рыгор Яфімавіч Шчарбакоў успамінаў: «Многія сяляне самі аддавалі нам зброю і боепрыпасы. У Міёрах, напрыклад, адзін стары перадаў абрэз, дзве вінтоўкі і дзве скрынкі патронаў. Незадоўга да гэтага яго збілі фашысты, патрабуючы зброю, але ён не выдаў яе ворагу, а нам даставіў са



Група партызан брыгады «Кастрычнік»



Група партызан брыгады «Кастрычнік»

словамі: «Вазьміце, дзеткі, і біце праклятых ворагаў».

Ужо ў 1942 г. народныя мсціўцы пачалі праводзіць значныя аперацыі. Напрыклад, восенню партызанскі атрад А. Д. Мядзведзева, які пазней уліўся ў брыгаду імя ЦК КП(б)Б, разграміў валасную ўправу ў Язпе і ўзарваў маслазавод. Закладвалася аснова масавага партызанскага руху.

Актывізавалася дзейнасць падпольшчыкаў. У прыватнасці, А. М. Манцэвіч наладжвае сувязь з браслаўскімі антыфашыстамі братамі А. А. і Д. А. Васілеўскімі. Патрыёты здзяйсняюць дыверсіі, распаўсюджваюць лістоўкі. Ведаць праўду аб гераічнай барацьбе савецкага народа з ворагам дапамагае радыёпрыёмнік, зманціраваны ў Міёрах Альбінам Кучынскім. Нарэшце падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з партызанамі, у першую чаргу атрада «Спартак». Калі ж гітлераўцы высачылі патрыётаў Аркадзя і Яніну Баркоў, яны загінулі, але нікога не выдалі.

Міёрскія падпольшчыкі пачынаюць укараняцца ў апарат кіравання акупантаў. Так, пісарам агульнага аддзела ўправы стаў Г. Ф. Манцэвіч, які праз А. Д. Лясовіч папярэдзіў антыфашыстаў, што рыхтуецца адпраўка моладзі ў Германію.

У 1943 г. Вілейскі падпольны абкам партыі ўпарадкаваў партызанскія фарміраванні і кіраўніцтва імі. У Плліскі раён (частка яго ўваходзіць у сучасны Міёрскі) перадыслацыравалася брыгада «Кастрычнік», брыгада імя Калініна стала дзейнічаць у Міёрскім, 4-я Беларуская — у Дзісенскім раёнах. 2 верасня зацверджаны Міёрскі падпольны райкам КП(б)Б у наступным складзе: Ф. Н. Гаўрыленка — сакратар, М. А. Клімянок і Н. В. Ладыс — члены.

Барацьбу супраць захопнікаў на Дзісеншчыне ўзначаліў падпольны райкам КП(б)Б у наступным складзе: сакратар Ф. М. Расюк, члены М. І. Ярмак, А. С. Іваноў, М. Д. Свірыдзенка, А. С. Сямёнаў.

Камсамольскай работай у Міёрскім раёне кіраваў упаўнаважаны абкама А. Ю. Міхасёнак. У Дзісенскім раёне дзейнічаў райкам ЛКСМБ, сакратаром якога з'яўляўся М. Шульга, сакратаром па прапагандзе — М. Крашэўскі, членамі — С. Нікіцін, М. Глазкін, К. Протас.

З сакавіка 1943 г. у Міёрскім раёне пачынае выходзіць орган падпольнага райкама КП(б)Б газета «Кліч партыза-

на», са студзеня 1944 г. пад такой жа назвай выдае газету Дзісенскі РК КП(б)Б.

Для правядзення агітацыйнай работы на Міёршчыне з брыгады Герасімава была накіравана група ў складзе дзевяці чалавек пад камандаваннем Паўла Міхайлавіча Стральцова. Камісарам у ёй быў Мікалай Кручкоў.

9 кастрычніка 1943 г. у Дзісенскі раён прыбыла з расонскіх лясоў 4-я Беларуская брыгада (камандзір В. А. Сазыкін, камісар В. К. Шэндзелеў), якая павінна была весці разведку ў інтарэсах Калінінскага фронту. 395 байцоў і камандзіраў пачалі баявую работу з разгрому абозу гітлераўцаў. Абапіраючыся на дапамогу мясцовых падпольшчыкаў, праз пяць дзён брыгада поўнасцю знішчыла варожы гарнізон у в. Ліхачы, дзе захапіла тры кулямёты, мінамёт, 14 вінтовак, вялікую колькасць боепрыпасаў і амуніцыі. А потым пачаліся дыверсіі на камунікацыях ворага, разгарнулася масава-палітычная работа сярод мясцовага насельніцтва.

На тэрыторыі Міёрскага раёна (у сучасных граніцах) у розны час акрамя названых дзейнічалі іншыя партызанскія брыгады. Яны заўсёды адчувалі падтрымку мясцовага насельніцтва, атрымлівалі практычную дапамогу патрыётаў. Без гэтага не мог існаваць партызанскі рух, не маглі быць паспяховымі іх баявыя аперацыі.

Прыкладаў узаемадзеяння партызан і патрыётаў дастаткова. Напрыклад, вясной 1943 г. Ірына Гарбаценка паведаміла ў брыгаду «Кастрычнік» аб тым, што з Міёраў у Дзісну накіроўваецца абоз паліцыі. Народныя мсціўцы зрабілі засаду у в. Крукі, захапілі трафеі.

11 ваеннапалонных, якія працавалі ў нямецкіх часцях, з дапамогай падпольшчыкаў уцяклі з Міёраў у партызанскую брыгаду імя М. І. Калініна.

Цікавай з'явай у партызанскім руху можна назваць падпольны партызанскі атрад «Масква», створаны падпольшчыкамі в. Чэрасы пад кіраўніцтвам настаў-



А. В. Канах



І. Ф. Лакотка



М. З. Гляк



П. А. Баброўскі



П. І. Гаўрутаў



А. П. Козел

ніцы А. М. Манцэвіч і пры падтрымцы камандавання 4-й Беларускай брыгады. Камандзірам яго быў выбраны мясцовы жыхар А. В. Канах. Асаблівасць гэтага падраздзялення заключалася ў тым, што звычайныя сялянскія хлопцы займаліся сваімі звычайнымі сялянскімі справамі. Калі камандаванне трубіла збор, гэтыя хлопцы станавіліся байцамі-партызанамі. Яны ўдзельнічалі ў баявых аперацыях, разбуралі масты. На іх баявым рахунку спалены склад гаручага ў Глыбокім, збор зброі і боепрыпасаў. Баец атрада Іван Фёдаравіч Лакотка вывез з Глыбокага шрыфты і некаторае друкарскае абсталяванне, якое потым выкарыстоўвалася ў 4-й Беларускай брыгадзе для выпуску лістовак і раённай газеты.

Многія байцы атрада «Масква» потым сталі партызанамі. Некаторыя аддалі жыццё ў барацьбе з ворагам у падполлі, у партызанскіх атрадах і на фронце: Аляксей Мілун, Павел Шчасны, Сцяпан Мацюк, Юзя Шубіна, Дзмітрый Барок. Ордэнам Леніна пасмяротна ўзнагароджаны франтавік Ніканор Пахірка. Не дажылі да перамогі Іосіф Шчасны, Мікалай Сушко, Пётр Адамовіч, Пётр Муха, Іван Скавародка, Піліп Лапцёнак.

Народныя мсціўцы праводзілі на Міёршчыне буйныя баявыя аперацыі. Так, атрады 4-й Беларускай брыгады трымалі пад ударам чыгуначную магістраль Полацк — Рыга. Яны блакіравалі нямецкі гарнізон у Дзісне, а 11 лютага 1944 г. раптоўна напалі на гарнізон, спалілі там млын, электрастанцыю, склады. У маёнтку Дарожкавічы былі захоплены дзесяткі галоў жывёлы, 14 лютага знішчаны гарнізон у в. Узмёны, яшчэ перад гэтым быў разгромлены гарнізон у Лявонпалі. Толькі са студзеня па красавік 1944 г. брыгада правяла каля 90 баёў, арганізавала 12 дыверсій на камунікацыях ворага.

Вялікі рэзананс мела аперацыя па разгрому варожага гарнізона ў Міёрах. Яе правяла 30 чэрвеня 1943 г. бры-


У. К. Казачонак


М. А. Скрыпкін


Т. І. Сініца


У. І. Радзішэўскі


А. Д. Міхайлаў


А. А. Скрабатун

гада імя Ракасоўскага ў час рэйду да воз. Нарач. Камандаваў гэтым злучэннем А. В. Раманаў, камісарам з'яўляўся П. М. Машэраў, начальнікам штаба — В. Н. Дармянёў.

Брыгада фарсіравала Заходнюю Дзвіну і спынілася ў в. Кавалеўшчына. Гэта навіна пасеяла паніку ў навакольных варожых гарнізонах, што і прапанаваў выкарыстаць для нападзення на Міёры камандзір атрада № 3 брыгады «Кастрычнік» А. І. Канапелька. Аперацыя пачалася на світанні штурмам варожых умацаванняў. Партызаны знішчылі ўправу, пошту, гараж. Страты ворага склалі 85 чалавек, у народных мсціўцаў забіта было 10 чалавек і 14 паранена.

Партызаны хутка пакінулі Міёры, куды неўзабаве прыбыло падмацаванне.

Шмат было аперацый і баёў «мясцовага» значэння. Напрыклад, з гранатамі прабіліся з акружэння ля в. Ахрэмаўцы партызаны брыгады імя Жукава жыхары в. Ніўнікі Рыгор Парменавіч, Пафнуцій Яфімавіч і Феафан Парменавіч Яфімавы, Іосіф Ігнатавіч Завадскі. У гэтай брыгадзе змагаліся М. З. Гляк і І. Дз. Кудраўцаў.

Партызанскія агітатары прынялі бой 27 снежня 1944 г. ля в. Козічы Дзісенскага раёна, куды на машыне раптоўна з'явіліся карнікі.

Вяртаючыся з баявога задання, група байцоў брыгады «Кастрычнік» пад камандаваннем камуніста Ф. П. Зыранава даведалася, што войт в. Костачына збірае падаткі. Партызаны загадалі войту выдаць жыхарам квітанцыі аб нібыта здадзеных падатках, а яму ўручылі даведку, што яны ў яго нібыта забралі 11 800 руб.

Брыгада імя Жукава разграміла гарнізон у маёнтку Курылавічы, дзе захапіла зброю, боепрыпасы, коней і кароў.

А яшчэ засады, узрывы на дарогах, зрыў нарыхтовак і іншых мерапрыемстваў акупацыйных улад...

Вядома, захопнікі не маглі з гэтым мірыцца. Неаднаразова яны імкнуліся разграміць партызанскія фарміраванні. Вялікая карная экспедыцыя супраць брыгады імя Калініна, «Спартак» і імя Жукава была арганізавана ў канцы верасня 1943 г. У ёй удзельнічала да 20 тысяч салдат пры падтрымцы 12 артбатарэй, 20 танкаў і 40 самалётаў. У брыгадзе імя Калініна у той час было 314 байцоў, узброеных 13 кулямётамі, двума супрацьтанкавымі ружжамі, 42 аўтаматамі і 150 вінтоўкамі. Прыкладна такія ж сілы мелі брыгады «Спартак» і імя Жукава.

Нягледзячы на шматразовую перавагу ў жывой сіле і ўзбраенні, немцам не




У. Р. Гаўрыловіч з вучнямі СШ № 2 г. Міёры

ўдалося знішчыць фарміраванні народных мсціўцаў. Яны прарвалі блакаду. А гітлераўцы жорстка адпомсцілі мясцоваму насельніцтву за падтрымку партызанскага руху.

У партызанскіх брыгадах і атрадах актыўна змагаліся П. А. Баброўскі, П. І. Гаўрутаў, У. Р. Гаўрыловіч, А. Дз. Міхайлаў, У. К. Казачонак, А. П. Козел, П. А. Марцінята, У. І. Радзішэвіч, Т. І. Сініца, А. А. Скрабатун, М. А. Скрышкін і многія іншыя.

Напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі вораг стаў умацоўваць гарнізоны, узмацніўся яго націск на партызан. У цяжкіх баях у маі 1944 г. брыгады 4-я Беларуская, «За Радзіму», «Спартак», імя У. І. Леніна, імя М. І. Калініна, імя Г. К. Жукава не толькі адстаялі свае пазіцыі, але і расшырылі зоны дзеяння. У маі толькі 4-я Беларуская брыгада правяла каля ста аперацый, знішчыла больш за 300 варожых салдат і афіцэраў.

Гітлераўцы паспрабавалі блакіраваць у канцы мая — сярэдзіне чэрвеня 1944 г. брыгады імя У. І. Леніна, імя П. К. Панамарэнкі, 16-ю Смаленскую, імя С. М. Кароткіна, 4-ю Беларускую і «Кастрычнік» у раёне балота Багна-Мох. Аднак асноўныя сілы партызан і на гэты раз прабіліся з акружэння, хоць кожная карная экспедыцыя выклікала шматлікія ахвяры не толькі сярод народных мсціўцаў, але і мірнага насельніцтва, прыносіла беды і пакуты. І ў гэты раз у наваколлі Балота-Мох былі спалены ўсе вёскі. Асабліва пацярпела Залессе — самыя глухія населеныя пункты на ўскрайку балотнага масіву, што служылі базай для партызан.

Калі гітлераўскае камандаванне накіравала на фронт рэгулярныя часці, якія ўдзельнічалі ў карнай экспедыцыі, народныя мсціўцы зноў вярнуліся ў свае раёны дыслакацыі. Разам з мясцовым насельніцтвам яны аказвалі ўсямерную дапамогу Чырвонай Арміі: парушалі варожыя камунікацыі, нападалі на адступаўшыя калоны немцаў, мініравалі дарогі. Але тактыка ў гэты перыяд партызанскай вайны была іншай: напярэдадні вызвалення дапускаць менш разбурэнняў, больш засеяць палёў, каб сабраць ураджай ужо на вольнай зямлі.

*Л. А. Матэленак*

## Першыя партызаны

### З дзённіка І. А. Лапіцкага

У пачатку 1942 г. мясцовыя органы кіравання перададзены беларусам. Замест польскіх паветаў, магістратаў і гмін утвораны раёны, гарадскія і валасныя ўправы. Старшынёй Дзісенскай раённай управы назначаны быў Забайяла, сакратаром — Сонцаў, старшынёй гарадской управы — Рыгор Ліпскі, старшынёй Мікалаеўскай валаснай управы — Трушынскі, сакратаром — Рабіза. Палякі, выпусціўшы з рук кіраўніцтва мясцовымі органамі, пастараліся паставіць свайго чалавека на чале паліцыі. Назначаны замест Свінарскага камендантам паліцыі Шампур хоць і лічыўся беларусам, але з'яўляўся адданым абаронцам палякаў і сапраўдным катам мясцовых жыхароў.

Вясной пайшлі чуткі пра партызан. Занепакоеныя немцы распарадзіліся аб вяртанні ваеннапалонных у лагер, якіх перад тым аддалі ў сялянскія сем'і. Але многія ўжо паспелі пайсці ў лес.

У гэты час з'явіўся ў нас першы партызан, жыхар вёскі Лугаўцы Яленскі. Да яго далучыўся Федарэц з вёскі Федарцы. Яны ўстанаўлівалі сувязь з партызанамі, збіралі зброю па дарогах, дзе адступалі савецкія войскі, хавалі яе ў лясах, заклікалі мясцовых жыхароў уступаць у рады народных мсціўцаў. Толькі з-за нявопытнасці трапілі яны ў рукі немцаў. Два тыдні мучылі іх, здзекаваліся з іх, вазілі па дарогах і лясах, шукалі схаваную зброю. Не выдалі.

Яленскага расстралялі ў Дзісне ля

касцёла ў завулку пры доме аптэкара Разета і закапалі тут жа ў двары. Казалі, што ён нібыта спрабаваў ратавацца ўцёкамі. Ціхана Федарца фашысты расстралялі ў яго роднай вёсцы на вачах у маці, суседзяў і яго таварыша Яленскага.

У маі арыштавалі ўсіх камсамольцаў, але праз тыдзень выпусцілі. Немцы рыхтавалі новую справу — вываз моладзі ў Германію на работы. Наша дачка Ія таксама была прызначана да вывазу, але пазбегла яго, бо ёй удалося ўладкавацца на працу рэгістратарам Дзісенскай бальніцы.

* * *

1943 год быў перыядам асабліва імклівага росту партызанскага руху ў Мікалаеўскай воласці, вельмі зручнай для гэтых мэт. Адначасова немцы ўзмацнілі тэрор. Для застрашвання яны жывымі спалілі сям'ю Грыдзюшкаў у Сцефанполлі, там жа расстралялі сям'ю Ігната Ганчаронка, учынілі шмат зверстваў у іншых вёсках. Да восені партызаны занялі ўсе населеныя пункты ўздоўж Вянужскіх лясоў ад Крукоў да Кутоў, адрэзалі немцам доступ да лесу — галоўнага пункта забеспячэння Дзісны палівам і ўстанавілі кантроль над дарогай Дзісна — Міёры на ўчастку Туркова — Крукі.

Немцы павялічвалі састаў паліцыі, утварылі і ўзброілі атрады так званай самаахвовы, устанавілі для іх умацаваныя пункты, у вёсках павесілі званы для сігналізацыі на выпадак з'яўлення партызан. Мала было жадаючых уступіць у самаахову, яшчэ менш — супрацоўнічаць з партызанамі. Часцей за ўсё яны ў выпадку небяспекі разбягаліся або пераходзілі на бок партызан.

Немцам для камандавання мясцовымі фарміраваннямі патрэбны былі афіцэры. Таму яны ўсімі сіламі імкнуліся завербаваць для гэтага жыхара вёскі Хомічы Пятра Сямёнавіча Гагалінскага. Гэты выдатны чалавек — мой найлепшы сябра, лейб-гвардыі прапаршчык рускай арміі, георгіеўскі кавалер усіх чатырох ступеняў, чатырнаццаць разоў паранены ў першую сусветную вайну. Гэты рослы чалавек атлетычнага целаскладу, прыгажун карыстаўся асаблівай павагай і любоўю сярод мясцовага насельніцтва. Сябры называлі яго Пятром Вялікім.

Немцы бачылі ў ім вялікі аўтарытэт, які мог пацягнуць за сабой шмат жадаючых у самаахову. Яны і выклікалі яго па гэтай справе ў Глыбокае. Па дарозе Пётр Сямёнавіч заехаў да нас у Мікалаёва, каб параіцца, як пазбегнуць уступлення ў самаахову. Мы вырашылі тады, што ён будзе сімуляваць калецтва, з'явіцца да немцаў з мыліцай. Сімуляцыя ўдалася.

У кастрычніку 1943 г. да вёсак Сарочына і Труды з Расоншчыны пераправіўся партызанскі атрад пад камандаваннем Сазонава (камісар Андрэеў). Утварылася 4-я Беларуская брыгада. Мы пазней пазнаёміліся з партызанамі ў Слабадзе, куды прыехалі камандзір разведкі Свірыдзенка, камісар Сямёнаў і разведчыца Фруза. З гэтага часу і пачалася наша работа разведчыкаў-сувязных. Яна заключалася ў перадачы партызанам інфармацыі аб дыслакацыі і перамяшчэнні нямецкіх войск, размяшчэнні складоў, падрыхтоўцы карных аперацый, у перадачы партызанам медыкаментаў і зброі. З кастрычніка наша група разведчыкаў-сувязных была зарэгістравана ў штабе брыгады. Кожны атрымаў псеўданім: Надзя — «Феня», Ія — «Зорка», яшчэ былі Зіна Дзехцярэўская, Валодзя Заяц. Валодзя Баброўскі — «Заглоба», святар Валынец — «Уладзімір».

Ія стала перакладчыцай па парадзе кіраўніцтва разведкі.

У ноч з 1 на 2 лістапада да нас на кватэру прыбылі Свірыдзенка і Сямёнаў. З'явілася з Дзісны Ія. Тады ёй было даручана дастаць некалькі бланкаў пашпартоў і скласці план Дзісны з умацаваннямі і пераправамі на подступах да гарнізона.

У ноч з 15 на 16 лістапада Ія ў нас на кватэры перадала Свірыдзенку 10 пашпартных бланкаў, адзін з якіх быў афармлены па іх просьбе на імя Івана Галавача з Навінцаў. Пры гэтым прысутнічалі камандзір Сямёнаў, разведчыца Фруза і незнаёмы нам камандзір са штаба брыгады.

Восенню Надзя некалькі разоў ездзіла да Пятра Сямёнавіча Гагалінскага. Неяк ноччу павінен быў быць у яго камандзір атрада, у якім знаходзіўся сын Пятра Сямёнавіча. Не запальваючы лямпу, Надзя і сям'я Гагалінскіх прасядзелі да раніцы ў чаканні камандзіра і сына. Не дачакаліся. Між тым Пётр Сямёнавіч расказваў шмат цікавага, маляваў планы на будучае. І хто тады мог ведаць, што яго і сям'ю чакае трагічная смерць.

20 лістапада ўзмоцнены атрад паліцыі пад камандаваннем вядомага ката Шамшура акружыў сядзібу Гагалінскіх. Цяжка хворы гаспадар ляжаў на ложку. Яго Шамшур застрэліў на вачах у сям'і. Потым усіх зачынілі ў свірне і жывымі спалілі жонку і двaіх малалетак. Сярэдні сын у гэты час пасвіў статак і таму застаўся ў жывых.

Паліцай, які ўдзельнічаў у аперацыі, расказваў: падзея так уразіла яго , што ён без дазволу ўцёк да ручая і схаваўся, бо не мог перанесці крыкі, плач і просьбы аб літасці няшчасных маці і дзяцей.

Старэйшаму сыну партызаны паведамілі аб трагедыі са спазненнем. Ён з таварышамі прыбыў у вёску тады, калі паліцыя была далёка.

Пасля трагедыі ў Хомічах партызаны арганізавалі напад на гарнізон у Дзісне, план якога ў іх ужо быў. У ноч на 11 лютага 1944 г. атрады 2, 3 і 5 занялі вуліцы Глыбокую, Полацкую і Заліўную, а яшчэ Дарожкавічы. Партызаны захапілі шмат мукі на паравым млыне Бімбата, статак у Дарожкавічах, спалілі млын, электрастанцыю, два склады.

Добрая інфармацыя падпольшчыкаў тлумачыцца тым, што некаторыя з іх працавалі ў адміністрацыйных органах. Ія была перакладчыцай у раённай управе. Шмат важнай інфармацыі і зброі атрымана ад Косці Шымуковіча, які служыў у паліцыі.

За нападам на Дзісну неўзабаве паследаваў разгром гарнізона ў Мётлах, у час якога подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў Пётр Яленскі, брат загінуўшага партызана.

## З успамінаў былога партызана 4-й Беларускай партызанскай брыгады М. І. Ганебнага

Восенню 1942 г. у вёсках абапал балота Багна-Мох з'явіліся першыя партызаны. Неўзабаве сюды перамясцілася 4-я Беларуская партызанская брыгада. Многія хлопцы сталі прасіцца ў рады народных мсціўцаў. Узялі толькі тых, у каго была зброя.

Нарэшце на возеры Ельня пачалі прызямляцца нашы самалёты. З-за лініі фронту рэгулярна прыбывалі зброя і боепрыпасы. І вось у сакавіку 1944 г. многія мае аднагодкі, як і я, атрымалі вінтоўкі.

4-ы атрад пад камандаваннем Гарбаценкі стаяў у вёсках Ліпна, Боркаўшчына і Фядосава. Я быў залічаны ў першы ўзвод (камандзір Кібуноў, палітрук Іваноў), які размяшчаўся ў дамах Івана Шымуковіча, Аўдоцці Шымуковіч і іншых сялян.

Сваё першае баявое хрышчэнне атрымаў праз некалькі дзён. З-за лініі фронту мы атрымалі ротныя мінамёты. Трэба было зрабіць іх выпрабаванне. А каб міны дарэмна не псаваць, вырашылі напасці на гарнізон у Дзісне. Пагрузілі на сані мінамёт, запас мін і неўзабаве прабраліся да в. Беразова. Размясціліся зручна ля ручайка, і першая пасланая намі міна ўзарвалася на двары гарнізона. Другая трапіла ў нейкі драўляны будынак, таму што запалаў пажар. Ужо пасля першага выбуху гарнізон быў падобны на растрывожаны мурашнік.

Нас, відаць, выявілі, бо па ручаю ўдарылі з буйнакаліберната кулямёта.

У красавіку 1944 г. тры атрады нашай брыгады прымалі ўдзел у дыверсійнай аперацыі на чыгунцы Полацк — Ветрына — Глыбокае. Асноўныя сілы фарсіравалі р. Дзісну ў в. Навінцы і далей рухаліся ў напрамку Ветрына. Наш атрад пераправіўся ля в. Мурашчына і рушыў на Лужкі. Нам трэба было прыкрыць правы фланг асноўных сіл па лініі ад в. Крыўкі да в. Чырвоная Гара і не даць магчымасці фарміраванню нямецкіх памагатых пад камандаваннем Вітвіцкага, якое знаходзілася ў Лужках і Гарадцы, нанесці ўдар па астатніх атрадах з флангу і тылу.

Кіраваў аперацыяй начальнік штаба 4-га атрада Лагуноў. Хоць яна прайшла паспяхова, вярталіся без асаблівага настрою. Мы зайздросцілі партызанам іншых атрадаў, якія прымалі актыўны ўдзел у аперацыі на чыгунцы. Там была канкрэтная работа. А мы ляжалі ў засадзе, чакалі праціўніка, які так і не адважыўся на сустрэчу з намі.

Неяк па каналах агентурнай разведкі штаба атрада стала вядома, што немцы плануюць вылазку ў бок Дзісны з мястэчка Германавічы для нарыхтоўкі харчоў. Гэта азначала, што многія сяляне застануцца без зерня, кароў і іншай жывёлы. Камандаванне атрада выслала дазор з мясцовых партызан Антона Івашкевіча, Паўла Шымуковіча і інш. Трапіў туды і я. Камандаваў намі камандзір аддзялення Іван Давыдаў. Мясцовасць мы ведалі добра, выбралі зручны ўскраек лесу і арганізавалі назіранне за дарогай Германавічы — Дзісна. Праз нейкі час паявілася калона немцаў і паліцаяў. У ёй было не менш 150 чалавек. Трое засталіся весці назіранне, а мы ўдваіх кінуліся ў атрад. Але конная разведка нас апярэдзіла, і атрад у баявым парадку рушыў насустрач праціўніку.

Аднак немцы паспелі абрабаваць мясцовых жыхароў, а ў адной вёсцы вырашылі пабражнічаць. Яны не чакалі там партызан, і нам удалося акружыць карнікаў. Завязалася перастрэлка. Пад ружэйна-кулямётным агнём немцы і паліцаі не прынялі сур'ёзнага бою і хутка сталі адыходзіць, падбіраючы параненых. Нарабаванае дабро вярнулі законным гаспадарам.

У канцы мая 1944 г. немцы вырашылі знішчыць нашу брыгаду і блакіраваць зону, прымусіўшы партызан скіравацца на балота Багна-Мох. Наш узвод прыкрываў адыход у напрамку Сцефанпольскія хутары — Ямна. Партызаны з мясцовых жыхароў былі выдзелены ў якасці праваднікоў. Давялося выконваць такую місію і мне. Пасля перастрэлкі з немцамі праз р. Дзісну ля Людвінова наша група пачала адыходзіць да возера Ельня. Калі мы з'явіліся на месцы збору, там было ўжо шмат партызан, падцягваліся іншыя. Рыхтаваліся да прарыву блакады. Аднак аказалася, што асноўныя сілы брыгады ўжо прарваліся. Сіл на паўторны рывок яўна не хапала, можна было загінуць усім. Тады было вырашана выходзіць невялічкімі групкамі і адзіночна. Мне ўдалося прайсці міма нямецкіх пастоў і за кароткую ноч дайсці дадому. Але там заставацца было небяспечна. Таму дняваў у суседнім хляве, глыбока закапаўшыся ў мінулагоднюю салому. Хлеў стаяў на ўскрайку, непадалёку ад лесу. Я праз шчыліну ў сцяне добра бачыў, як немцы рыхтаваліся ланцугом прачэсваць лес і балота. Праваднікамі ў іх былі мясцовыя паліцаі.

Позна вечарам голад прымусіў мяне пайсці дадому. Ноч правёў у яме на полі, а на світанні рушыў на балота. І гэта ледзь не каштавала мне жыцця, таму што немцы арганізавалі паўторнае прачэсванне лесу. Здалёк пачуліся адзіночныя стрэлы з вінтовак і аўтаматныя чэргі, брэх сабак. Да мяне прыбегла наша партызанка-разведчыца і паведаміла аб небяспецы. Здавалася, выйсця няма. Сам добраахвотна залез у лавушку. Але тут успомніў, што побач знаходзіцца багна, па якой можна прайсці

толькі ў некаторых месцах. Мы хутка па аднаму мне вядомай сцяжынцы забраліся на сярэдзіну дрыгвы. На больш высокім месцы рукамі выкапалі ў моху яму глыбінёй больш метра, якая тут жа напоўнілася рудой халоднай вадой. Мы ўдваіх залезлі ў гэтую брудную ваду па шыю, паверх галоў накрылі сябе мохам і паставілі маленькія сасоначкі. У апошні момант я заўважыў, як з лесу на чысцяк выйшлі немцы з сабакамі. На першым часе мы не адчувалі ледзянога подыху вады. Я чуў нямецкую гаворку, брэх сабак, а калі гучалі стрэлы, то чакаў, калі трапіць у мяне ці маю спадарожніцу. Але нямецкі ланцуг пастаяў крыху перад дрыгвой і стаў абыходзіць яе з абодвух бакоў, а потым скіраваўся далей.

Адчуваю, што праціўнік пайшоў, што небяспека мінула, а вылезці з ямы не магу. Сутарга звяла ногі. З цяжкасцю выцягнуў сваё цела з мокрай магілы, дапамог вызваліцца з халоднай гразі спадарожніцы. Доўга расціраліся, пакуль аднавілі нармальны кровазварот.

З вялікай перасцярогай пачалі прабірацца дамоў. Трэба было запасціся харчамі, высушыць адзенне. А праз некалькі дзён адбылася радасная сустрэча з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі.

## З успамінаў камандзіра партызанскай брыгады «Кастрычнік» Ф. К. Юрчанкі

Наш партызанскі атрад «Кастрычнік» з 25 чалавек восенню 1942 г. ішоў з-за лініі фронту. У пачатку лістапада наблізіліся да балота Багна-Мох, спыніліся ў в. Мнюхі.

Жыхары Мнюхаў сустрэлі партызан нядрэнна. За суткі мы памыліся ў гарача нацепленых лазнях, прывялі ў парадак адзенне і абутак. Трэба сказаць, што гэтая вёсачка і яе разважлівы стараста дзед Ягор былі самай надзейнай апорай нашага атрада.

Пасярэдзіне балота ёсць некалькі астравоў — узвышшаў, парослых лесам. Адзін з іх даволі вялікі. Трэба было паглядзець гэтыя мясціны і, магчыма, зрабіць там сваю базу. Але трапіць туды цяжка. Быць праваднікам ахвотна згадзіўся Арсенцій — мужчына сярэдніх гадоў з хутара Кручкі. На вялікім востраве былі два жыхары. На ўскрайку з поўначы жыў Фёдар Буда з жонкай і іх чатыры сыны. Убачыўшы Буду ўпершыню, агледзеўшы яго вельмі беднае жытло, наш партызан Ануфрый Лапін жартам усклікнуў: «Ды гэта ж яшчэ адзін Рабінзон!» Гэтая празыўка за Фёдарам і засталася. Шмат гора перанёс Рабінзон. Блакаднай восенню 1943 г. за сувязь з партызанамі фашысты жорстка збілі яго, спалілі хату, старую і меншых дзяцей прагналі з балота. Два старэйшыя сыны пайшлі ў партызаны. Сам Фёдар быў вывезены на катаржныя работы ў Германію, дзе зусім аслеп.

На паўднёвым ускрайку возера жыў таксама небагаты састарэлы мужчына з такой жа старой сястрой Іосіф Альшэўскі, якога звалі Амерыканцам. Непадалёку знаходзілася амаль новая лазня. На ўзвышшы ўздымаўся драўляны маяк, пабудаваны перад самай вайной нашымі тапографамі. З яго ў бінокль можна было выразна бачыць бліжэйшыя хутары, в. Буды, усё наваколле. А да бліжэйшага сухога берага не менш сямі кіламетраў.

Для разведкі наваколля вырашылі на некалькі дзён спыніцца тут. Хоць у хаце было вельмі цесна і не зусім сытна, Альшэўскія дзяліліся з намі апошнім кавалкам хлеба. Аднойчы я спытаў у гаспадара, чаму яго празвалі Амерыканцам. Той крыху памаўчаў, дымячы самакруткай з моцным самасадам, потым няспешна стаў расказваць.

— У маладосці сваёй зямлі я не меў. Давялося за кавалак хлеба гнуць спіну ў паноў. Пасля ў пошуках лепшага жыцця доўгі час бадзяўся па беламу свету. Пабываў у Галандыі, Францыі,



Ф. К. Юрчанка
(у цэнтры)

Англіі і нават у Амерыцы. Але добрага жыцця нідзе не знайшоў. Хвораму і знясіленаму ад цяжкай працы, без грошай давялося вярнуцца ў родныя мясціны, пасяліцца на гэтым востраве.

Дом і лазня Амерыканца доўгі час давалі надзейны прытулак партызанскім разведчыкам. Але восенню 1943 г. фашысты пад выглядам партызан заслалі на востраў сваіх «малайцоў», якія спілавалі маяк, спалілі хату і лазню Альшэўскага, а саміх гаспадароў па-зверску забілі і кінулі ў полымя.

*Сцяг працы. 1995. 11 мая.*

## З успамінаў былога камісара партызанскага атрада імя Суворава брыгады імя Леніна П. Д. Сталярова

Вайна застала мяне ў Мядзелі, дзе я працаваў першым сакратаром райкама камсамола. Воінскую часць, у якую быў накіраваны ваенкаматам, не знайшоў, бо пад націскам фашыстаў нашы войскі адыходзілі на ўсход. І ўжо ў Полацкім раёне мы аказаліся ў тыле ворага. Глухімі сцяжынкамі дабраўся да Шумілінскага (былога Сіроцінскага) раёна. Тут сустрэўся са знаёмымі людзьмі, якія мелі сувязі з падпольным райкамам партыі, што ўзначальваў сакратар Фралоў. Мяне зацвердзілі інструктарам райкама.

Я праводзіў гутаркі сярод насельніцтва аб стварэнні падпольных груп і партызанскіх атрадаў, аб зборы зброі, знішчэнні тэлефоннай сувязі, мастоў на дарогах і г. д. Неўзабаве было створана пяць партызанскіх атрадаў. Яны разграмілі ўсе невялікія нямецкія гарнізоны.

У ліпені 1942 г. райкам партыі прызначыў мяне палітруком першай роты першага атрада, камандзірам якога быў старшы лейтэнант Мікалай Аляксандравіч Сакмаркін, камісарам — Андрэй Сямёнаў. Мяне выбралі сакратаром партарганізацыі гэтага атрада. У яе ўваходзілі і члены бюро райкама партыі, і камуністы штаба брыгады Кароткіна.

Першай буйной аперацыяй брыгады Кароткіна з'явіўся разгром нямецкага гарнізона на чыгуначнай станцыі Язвіна. У выніку яе забіта каля 70 нямецкіх салдат і афіцэраў, 12 паліцэйскіх, за-



П. Д. Сталяроў

хоплены 2 ручныя кулямёты, 62 вінтоўкі і вялікая колькасць боезапасаў, батальённы мінамёт. З нашага боку толькі шэсць чалавек атрымалі раненні.

Потым настала чарга гарнізона ў мястэчку Сіроціна. У ім налічвалася каля 300 немцаў і паліцаяў. У час штурму вораг хутка быў выгнаны з населенага пункта, пакінуўшы на полі бою каля 70 забітых.

Неяк нам стала вядома, што на фронт па чыгунцы Полацк — Віцебск павінен прайсці нямецкі пасажырскі цягнік з жывой сілай. Штаб брыгады загадаў першаму партызанскаму атраду нанесці ўдар. Было забіта 67 і паранена 190 фашыстаў.

На чыгунцы Віцебск — Полацк часцей пачалі ляцець пад адхон варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай. Выконвалі гэту работу падрыўныя групы камсамольцаў.

На ўчастку дарогі, кантралюемым партызанамі, нямецкія цягнікі пачалі хадзіць толькі днём і з хуткасцю 10—20 км ў гадзіну. Пры гэтым яны штурхалі перад сабой некалькі пляцовак з гравіем. Але партызаны пачалі падрываць і іх, карыстаючыся мінамі-«вудачкамі».

У канцы 1942 г. немцы арганізавалі супраць партызан карную экспедыцыю. Брыгадзе імя Кароткіна давялося адысці ў Расонскі раён, але яна хутка зноў вярнулася. Для больш аператыўнай дзейнасці брыгаду раздзялілі на дзве часткі. Адна захавала ранейшую назву, другая стала брыгадай імя Леніна. Яе ўзначаліў М. А. Сакмаркін.

Летам 1943 г. брыгада імя Леніна перайшла ва Ушацкі раён. У гэтай зоне дзейнічала 16 партызанскіх злучэнняў, дзякуючы чаму вялікая тэрыторыя знаходзілася пад іх кантролем.

Фашысты вырашылі раз і назаўсёды пакончыць з народнымі мсціўцамі. З фронту яны гналі 60 тысяч салдат, узброеных артылерыяй, мінамётамі. Былі выкарыстаны таксама танкі, самалёты. Партызан было больш 17 тыс. 11 красавіка 1944 г. завязаліся цяжкія баі. 25 дзён партызаны стрымлівалі націск ворага, які акружыў нас з усіх бакоў. Па загаду штаба мы пачалі рыхтавацца да прарыву. З брыгады імя Леніна і 16-й брыгады імя Шлапакова стварылі групу прарыву з дзвюх тысяч чалавек. Ім супрацьстаяла 6 тыс. фашыстаў.

Перад штурмам у кожным узводзе, у ротах прайшлі сходы, на якіх былі дадзены канкрэтныя заданні кожнаму партызану.

І вось ноччу нечакана для фашыстаў пачаўся штурм. У адно імгненне была прарвана іх абарона, і партызаны выйшлі з акружэння.

Адпачывалі мы непадалёку ад Дзісны, затым праз балоты рушылі ў Шаркоўшчынскі раён, раніцай прайшлі праз вёскі Зялёнка, Руда, Краснае, знішчыўшы там нямецкія гарнізоны. І толькі ў Пагосце вораг аказаў нам супраціўленне. Акружыўшы вёску з усіх бакоў, мы хутка знішчылі 90 фашыстаў. Былі захоплены штабныя дакументы, многа бельгійскіх коней, зброі.

16 чэрвеня 1944 г. нашу брыгаду ў складзе 600 чалавек паслалі на чыгунку Вільнюс — Дзвінск для вядзення рэйкавай вайны ў Латвіі. Там мы знішчылі 4 км рэек, усю сувязь, надоўга спыніўшы на гэтым адрэзку рух цягнікоў.

У пачатку ліпеня мы сустрэліся з савецкімі войскамі.

*Сцяг працы. 1984. 26 чэрв.*

## КАРНАЯ АПЕРАЦЫЯ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ «ФРЫЦ» СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН У МІЁРСКІМ І СУСЕДНІХ РАЁНАХ

**Верасень — кастрычнік 1943 г.**

«Фрыц» — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызанскіх брыгад «Спартак», «За Радзіму», Ф. С. Шляхтунова (пазней імя Даватара), імя Варашылава, імя Гастэлы, імя Жукава, імя Ракасоўскага, асобных атрадаў партызанскіх брыгад «Жалязняк», «Народныя мсціўцы», імя С. М. Кароткіна, спецыяльнага партызанскага атрада «Сокал» і мясцовага насельніцтва ў Браслаўскім, Відзаўскім, Глыбоцкім, Міёрскім, Пастаўскім, Шаркоўшчынскім, Дунілавіцкім раёнах у верасні — кастрычніку 1943 г.

Весной 1944 г. в Миорский район прибыли 4-я Белорусская партизанская бригада и Смоленский партизанский полк Садчикова. Боевые действия народных мстителей еще более активизировались. Оккупанты провели против партизан крупную карательную экспедицию. Более суток мы сдерживали бешеный натиск врага. Однако силы были неравные, и мы вынуждены были отойти в болотистую местность под названием Багна-Мох. Здесь в течение четырех дней вели бои с наседавшими карателями. Нас бомбили, обстреливали из орудий и минометов, и ничто не могло сломить стойкость народных мстителей. Тогда гитлеровцы окружили партизан. Выход был один — идти на прорыв. Ценой больших потерь нам удалось вырваться из окружения.

2 июля 1944 г. оккупанты решили дать бой нашим передовым наступающим частям на окраине местечка Новый Погост Миорского района. Здесь противник сконцентрировал значительные силы. Партизаны нашей бригады, перерезав дорогу Браслав — Новый Погост, двинулись в наступление на гитлеровцев с тыла, а с фронта их начали громить части Красной Армии. Противник оказался между двух огней. Вскоре в местечке Новый Погост наша бригада соединилась с наступающими советскими войсками.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 492—495.*

**Імя С. М. Кароткіна** (у чэрв. 1942 — лют. 1943 партызанская брыгада Сіроцінская, у лют. — чэрв. 1943 партызанская брыгада імя Ф. Э. Дзяржынскага). Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Сіроцінскага, Расонскага, Полацкага,

Ушацкага, Пліскага і Міёрскага р-наў. Створана ў чэрв. 1942. Камандзіры брыгады С. М. Кароткін (загінуў), П. А. Хомчанка, У. М. Талаквадзе; камісары В. М. Фралоў, А. Б. Эрдман; нач. штаба У. Р. Аляксандраў, Хомчанка, М. Ф. Мацвеенка.

У ліп. 1944 з часцямі Чырв. Арміі трымала абарону на рубяжы в. Новы Пагост — воз. Важа Міёрскага р-на. 2.07.1944 брыгада (660 партызан, 6 атрадаў) злучылася з Чырв. Арміяй.

**Імя У. І. Леніна.** Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Сіроцінскага, Расонскага, Ушацкага, Гарадоцкага, Бешанковіцкага, Шаркоўшчынскага і Дзісенскага р-наў. Створана ў сак. 1943. Камандзіp брыгады М. А. Сакмаркін;' камісар А. У. Сіпко; нач. штаба Т. К. Раеўскі, А. К. Ізафатаў (загінуў), У. Р. Аляксандраў (загінуў), І. І. Канюхоў.

У маі — чэрв. 1944 вяла баі з карнікамі ў Дзісенскім р-не, прарвала абарону праціўніка на ўчастку вв. Красоўшчына — Стары Пагост.

2.07.1944 брыгада (571 партызан, 7 атрадаў) злучылася з Чырв. Арміяй.

**Імя К. К. Ракасоўскага.** Да сак. 1943 партыз. брыгада «За Савецкую Беларусь». Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Себежскага, Ідрыцкага, Невельскага р-наў Калінінскай вобл., Расонскага, Асвейскага, Дрысенскага, Полацкага, Пастаўскага, Дунілавіцкага, Докшыцкага, Міёрскага, Глыбоцкага, Мядзельскага р-наў БССР. Створана ў ліп. 1942. Камандзіры А. І. Петракоў, У. Н. Дорменеў (в. а.), А. В. Раманаў (в. а.); камісары Раманаў, Ш. Н. Нігамаеў (в. а.), П. М. Машэраў; нач. штаба Дорменеў, Г. І. Казарцаў (в. а.), У. П. Шчуцкі.

У чэрв. 1943 брыгада зрабіла баявы марш з Расонскага ў Пастаўскі р-н, у час якога вяла бой з ворагам пры фарсіраванні Зах. Дзвіны, напала на гарнізон у Міёрах.

## Дзейнічаюць ракасоўцы

### З успамінаў А. В. Раманава, камісара партызанскай брыгады імя К. К. Ракасоўскага

...Переночевав в деревне Ковалевщина близ местечка Миоры и приняв доклады командиров о состоянии дел в отрядах, командование бригады собралось в штабе, чтобы обсудить дальнейший путь. Здесь были комиссар бригады Петр Миронович Машеров, начальник штаба Владимир Никифорович Дорменев, заместитель по разведке Георгий Иванович Казарцев, начальник санслужбы Борис Степанович Волынцев, помощник начальника штаба Борис Львович Айзенберг и я. Прибыло несколько партизан из действовавшего здесь отряда А. И. Конопелько. Мы с радостью встретили их. Командир отряда подробно рассказал об обстановке между Двиной, железными дорогами Полоцк — Молодечно, Крулевщизна — Вильнюс и Литвой. В Дисне, Миорах, Друе, Браславе, Погосте, Шарковщине, Глубоком, Поставах, Козянах и других населенных пунктах стояли немецкие гарнизоны. Но, сообщил Конопелько, после нашего прихода в гарнизонах наблюдается паника. Ожидается значительное усиление миорского гарнизона.

Конопелько стал просить нас ударить по миорскому гарнизону. Откровенно говоря, нам не очень хотелось ввязываться в бой на марше. И в то же время какая разница, где бить противника — на марше или в «своем» районе?

Условились с Конопелько, что его отряд будет выполнять роль заслона от соседнего гарнизона или осуществит отвлекающий удар. В тот же день я провел командирскую рекогностировку местности и подходов к гарнизону. Вечером прибыли проводники, а на рассвете под перестук пулеметов и разноголосицу винтовочного огня мы вступили в Миоры.

Пока левый фланг наших наступав-



Нач. штаба брыгады «Кастрычнік» Г. Г. Цяльноў, кам. брыгады Ф. К. Юрчанка і камісар І. І. Юкша за распрацоўкай плана баявой аперацыі

ших отрядов имени Ленина и имени Сергея подавлял сопротивление противника, щорсовцы и котовцы с правого фланга обогнули и прочесали гарнизон. Они уничтожили миорское и леонпольское волостные управления, почту, гараж. Затем приступили к эвакуации убитых.

Мы стали отходить. Решение об отходе было принято вовремя, так как тотчас же после нашего ухода в Миоры прибыло подкрепление.

Миорская операция, проведенная 30 июня 1943 г., в итоговом отчете нашей бригады значится как неудачная. Мы потеряли комиссара отряда Василия Егоровича Крючкова, командира взвода Алексея Николаевича Дорошенко и еще восемь партизан. Четырнадцать человек было ранено. Однако позднее я узнал, что потери противника составили 85 человек. Бой в Миорах усилил разложение полицейских формирований.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 519—526.*

**«Кастрычнік».** Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Пліскага, Міёрскага, Дзісенскага, Шаркоўшчынскага, Глыбоцкага р-наў. Створана ў верас. 1943 на базе атрада «Кастрычнік», арганізаванага ў верас. 1942 ва Усвяцкім р-не Смаленскай вобл. і накіраванага ў Вілейскую вобл. Камандзіры брыгады Ф. К. Юрчанка (Ветраў) (верас. 1943 — чэрв. 1944), І. І. Юкша (в. а., чэрв. — ліп. 1944); камісар Юкша (верас. 1943 — ліп. 1944); нач. штаба Г. Т. Цяльноў (верас. 1943 — ліп. 1944, загінуў).

Партызаны праводзілі баявыя дзеянні на чыг. і шашэйных дарогах. Летам 1943 вялі засадныя баі на Зах. Дзвіне. Каля в. Крукі разбілі варожы абоз з боепрыпасамі, у верас. вялі баі з карнікамі ў Міёрскім р-не. На шашы Дзісна — Лужкі спалілі 12 мастоў. 2—4.07.1944 брыгада (256 партызан, 4 атрады) злучылася з Чырв. Арміяй.

*1-ы атрад* утвораны 1 верас. 1943, на дзень злучэння з часцямі Чырв. Арміі налічваў 63 партызаны. Камандзір Юрчанка (верас. 1943 — ліп. 1944); камісар А. П. Паляк (верас. 1943 — ліп. 1944).

*2-і атрад* утвораны 1 верас. 1943, на дзень злучэння з Чырв. Арміяй налічваў 60 партызан. Камандзір С. І. Котаў (верас. 1943 – ліп. 1944); камісар П. В. Гаўрылаў (верас. 1943 – крас. 1944, загінуў); нач. штаба З. А. Чадзін (верас. 1943 – ліп. 1944).

*3-і атрад* утвораны 1 верас. 1943, пры злучэнні з Чырв. Арміяй меў 57 партызан. Камандзір А. І. Канапелька (верас. 1943 – ліп. 1944); камісар М. Ф. Архіпаў (верас. 1943 – чэрв. 1944); нач. штаба А. А. Максімаў (верас. 1943 – лістап. 1943, загінуў), І. А. Цітоў (лістап. 1943 – снеж. 1943), Л. І. Кухта.

*4-ы атрад імя А. М. Горкага* утвораны 1 верас. 1943, пры злучэнні з Чырв. Арміяй налічваў 47 партызан. Камандзір Ф. П. Зыранаў (верас. 1943 – ліп. 1944); камісар І. А. Кабранаў (верас. 1943 – ліп. 1944).

**«Няўлоўныя»**, спецбрыгада НКДБ. Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Дрысенскага, Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Браслаўскага, Куранецкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Маладзечанскага, Міёрскага, Пастаўскага, Валожынскага, Іўеўскага, Лідскага, Навагрудскага, Навамышскага, Мінскага р-наў. Камандзіры М. С. Прудрікаў, А. Р. Марозаў.

Асобна дзеючы ў Міёрскім р-не атрад імя Молатава ў верас. 1943 уключаны ў склад створанай брыгады «За Радзіму», якая праявіла сябе на акупіраванай тэрыторыі Шаркоўшчынскага, Маладзечанскага, Відзаўскага, Браслаўскага р-наў. Камандзіры брыгады П. М. Шырокаў, М. У. Кандрашчанка; камісар Ф. К. Акулаў; нач. штаба А. А. Дзюжэнка, К. І. Капцюгоў.

За кошт партызанскіх і падпольных камсамольскіх груп Міёрскага і іншых



Група партызан брыгады «Кастрычнік»



Ф. П. Зыранаў і І. А. Кабранаў

суседніх р-наў ператварыўся ў брыгаду невялікі атрад **«Спартак»**, вылучаны 2-й Беларускай брыгадай (Мехаўскі р-н Віцебскай вобл.), якая дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Відзаўскага і Шаркоўшчынскага р-наў. Камандзір брыгады А. М. Панамароў; камісар М. К. Ігнацьеў; нач. штаба І. Н. Крысаў, Ф. А. Салаўёў.

## Баявы ўклад «Няўлоўных»

### З успамінаў М. С. Пруднікава, камандзіра партызанскай брыгады «Няўлоўныя»

Мы убедились: куда чаще всего ходили на задание наши партизаны, оттуда активнее шло к нам пополнение. Примером этого является Дисненский район. Здесь мы постоянно вели боевые действия, часто встречались с населением, проводили беседы. В итоге в этом районе у нас появилось много связных, проводников. Кроме того, отсюда к нам поступало большое пополнение. Так, из Дисненского района в бригаде «Неуловимые» мужественно сражались с врагом жители следующих деревень: Анкуды (Николай Степанович Шумакович), Воронки (Игнатий Александрович Щербицкий), Мазурино (Геннадий Михайлович Федорец), Плиговка (Владимир Сидорович Дорошкевич, Филипп Павлович Босенок), Черессы (Дарья Ульяновна Кадушко)...

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 472—477.*

# Дакументы сведчаць

### З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ ПЯРВІЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРЫ ШТАБЕ БРЫГАДЫ ІМЯ КАЛІНІНА МІЁРСКАГА РК КП(б)Б

**ад 10 мая 1944 г.**

Повестка дня:

1. О(б) улучшении работы агитаторов среди населения.
2. О проведении посевной кампании 1944 г. в Миорском районе.

1. Слушали: Информация т. Гавриленко о(б) улучшении работы агитаторов среди населения. Высказались т.т. Клименок, Крашевский.

Постановили: Работа среди населения агитаторами проводится слабо. Мало распространяется газет, не во всех деревнях ежедневно зачитываются сводки Совинформбюро, а если и зачитываются, то не все население призывают на собрания.

Исходя из вышеизложенного, партсобрание обязует всех агитаторов, а в первую очередь членов и кандидатов партии, членов ВЛКСМ, улучшить агитационную работу среди населения путем распространения газет среди населения, как районной газеты, так и получаемых из-за фронта, а также ежедневно зачитывать крестьянам сводки Совинформбюро не только на собраниях, а в отдельных дворах. Больше проводить беседы среди крестьян о(б) успехах Красной Армии на фронтах Отечественной войны, о работе рабочих и колхозников в советском тылу.

2. Слушали: О проведении посевной кампании в 1944 г. в Миорском районе.

Постановили: Провести среди крестьян нашего района собрания по вопросу выполнения весеннего сева 1944 года. Разъяснить крестьянам, что урожай озимых и яровых посева 1944 г. они будут снимать освобожденными и полностью будут им пользоваться, сдадут госпоставки советскому государству, а не немецким захватчикам, поскольку близится час освобождения Советской Белоруссии... Оказывать практическую помощь семьям красноармейцев, партизан и не имеющим рабочей силы как силой партизан, так и тягловой силой — партизанскими лошадьми.

Председатель собрания Гавриленко

### З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ МІЁРСКАГА РК КП(б)Б

**ад 15 мая 1944 г.**

Повестка дня:

1. О проведении воспитательной работы среди бойцов в духе преданности нашей Родине.
2. О проведении посевной кампании 1944 г.
3. О срыве мобилизации, проводимой немцами, белорусского населения.

Постановили: Провести до 20 мая беседы, доклады на тему «Зверства немецких захватчиков в оккупированных районах БССР». Прочитать всем бойцам книгу о зверствах фашистов в Краснодарском крае и г. Краснодаре. Провести беседы среди бойцов по материалам из книги тов. Сталина «О Великой Отечественной войне Советского Союза», первомайскому приказу тов. Сталина 1944 г., а также ежедненно зачитывать сводки Совинформбюро.

Постановили: Обязать всех членов и кандидатов партии, комиссаров отрядов, всех агитаторов выехать в свои закрепленные деревни 16 мая 1944 г. и провести среди крестьян беседы...

Постановили: Провести беседы среди населения... особенно среди молодежи, чтобы молодежь не выполняла распоряжение предателя Островского, председателя Белорусской Рады, чтобы скрывались в лесах, болотах, шли в партизанские отряды и боролись против нашего общего врага — германского фашизма.

Секретарь РК КП(б)Б Н. Ф. Гавриленко

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3731. Воп. 1 адв. Спр. 1.*

## Падпольныя антыфашысцкія групы

Падпольныя формы супраціўлення ворагу адрозніваліся ад іншых тым, што дачыненне да іх не афішыравалася. Нават дакументальныя звесткі арганізатараў партызанскіх фарміраванняў, партыйных і камсамольскіх органаў скупыя, кароткія, няпоўныя. Аднак яны ёсць. Напрыклад, 26 сакавіка 1943 г. партызан атрада «Бальшавік» брыгады «Спартак» Д. З. Пінцоў дакладваў Вілейскаму абкаму КП(б)Б, што ў сакавіку 1942 г. атрымаў заданне ад памочніка пракурора і другога сакратара Міёрскага РК ЛКСМБ Несцерава дапамагаць тром разведчыкам, прысланым з-за лініі фронту, арганізоўваць падпольныя камсамольскія арганізацыі. Чатыры такія арганізацыі з 22 членаў былі створаны, у тым ліку ў Новым Пагосце (сакратар Папкоў), Моцеўках (Красікаў) і Дзеверках (Пучкоў).

У справаздачы аб рабоце за перыяд з 15 да 31 кастрычніка 1943 г. сакратар райкама ЛКСМБ А. Ю. Міхасёнак пацвярджае існаванне трох антыфашысцкіх груп. Яны распаўсюджвалі лістоўкі і газету «Кліч партызана» ў гарнізоне Міёраў, 3 чалавекі арыштаваны. На рахунку канкрэтнай групы знішчэнне кіламетра тэлефоннай сувязі за Моцеўкамі на дарозе Міёры — Новы Пагост і распаўсюджванне лістовак і газет ў Новым Пагосце, іншых вёсках. Падкрэслена, што гэтая група самая актыўная. Яшчэ адна камсамольская група зрабіла план умацаванняў гарнізона ў Міёрах.

Сакратар Міёрскага РК КП(б)Б Ф. Н. Гаўрыленка ў палітданясенні аб рабоце за другую палову студзеня і люты 1944 г. адзначае, што за гэты перыяд камсамол стварыў 2 падпольныя камсамольскія, 3 камсамольска-маладзёжныя і 5 антыфашысцкіх груп. У гарнізоны Міёраў, Друі і Лявонпаля заслана 62 экземпляры лістовак і зваротаў да паліцэйскіх, набыты 2 вінтоўкі.

У палітданясенні за сакавік 1944 г. паведамляецца аб стварэнні камсамольска-маладзёжных груп з 9 чалавек, адна з іх (з двух членаў) у Міёрах. Арганізаваны 3 антыфашысцкія групы. Яны давалі адрасы, дзе ёсць зброя, разведданыя аб колькасці нямецкіх і паліцэйскіх гарнізонаў, распаўсюдзілі ў гарнізонах ворага 46 газет, 96 зваротаў да насельніцтва, 62 зводкі Саўінфармбюро, 94 звароты да паліцэйскіх.

А. Ю. Міхасёнак, да 4 красавіка 1944 г. сакратар Міёрскага падпольнага РК ЛКСМБ, з красавіка да ліпеня 1944 г. камісар партызанскага атрада № 3 брыгады імя Калініна, у пасляваенны час успамінаў, што за час працы ў падполлі стварыў некалькі антыфашысцкіх груп. У ліпені 1942 г. група з трох чалавек арганізавана ў Міёрах (узначальвала яе І. К. Гарбаценка, уваходзілі М. К. Гарбаценка і Г. Ф. Манцэвіч). Яны паведамлялі аб сілах гарнізона і яго колькасці, зрабілі схему ўмацаванняў, здабылі пішучую машынку, на якой потым друкаваліся лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро.

У вёсках Моцеўкі і Дзеверкі створана група з 5 чалавек, яе ўзначальваў Я. С. Пучкоў, а членамі з'яўляліся Н. А. Лутохін, С. Ф. Пучкоў, Г. С. Пучкоў і А. Пушкароў. Яны сістэматычна выводзілі са строю тэлефонна-тэлеграфную сувязь на Шаркоўшчыну, мініравалі дарогу Міёры — Шаркоўшчына, сачылі за рухам па ёй немцаў, здабывалі ў насельніцтва зброю і боепрыпасы. У сярэдзіне 1943 г. Я. С. Пучкоў быў накіраваны для арганізацыі падпольнай работы ў Глыбокае і да мая 1944 г. паведамляў каштоўныя звесткі аб гарнізоне, намерах і дзеяннях немцаў, здзяйсняў дыверсіі.

У вёсках Чэрасы, Татары і Пціцкія антыфашысцкая група складалася з 5 чалавек. Кіравала ёй А. Ф. Манцэвіч, члены — І. Ф. Лакотка, І. В. Лакотка, А. М. Манцэвіч і Дз. Барок. З удзелам А. Я. Міхасёнка яны спалілі торфа-

прадпрыемства ля Міёраў, дзе было нарыхтавана каля 2000 т паліва. Яшчэ сістэматычна пашкоджвалася тэлефонна-тэлеграфная сувязь на Дзісну, Дрысу, Браслаў, знішчаліся масты, сабрана ў насельніцтва і перададзена партызанам больш 150 вінтовак, некалькі аўтаматаў і кулямётаў, шмат боепрыпасаў. Члены гэтай групы здабывалі каштоўныя звесткі з варожых гарнізонаў Дзісны, Дрысы, Друі і Браслава. Па ініцыятыве А. М. Манцэвіч з мясцовага насельніцтва быў створаны падпольны атрад «Масква».

Па заданні Дзісенскага райкама партыі і камандавання 4-й Беларускай партызанскай брыгады І. Ф. Лакотка быў накіраваны ў Глыбокае і праз Я. С. Пучкова звязаўся з групай Сабалеўскага, разам з якім даставіў з Глыбокага ў брыгаду шрыфт і абсталяванне для друкарні, якая потым выпускала лістоўкі і нават газету.

У Картавах, Марозьках і Пестунах дзейнічала антыфашысцкая група з трох чалавек пад кіраўніцтвам Я. С. Арлоўскага. У яе яшчэ ўваходзілі В. Маісееў і Я. Нікіфараў. Яны знішчылі два малочныя пункты, здабывалі для партызан зброю, распаўсюджвалі лістоўкі, рыхтавалі моладзь да ўзброенай барацьбы.

Я. С. Пучкоў, актыўны падпольшчык, у маі 1943 г. наладзіў сувязі з падпольным РК ЛКСМБ, здабываў разведданыя з гарнізонаў Міёраў і Шаркоўшчыны, распаўсюджваў газеты і лістоўкі, праводзіў агітацыйную работу сярод насельніцтва, збіраў зброю і боепрыпасы, прымаў непасрэдны ўдзел у дыверсіях на камунікацыях, дастаўляў узрыўчатку ў Міёры. Яму актыўна дапамагалі ў падпольнай рабоце бацька і брат.

Я. С. Арлоўскі з Картаваў у маі 1941 г. быў выбраны сакратаром калгаснай камсамольскай арганізацыі, працаваў бухгалтарам. З пачаткам акупацыі разам з іншай моладдзю дапамагаў адступаючым чырвонаармейцам. З настаў-



Я. С. Арлоўскі

нікам Дварнасельскай школы Васілём Маісеевым слухаў дэтэктарны радыёпрыёмнік і распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро.

Па ініцыятыве камсамольцаў у снежні 1941 г. у школе з дапамогай настаўнікаў быў пастаўлены спектакль па савецкай п'есе «Чырвоныя кветкі Беларусі», а для гэтага давялося пераканаць каменданта, што пастаноўка да палітыкі дачынення не мае. Ён меў вялікі поспех. Аднак паўторнае выступленне для жыхароў навакольных вёсак не закончылася, было разагнана паліцэйскімі.

Паступова зводкі Саўінфармбюро дапоўніліся ўласнымі лістоўкамі. Яны аказвалі ўплыў на мясцовае насельніцтва. Так, была сарвана дастаўка дроў гарнізону Міёраў зімой 1942 г., хоць многім сялянам і давялося паспытаць паліцэйскіх гумавых палак.

Са з'яўленнем партызан пачалася агентурная работа, збор зброі, а партызанам перадалі адразу 16 вінтовак і больш тысячы патронаў, шмат медыкаментаў. Пасля выступлення перад камсамольцамі вёскі А. Ю. Міхасёнка ўтварылася антыфашысцкая група пад кіраўніцтвам Я. С. Арлоўскага. Сувязным у ёй быў І. М. Радзіонаў, хата якога знаходзілася на партызанскай сцежцы паміж Картавамі і Мнюхамі. Першае заданне — спілаваць 10 слупоў тэлефонна-тэлеграфнай лініі Міёры — Глыбокае — выканалі ў наступную ноч.

Па ініцыятыве камсамольцаў у агульны аддзел павятовай управы ўладка-

ваўся на працу А. Сінкевіч. Ён папярэджваў аб плануемых адпраўках моладзі ў Германію і іншых намерах акупацыйных улад. Каштоўныя звесткі здабываў С. А. Коласаў з Марозькаў, родзіч якога служыў у паліцыі. Дзяліўся сакрэтамі служачы паліцыі М. К. Васільеў. С. В. Вайсковіч са Свярдлоў даведваўся пра мяркуемыя паліцэйскія засады. Цікавыя звесткі паступалі пра гарнізон ад краўца Б. Масальскага з Міёраў.

Група загадзя даведалася і пра карную экспедыцыю супраць партызан у лагеры Зялёнка і партызанскіх вёсак Мнюхі, Дзянісава, Сухаверж'е. З-пад аблавы тады выйшлі народныя мсціўцы, схавалася і мясцовая моладзь.

Успаміны падпольшчыкаў чэраскай групы сведчаць, што і іх дзейнасць развівалася падобным чынам. Спачатку збор зброі і боепрыпасаў, распаўсюджанне лістовак, выратаванне моладзі ад угону ў Германію, знішчэнне мастоў і тэлефоннай лініі, потым сувязь з атрадам «Спартак», 4-й Беларускай партызанскай брыгадай, агентурная і прапагандысцкая работа пры падтрымцы падпольных партыйных і камсамольскіх органаў. Вядома, падпольная дзейнасць патрабавала добраахвотных памочнікаў. Сярод іх А. Г. Мароз, Н. П. Пацеенак, П. М. Сушко. Схоплены і расстраляны летам 1943 г. Аркадзь і Яніна Баркі, але яны нікога не выдалі.

Калі І. Ф. Лакотка ўстанавіў у Глыбокім сувязі з групай Ю. Сабалеўскага, І. Нямірскі, І. В. Лакотка і Н. П. Пацеенак даставілі туды 4 магнітныя міны. Адна з іх знішчыла бензасклад ля чыгуначнай станцыі, астатнія былі прымацаваны да ваенных эшалонаў, што ішлі на фронт. Менавіта ў Глыбокім былі выраблены для партызан пячаткі Браслаўскага, Глыбоцкага, Міёрскага і Шаркоўшчынскага раёнаў, адтуль паступалі бланкі нямецкіх пашпартоў.

Існаванне падпольных груп у Дзеверках і Моцеўках (Пучковы і Лутохін), Канахах, Картавых і Марозьках (Арлоўскі, Маісееў), Пціцкіх і Чэрасах (Барок, Лакотка) пацвярджае камісар партызанскага атрада № 1 брыгады імя Калініна М. Ц. Лісічонак. Яшчэ ён называе ў ліку падпольшчыкаў А. Даргель з Белеўцаў (сын яе быў у гэтай брыгадзе), якая потым актыўна ўдзельнічала ў аднаўленні савецкай улады, з'яўлялася старшынёй Наўгародскага сельскага Савета, братоў Грэцкіх з Глінскіх, малодшы з якіх працаваў пасля вызвалення сакратаром Міёрскага райвыканкама. Сам М. Ц. Лісічонак з восені 1943 г. зацверджаны сакратаром падпольнага Міёрскага РК ЛКСМБ па прапагандзе, першым сакратаром якога быў М. Крашэўскі, сакратарамі і членамі бюро А. Міхасёнак, С. Храпавіцкі.

Вось што гавораць архіўныя дакументы:

*Даведка Нацыянальнага архіва*
*Рэспублікі Беларусь*
*№ 122-ПА ад 10.10.1974 г.*

Паведамляем, што па ўліковых даных архіва ў ліку партызан Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны значацца:

1. Нікіфараў Якаў Сямёнавіч, н. у 1921, з 14.10.1943 да 20.3.1944 радавы партызан атрада № 4 брыгады «Кастрычнік».

2. Маісееў Васіль Канстанцінавіч, н. у 1924, з 10.11.1943 да 7.1944 радавы партызан атрада імя М. Горкага брыгады «Кастрычнік».

3. Лакотка Іван Васільевіч, н. у 1925, з 1.7.1943 да 1.6.1944 сувязны партызанскага атрада «Масква» 4-й Беларускай партызанскай брыгады.

4. Мароз Анастасія Рыгораўна, н. у 1925, сувязная партызанскага атрада «Масква» 4-й Беларускай партызанскай брыгады, не ўказана, з якога і па які час.

Звестак аб удзеле ў партызанскім руху Радзіонава Іосіфа Максімавіча, Арлоўскага Яўтена Сцяпанавіча, Вайсковіча Сцяпана Вікенцьевіча, Коласава Сямёна Алімпіевіча, Пучкова Яфіма Савельевіча, Пучкова Савелія Фёдаравіча, Пучкова Гаўрыіла Савельевіча, Лутохіна Назара Акімавіча, Пушкарова Анікея Фёдаравіча, Гарбаценка Іраіды Кузьмінічны, Гарбаценка Марыі Кузьмінічны, Манцэвіча Георгія Фролавіча ў матэрыялах архіва не выяўлена».

У заключэнне можна толькі сказаць, што падпольная работа ў тыле ворага ў свой час не магла быць афіцыйна запратакаліравана, усялякія пісьмовыя сведчанні аб дачыненні да яе каштавалі жыцця. Партызанскія архівы ў арыгінале амаль не захаваліся з-за карнай экспедыцыі і блакады ў маі — чэрвені 1944 г., а справаздачы брыгад, падрыхтаваныя пасля вызвалення, не адлюстроўваюць поўнага малюнка ўсенароднай барацьбы супраць захопнікаў у нашых мясцінах.

Новых дакументальных сведчанняў аб дзейнасці падпольшчыкаў на Міёршчыне ў час пошукаў у апошнія дзесяцігоддзі не выяўлена.

*Л. А. Матэленак*

## Яны змагаліся ў падполлі

Трагедыя, якую і сёння не забылі ў Дзісне, пачалася 4 сакавіка 1944 г. У гэты дзень немцы арыштавалі маладую падпольшчыцу Марыю Лісоўскую, якая працавала поварам у паліцыі. Па ўстрывожанаму гораду папаўзлі чуткі пра партызанскае заданне атруціць здраднікаў-паліцэйскіх, якое павінна была выканаць Марыя. І гэтая дыверсія ўвязвалася з адначасовым нападам народных мсціўцаў.

Але, надзіва, дзяўчыну доўга не трымалі, хоць, як потым выявілася, атруту знайшлі. Немцы гулялі ў кошкі-мышкі. Ім трэба было выявіць сувязі падпольшчыкаў. І на наступны дзень, калі Марыя забегла папярэдзіць аб небяспецы Зіну Стому, абедзвюх дзяўчат арыштавалі. Для іх пачаліся допыты, для іншых — трывожнае чаканне. І трывога апраўдалася: Зіна Стома пры першым допыце выдала таварышаў.

10 сакавіка па гораду пракацілася хваля арыштаў. Палявая паліцыя ўзяла Ію Лапіцкую, Любу Лушчык, Мікалая Федарца, урача Пятрова — савецкага ваеннапалоннага, Уладзіміра Анатольевіча Зайца, Арлоўскага, Маркевіча, Шчарбіцкага і Шкялёнка.

**Ія Лапіцкая.** Архіўная даведка Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ № 5209-Н ад 24 ліпеня 1965 г.: «Лапіцкая Ія Іванаўна, 1925 года нараджэння, лічыцца сувязной партызанскай брыгады Беларусі Вялікай Айчыннай вайны (з якога часу — не ўказана). У спісе партызанскай брыгады ёсць адзнака, што Лапіцкая І. І. арыштавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі (калі — не значыцца). Даных аб яе далейшым лёсе партархіў не мае».

Больш падрабязна расказаць пра Ію дазваляе дзённік, які ў апошнія гады



У. А. Заяц з сям'ёй

жыцця вёў яе бацька — І. А. Лапіцкі. Яна нарадзілася 7 студзеня 1925 г. ў Сцефанполлі ў сям'і дробнага служачага. Жыла з бацькамі ў Мікалаеве, дзе закончыла пачатковую школу. Потым працягвала вучобу ў гімназіі ў Дзісне. Калі ж пачалася вайна і Дзісеншчына аказалася ў глыбокім тыле ворага, вымушана была пакінуць вучобу і ўладкавацца рэгістратарам ў гарадскую бальніцу.

Калі на Дзісеншчыне з'явіліся партызаны, Ія перадавала ім медыкаменты, адзенне, абутак. З кастрычніка 1943 г. падтрымлівала пастаянную сувязь з намеснікам камандзіра 4-й Беларускай партызанскай брыгады па разведцы Маркам Свірыдзенкам і камандзірам 3-га атрада А. С. Сямёнавым. Ад іх яна атрымлівала заданні, ім давала справаздачу аб зробленым.

Першая сустрэча з партызанскім камандаваннем у Іі адбылася 1 лістапада 1943 г. ў Мікалаёве. Ёй расказалі аб асаблівасцях падпольнай работы і парэкамендавалі прыняць прапанову працаваць перакладчыцай у раённай управе.

У падполлі Ію Лапіцкую ведалі як «Зорку». Яна паведамляла партызанам аб размяшчэнні нямецкіх войск, абарончых збудаванняў, перавозках. Перадавала зброю, медыкаменты, адзенне і абутак. А ў другой палавіне лістапада разведчыца выканала вельмі адказнае заданне: выкрала з сейфа ўправы значную колькасць пашпартоў з пячаткамі і подпісамі.

У пачатку 1944 г. Ія склала план размяшчэння гарнізона, умацаванняў, падходаў і пад'ездаў да аб'ектаў у Дзісне. Карыстаючыся ім, партызаны ноччу 11 лістапада зрабілі паспяховы напад на горад. У першых радах народных мсціўцаў на самых небяспечных напрамках змагалася з ворагам у гэтым баі сама падпольшчыца і яе маці Надзея Мікалаеўна.

**Мікалай Федарэц.** Лёс наканаваў яму цяжкія выпрабаванні і кароткае жыццё. Мікалай Ануфрыевіч нарадзіўся ў 1920 г. і рана страціў бацькоў. З дзіцячага дома яго забралі добрыя людзі, для якіх ён стаў сапраўдным сынам. Жыў у Дзісне. У 1939 г. ажаніўся і да пачатку вайны працаваў на пошце.

З успамінаў Н. Я. Федарэц, жонкі М. А. Федарца:

— Наша сям'я ўся была партызанская. У 1942 г. маю маці расстралялі немцы, бацьку арыштавалі. Мікалай устанавіў сувязь з партызанамі. У лесе за Дзвіной пасля баёў засталося шмат зброі. Муж разам з маім братам Аляксандрам, якому ў той час ішоў шаснаццаты год, збіралі гранаты, патроны і перапраўлялі партызанам. Калі ж Аляксандр украў пісталет у немца — быў арыштаваны і вывезены ў Германію. У няволю саслалі маю сястру. Арыштавалі і мяне.

Ішла вайна, не хапала самага звычайнага. У лесе патрэбны былі не толькі зброя і боепрыпасы, але і папера для лістовак, алоўкі, соль, адзенне, абутак. Мікалаю даставаць усё гэта было крыху лягчэй, ён працаваў брыгадзірам будаўнікоў. Толькі вось не прыпомню, каб яны што-небудзь пабудавалі. Больш руіны разбіралі.

*Даведка.* «Дадзена гэта даведка Федарцовай Ніне Я. у тым, што былы яе муж Федарэц Мікалай Ануфрыевіч у час нямецкай акупацыі ў 1943 г. працаваў у агентуры пры 5-м партызанскім атрадзе 4-й Беларускай брыгады, а таксама забяспечваў партызанскі атрад узрыўнымі матэрыяламі. У чым і выдадзена гэтая даведка былым інструктарам па ўзрыўной справе 4-й Беларускай брыгады Гладкоўскім Хрыстафорам М. 20.1.51 г.»

Высоцкая Зоя Васільеўна, жыхарка в. Язна:

— У час Вялікай Айчыннай вайны у 1944 г. я была арыштавана немцамі і знаходзілася ў турме ў г. Верхнядзвінску Віцебскай вобласці. Разам са мной знаходзіўся ў зняволенні Федарэц Мікалай Ануфрыевіч з г. Дзісна, арышта-

ваны за сувязь з партызанамі. У час зняволення ён падвяргаўся жорсткім катаванням і ў канцы быў расстраляны.

М. А. Федарцу ішоў тады 24-ы год.

**Зоя Шкялёнак.** 31 сакавіка немцы прыехалі за 15-гадовай Зояй Шкялёнак — цяпер Зояй Уладзіміраўнай Высоцкай, медсястрой Язненскай участковай бальніцы. Адразу была сустрэча на допыце з Зінай Стомай. Тая ведала, што сястра Зоі Тамара (цяпер Лапкоўская) у партызанах. Яна і сапраўды знаходзілася ў брыгадзе «Кастрычнік», якой камандаваў Ф. К. Юрчанка (Ветраў). Праз яе Зоя паведамляла ў лес, дзе мясцовае насельніцтва хавала зброю, боепрыпасы, адзенне, падабраныя на месцах былых баёў. Толькі З. Стома гэтага не ведала, а ад таго, што здрадніца ведала, Зоя адмаўлялася.

— Так, гэта была падпольная арганізацыя,— і цяпер лічыць Зоя Уладзіміраўна,— але я з ёй сувязі не мела. Мяне дапытвалі двое сутак, я потым два тыдні не магла легчы на спіну.

Пашанцавала са следчым, лічыць З. У. Высоцкая. Немец у гадах меў такую ж пятнаццацігадовую дачку, здымак яе потым паказваў. Ён хутка закрыў справу і не дазваляў здзекавацца над дзяўчынай.

Зоя Высоцкая спачатку сядзела ў адзіночцы, потым у агульнай камеры, разам з усімі.

А аднойчы ноччу яе разбудзіў нейкі рух і ціхі плач. Марыі Лісоўскай, Любе Лушчык, Іі Лапіцкай, Мікалаю Федарцу і яшчэ некаму пятаму звязалі рукі і пасадзілі ў крытую машыну. Было 4 гадзіны раніцы 28 красавіка 1944 г.

Яна бачыла, як пазней, днём, выводзілі з турмы мужа і жонку Арлоўскіх, Шчарбіцкага, іншых вязняў.

Чарга самой падышла 6 мая. Разам з іншымі дзяўчатамі-падлеткамі яе пасадзілі ў вагон, які ішоў у Германію. Апынулася ў канцлагеры ля горада Зіген, дзе яе вызвалілі амерыканцы. Дадому вярнулася толькі восенню 1945 г.

**Уладзімір Заяц.** У пасведчанні партызана ўказваецца, што У. П. Заяц «сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 7 верасня 1943 г. па 3 ліпеня 1944 г. у якасці сувязнога атрада № 3 4-й Беларускай партызанскай брыгады».

Уладзімір Піліпавіч нарадзіўся ў 1922 г. у сялянскай сям'і. Закончыў 5 класаў польскай школы. Да 1939 г. працаваў у гаспадарцы бацькоў, якія мелі 14 гектараў зямлі. Пасля ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі ўступіў у калгас, які ўтварыўся ў Мікалаёве. А неўзабаве яго накіравалі на курсы шафёраў у мястэчка Вішнёва Валожынскага раёна. Толькі закончыць іх перашкодзіла вайна.

Уладзімір быў камсамольцам, як і іншыя юнакі, што займаліся на курсах. Вярнуўшыся дамоў, Уладзімір зноў, як і раней, араў зямлю ў бацькоў. Калі ж ў наваколлі з'явіліся партызаны, дапамагаў ім харчамі. З прыходам у гэтыя мясціны 4-й Беларускай партызанскай брыгады ўстанавіў сувязь з атрадам № 3, якім камандаваў І. Ф. Буваленка, і непасрэдна з намеснікам камандзіра брыгады па разведцы Маркам Данілавічам Свірыдзенкам.

— Я быў агентурным разведчыкам,— успамінае Уладзімір Піліпавіч.— Спачатку падтрымліваў сувязь з Іяй Лапіцкай, якая ў той час працавала ва ўправе. Яна перадавала пакеты, патроны. Ад мяне іх забіраў Мілецій Васільевіч Свяцкі.

Аднак частыя візіты да Іі родных, ды яшчэ з партызанскай зоны, маглі насцярожыць немцаў. Таму я пачаў выконваць іншыя заданні. Сустракаўся з Уладзімірам Рэдзькам і Генадзем Тарараскам, якія працавалі ў дзісенскай управе. Прыносіў ім заданні, яны перадавалі звесткі аб умацаваннях гарнізона.

Міхаіл Цюлька — ён тады служыў у паліцыі — перадаваў партызанам зброю — вінтоўкі, патроны, гранаты. Паведамляў аб перамяшчэнні немцаў

і іх паслугачоў. Калі ж яго западозрылі ў сувязі з народнымі мсціўцамі, дапамог яму дабрацца да атрада. Дарэчы, у партызаны ён перайшоў са зброяй у руках.

Імёны і прозвішчы многіх, з кім сустракаўся, нават назваць не магу — не ведаю. У атрадзе давалі паролі, называлі месца сустрэчы, прыкметы. Напрыклад, у Дзісне ў адным з дамоў мне трэба было звярнуцца да дзяўчыны, якая пры гэтым будзе падмятаць венікам падлогу, з фразай: «Мне хлеба хочацца, дазвольце хлеба».

Малады тады быў, хваляваўся. Ды і было чаго хвалявацца — за зброю маглі расстраляць. А дзяўчына ў той раз перадала нямецкі аўтамат. Разабраў яго, прывязаў пад адзенне. Тут не да роспыту, не да знаёмства. Тым больш што рабіць гэта разведчыкам забаранялася.

Зброю і боепрыпасы перадаваў таксама з паліцыі Васіль Окунь.

Запомнілася, як аднойчы восенню ішоў пасля выканання задання з Дзісны. Пад адзеннем — зброя, гранаты, пакет ад Міхаіла Цюлькі. Бачу: насустрач немцы рухаюцца, рассыпаўшыся шарэнгай, як для аблавы. Узышоў тады на раллю, па адной гранаце ў разоры пакідаў, прысыпаў крыху, тое ж зрабіў з пакетам, зброяй. Сабе пакінуў толькі пісталет. З гэтым накіраваўся да Маркевіча, які жыў на ўскрайку Дзісны. У старога немцы двух сыноў расстралялі, ён не адмовіўся мяне схаваць. Залез на хлеў, саломай прыкрыўся, пісталет падрыхтаваў. Немцы зайшлі ў двор, адзін з іх нават паглядзеў на хлеў, толькі мяне пад саломай не заўважыў. Усё скончылася добра.

Асабліва хачу расказаць пра святара Мікалая Нікадзімавіча Валынца. Ён жыў у Слабадзе, а службу вёў у царкве ў Галомысле. Толькі папом яго зрабіла вайна, да гэтага працаваў настаўнікам. Па заданні партызанскага камандавання М. Н. Валынец ездзіў у Мінск, а калі ў Дзісну наведалася вялікае нямецкае начальства, дапамог Іі Лапіцкай зняць копію другой лініі франтавых умацаванняў.

Хата М. Н. Валынца ў Слабадзе была надзейным месцам сустрэч партызанскіх разведчыкаў і падпольшчыкаў. Асабіста мне давялося ўдзельнічаць у некалькіх такіх нарадах. Камандзір 4-й Беларускай партызанскай брыгады В. А. Сазыкін праводзіў адну з іх пасля забойства гаўляйтэра Кубэ. Удзел у ёй прымалі агентурныя разведчыкі Уладзімір Іванавіч Баброўскі, Мілецій Васільевіч Свяцкі і інш.

**Глафіра Васільеўна Качан.** Летам 1942 г. у Каз'янскіх лясах з'явіліся партызаны атрада «Спартак», затым брыгады «Кастрычнік», а ў 1943 г. у Дзісенскім раёне стала дыслацыравацца 4-я Беларуская партызанская брыгада. Падпольшчыкі групамі са сваёй зброяй рушылі ў партызанскія атрады. Асобныя з іх па заданнях атрадаў засталіся ў вёсках сувязнымі, агентурнымі разведчыкамі, аказваючы партызанам вялікую дапамогу.

Добра праявіла сябе ў гэтай справе адна з арганізатараў падпольнага атрада Г. Рымдзёнак (па мужу Качан). Глафіра спярша была сувязной, агентурнай разведчыцай брыгады «Кастрычнік», затым пачала працаваць на 4-ю Беларускую партызанскую брыгаду. Пры разгроме брыгадай гарнізонаў у Дзісне, Ліхачах Рымдзёнак забяспечвала камандаванне брыгады каштоўнымі разведданымі. Яна прывяла ў брыгаду шмат паліцэйскіх, самаахоўцаў. Па даных яе разведкі брыгада напала на нямецкі гарнізон у Дзісне. Знішчылі электрастанцыю, млын, зернесховішчы і забралі больш 80 галоў буйной рагатай жывёлы, якія былі раздадзены бядняйшаму насельніцтву. Гітлераўцы натрапілі на след Рымдзёнак і хацелі схапіць яе, але вопытная разведчыца паспела пайсці ў атрад. Літаральна з-пад носу гітлераўцаў атрад вывез яе сям'ю ў лес, а потым пераправіў у савецкі тыл.

Будучы ў 3-м атрадзе брыгады, Гла-

фіра ўдзельнічала ў многіх баявых аперацыях, часта хадзіла ў разведку. Разам з атрадам і штабам брыгады ў час майскай (1944 г.) карнай экспедыцыі ў раёне балота Багна-Мох трапіла ў шчыльнае варожае акружэнне і была схоплена гітлераўцамі. Ад расстрэлу выратаваў яе нямецкі пашпарт, з якім яна часта хадзіла ў разведку: гітлераўцы не палічылі яе за партызанку і разам з грамадзянскім насельніцтвам вывезлі ў Германію. Вярнулася яна на Радзіму ў 1945 г.

Васіль Арсенавіч Яленскі, пенсіянер: «Мне вядома, што ў час нямецкай акупацыі на тэрыторыі Мікалаёўскага сельсавета было створана маладзёжнае падполле, у якое ўваходзілі мае браты Андрэй і Канстанцін, сёстры Люба і Марыя, а таксама Глафіра Качан (Рымдзёнак) і многія іншыя.

Падпольшчыкі збіралі зброю і боепрыпасы, прыводзілі ваеннапалонных у партызанскі атрад. У прыватнасці, быў выратаваны афіцэр Чырвонай Арміі Іван Фёдаравіч Дубкоў, які жыў на хутары Кульвокі. Пад яго камандаваннем быў створаны з падпольшчыкаў і ваеннапалонных атрад народных мсціўцаў. Але сярод іх аказаўся здраднік. Немцы правялі масавыя арышты падпольшчыкаў, былі арыштаваны мой брат Андрэй і сястра Люба, грамадзянка Глафіра Качан (Рымдзёнак) і інш. Пасля допытаў, якія працягваліся каля месяца, частку падпольшчыкаў выпусцілі, а частку, у тым ліку брата Андрэя, расстралялі. Праз некаторы час арышты паўтарыліся. Схапілі мяне, малодшага брата Канстанціна і Г. В. Качан, а таксама многіх іншых. На допыце ніхто нікога не выдаў, і былі выпушчаны на волю. Брат Канстанцін і пасля гэтага забяспечваў партызан харчамі, зброяй і звесткамі, а неўзабаве пайшоў у 4-ю Беларускую брыгаду. Загінуў ён пры разгроме гарнізона ў в. Чарапы».

...На абеліску ў гонар землякоў, якія загінулі за свабоду і незалежнасць радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ёсць і імёны падпольшчыкаў, што аддалі сваё жыццё ў далёкім 1944 г.

*Сцяг працы. 1986. № 20—23.*

## Чарэскае падполле

### З успамінаў былых падпольшчыкаў І. В. Лакоткі і І. Ф. Лакоткі

Неподалеку от районного центра Миоры расположена д. Черессы. После освобождения Западной Белоруссии в 1939 г. жизнь здесь забила ключом. Был создан колхоз, открыт клуб, библиотека, медпункт, школа-семилетка. В деревне расцвела культурная жизнь. Хорошо работала комсомольская организация, объединившая молодежь колхоза, школы, других юношей и девушек. Секретарем организации стал Анатолий Крук из деревни Юнцы, работавший заведующим избой-читальней.

Когда началась война, часть комсомольцев эвакуировалась. Из оставшихся на месте была создана подпольная комсомольская группа во главе с Дмитрием Борком. Первоначально членами ее были Антонина Манцевич, Виктор Сушко и Иван Федорович Лакотко. Деятельное участие в организации комсомола принимали старые подпольщики: учительница Чересской школы Александра Михайловна Манцевич, бывший председатель сельсовета Павел Сушко, бывший председатель колхоза Иосиф Счастный. Осенью 1941 г. наша группа была еще слабой. В нее входили Юрий Манцевич и Иван Васильевич Лакотко. Позже в группу вступила Ольга Криштапенок, Анастасия Мороз, Мария Счастная, Сергей Счастный, Федор Степуленок, Ольга Грецкая, Алексей Милун, Николай Патеенок.

Нам удалось раздобыть несколько винтовок, гранат и даже пулемет. Бои в нашей местности не велись, и достать оружие было делом нелегким. Комсомольцы присматривались к молодежи,

подбирали надежных людей. Большое влияние на комсомольцев оказывала Александра Михайловна Манцевич. Она увлекала нас своей неутомимой энергией, огромной силой воли, верой в победу советского народа.

У комсомольцев не было опыта подпольной работы. Они не могли самостоятельно решать многие вопросы, недостаточно ориентировались в политической обстановке. На помощь им всегда приходила Александра Михайловна. Она внимательно следила за деятельностью комсомольцев, своевременно предостерегала против необдуманных поступков, давала советы, инструктировала, присутствовала на собраниях. Для встреч молодежи мы использовали вечеринки и церковные праздники.

Наступила тяжелая зима 1941/42 г. Советских людей расстреливали по подозрению в антифашистской деятельности, отправляли на работы в Германию. Александра Михайловна Манцевич поехала в Браслав для связи с местными антифашистами. Мы сопровождали ее. Подпольщики развернули активную борьбу за спасение людей от угона в Германию, организовывали их побеги.

Весной 1942 г. деятельность подпольщиков активизировалась. Комсомольцы распространяли листовки, вели агитационно-пропагандистскую работу, принимали участие в небольших диверсиях. Когда удавалось достать сброшенные с советских самолетов листовки, мы размножали их и читали среди населения. Группа наших комсомольцев (Дмитрий и Аркадий Борки, Антонина Манцевич, Иван Федорович Лакотко, Иосиф Счастный) выводила из строя телефонную связь на линии Миоры — Дисна.

Нам нужен был радиоприемник. По рекомендации А. М. Манцевич Михаил Сушко из деревни Крюки принес некоторые детали. Альбин Кучинский из Миор раздобыл наушники и помог смонтировать одноламповый приемник. В апреле 1942 г. мы установили его на гумне и стали принимать передачи из Москвы. Полученные по радио сообщения передавали подпольщикам, а те распространяли их среди населения, разоблачая фашистскую ложь. Подпольщики пытались связаться с партизанами. Но лишь осенью 1942 г. удалось установить связь с отрядом «Спартак».

Партизанское движение в районе росло и ширилось. Весной 1943 г. вся территория сельсовета находилась под контролем партизан. Оккупанты укрепили гарнизон в Миорах, ко всем приезжающим из деревень стали относиться с большой подозрительностью. Мы доставляли в гарнизон листовки, пряча их в рамах велосипедов. Листовки поступали на квартиру Альбина Кучинского, проживавшего по улице Набережной. Иногда по просьбе партизан доставляли из Миор медикаменты.

Членами подпольного райкома комсомола были Дмитрий Борок, Татьяна Манцевич и Иван Федорович Лакотко, а секретарем — Ананий Михасенок. Райком держал непосредственную связь с руководителями групп. В Чересскую группу входили Юрий Манцевич, Алексей Милун, Мария Казюлина, Сергей Счастный.

Весной 1943 г. фашисты схватили Аркадия Мателенка и хотели отправить в Германию. Ему удалось бежать. Наши подпольщики спрятали его, а назавтра он уже был в рядах народных мстителей. Таким же образом мы переправили к партизанам Бронислава Шубина, бежавшего от расстрела из Глубокого.

Работа подпольщиков все более усложнялась. На заседании комитета подпольной комсомольской организации решили: в случае, если фашисты нападут на след подпольщиков, всем уходить в партизанский отряд.

В Дисненский район прибыла 4-я Белорусская партизанская бригада. Мы установили с ней контакт. Правда, связь с бригадой была затруднительна. При транспортировке корреспонденцию приходилось тщательно прятать в телеге или в санях. Связные были снабжены

немецкими документами, которые подпольщики добывали в Миорах. По заданию бригады в типографии были отлиты круглые печати Миорского, Шарковщинского, Дисненского, Дриссенского и Плисского районов. Были также изготовлены бланки документов. Организацией работы групп, налаживанием регулярной связи с бригадой, отправкой литературы и выполнением заданий командования бригады, а также приемом и анализом сообщений, поступавших из гарнизона, занималась А. М. Манцевич, комиссар отряда «Москва».

И. Ф. Лакотко в то время находился в Миорах и установил связь с подпольной группой Ирины Горбатенко. 30 мая 1944 г. в Миоры прибыла фашистская воинская часть, которая приняла участие в карательной экспедиции против партизан. Сведения о прибытии карателей И. Ф. Лакотко доставил партизанам. В это время мы оба вступили в 6-й отряд 4-й Белорусской бригады.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1976. С. 486—490.*

## З успамінаў А. М. Манцэвіч

В 1942 г. мне удалось наладить связь с браславскими антифашистами, в частности с А. А. Василевским и Д. А. Василевским. Это они спасли меня от смерти и угона в Германию.

К осени 1943 г. у нас насчитывалось уже более ста подпольщиков, объединенных в группы по 4—5 человек, а Чересская, Миорская, Пересловская и Слободская группы насчитывали по 15—20 человек каждая. Возглавляли их руководители, законспирированные подпольными кличками.

2 сентября 1943 г. стало известно, что фашисты готовят арест нашей семьи. Вечером того же дня группа партизан 4-й Белорусской бригады вывезла нашу семью в партизанский лагерь. Но связь с подпольщиками я не теряла. Почти ежедневно из групп поступали донесения о вражеских гарнизонах, о передвижении гитлеровцев, о замыслах противника — агентурная разведка работала отлично.

В начале 1944 г. подпольщики объединились в партизанский отряд «Москва», оперативно подчиненный командованию 4-й бригады. Я стала комиссаром отряда. Мы взрывали мосты, уничтожали телефонную связь, сжигали склады и мельницы. Юзя Шубина сожгла в Миорах здание волостной управы вместе со всеми налоговыми документами и списками людей, предназначенных для отправки в Германию. Мужественную патриотку гитлеровцы казнили, ее брату удалось бежать. Миорский район входил в состав Глубокского гебитскомиссариата. В Глубоком был довольно большой гарнизон, проходила железная дорога, имелись лагерь военнопленных, типография и другие объекты, представлявшие интерес для партизан. Туда по моему приказу был направлен Иван Федорович Лакотко под кличкой Щеглов. Он поселился в семье железнодорожника, получал от последнего ценные сведения о проходивших через Глубокое эшелонах противника. Организовал там группу подпольщиков в составе комсомольца Ю. Соболевского и И. Немирского, работавшего в глубокской типографии.

Группа Щеглова раздобыла шрифты, бумагу, краски, и вскоре партизанская типография приступила к работе. Глубокские подпольщики изготовили для партизан печати, доставали чистые бланки документов, организовывали побеги военнопленных из лагеря. Подпольщики распространяли листовки, срывали поставки продовольствия в Германию, проводили агитационно-массовую работу среди населения, добывали медикаменты.


Штаб 4-й Белорусской партизанской бригады 30 мая 1944 г.

Удостоверение

Предъявитель сего Манцевич Александра Михайловна действительно состоит на службе в 4-й Белорусской партизанской бригаде в должности агентурного работника штаба бригады.

Что и удостоверяется подписями и приложением печати.

Командир бригады политрук (Бойак) Комиссар Ст. лейтенант (Расюк)

Начальник штаба Ст. лейтенант (Шарипов)

Пасведчанне А. М. Манцэвіч

В апреле 1944 г. более 50 человек из отряда «Москва» со своим оружием влились в состав 4-й Белорусской партизанской бригады. Я продолжала руководить оставшимися в подполье людьми до соединения с войсками Красной Армии.

Многие патриоты погибли смертью храбрых в подполье и на фронте. Среди них — Алексей Милун, Павел Счастный, Степан Матюк, Юзя Шубина. Дмитрий Борок, член подпольного комитета комсомола, погиб 9 мая 1945 г. в районе Берлина. Орденом Ленина посмертно награжден Никанор Пахирко, погибший на фронте в 1945 г. Не дождались победы Иосиф Счастный, Николай Сушко, Петр Адамович, Петр Муха, Иван Сковородко, Филипп Лаптенок.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 478—480.*

## На чале моладзі

### З успамінаў А. Ю. Міхасёнка, сакратара Міёрскага падпольнага райкама камсамола

В феврале 1943 г. Вилейским обкомом КП(б)Б и ЦК ЛКСМБ я был направлен в тыл врага для руководства работой подпольных комсомольских организаций в Миорском районе. Позже был назначен комиссаром отряда № 3 партизанской бригады имени Калинина. После ухода в подполье мои родители и две сестры были расстреляны фашистами, а все наше хозяйство разграблено.

По прибытии на Миорщину я встретился с комсомольцем Авсеем Вальштейном, который познакомил меня с комсомольцами и другими советскими патриотами, проживающими на территории района. Позже Вальштейн стал разведчиком 4-й Белорусской партизанской бригады и комсоргом отряда № 6.

Выполняя указания уполномоченного ЦК ЛКСМБ, я в первую очередь занялся организацией небольших патриотических групп. В каждую группу входило

3–4 человека. Они проводили диверсионную и разведывательную работу.

Первая группа была создана в гарнизоне Миоры. Ее возглавила энергичная комсомолка Ирина Горбатенко. В группу входили ее сестра Мария и шестнадцатилетний Георгий Манцевич. Деятельность подпольщиков была разнообразной.

Весной 1943 г. Горбатенко в срочном донесении сообщила, что из Миор в Дисну выезжает обоз полиции. Партизаны отряда «Октябрь» устроили в деревне Крюки засаду. Обоз был разгромлен, захвачены трофеи.

Группа Горбатенко вела большую работу по разложению гарнизона. Это принесло ощутимые результаты. 11 военнопленных, работавших в немецких частях, при помощи подпольщиков перешли в бригаду имени Калинина, где я в ту пору был комиссаром отряда.

Значительную диверсионно-разведывательную работу вели патриотические группы, которые возглавляли Ефим Савельевич Пучков (д. Деверки Миорского р-на), Иван Федорович и Иван Васильевич Лакотко (д. Татары Миорского р-на), Антонина Флоровна Манцевич (д. Черессы). Эти группы были закреплены за гарнизонами Дисна, Друя, Дрисса, Глубокое для ведения там разведки. Они изучали положение в указанных гарнизонах и информировали об этом райком и командование бригад.

Подпольные антифашистские группы Миорского района уничтожили телефонную связь между гарнизонами Миоры — Дисна и Миоры — Шарковщина. Сожгли и уничтожили до двух десятков мостов, разобрали несколько сот метров железнодорожного полотна на дороге Миоры — Шарковщина. Собирали у населения и передавали партизанам винтовки, боеприпасы, гранаты.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 490–492.*

## У ролі сувязной і разведчыцы

### З успамінаў Г. В. Качан (Рымдзёнак), члена падпольнай камсамольскай арганізацыі Мікалаёўскага сельсавета

В августе 1941 г. мы создали подпольную комсомольскую организацию. Кроме меня и моей сестры Риты в нее вошли Андрей Еленский с 16-летним братом Костей из д. Луговцы, Мария Лисовская из местечка Луначарска, Тихон Федорец из д. Федорцы, Христофор Федорец, Максим, Виталий, Петр, Иосиф, Анна Мядельцы из д. Шараги, Люба, Иван, Елена, Мелетий Свяцкие из д. Денисово, Валя и Зоя Череп из д. Бушево и др.

Некоторое время я была секретарем подпольной комсомольской организации Николаевского сельсовета. Позже секретарем стал Андрей Еленский. Начали собирать оружие и прятать его в лесу близ деревни Николаевка.

К весне 1942 г. нас, подпольщиков, вместе с бывшими военнослужащими насчитывалось уже около сотни человек. Мы намеревались создать партизанский отряд под командованием командира Красной Армии Ивана Федоровича Дубкова, который бежал из фашистского плена. Однако вскоре были арестованы Андрей Еленский, Тихон Федорец и другие подпольщики. Еленского и Федорца зверски пытали, а потом расстреляли. Меня арестовывали



Г. В. Рымдзёнак

дважды. Во второй раз я уже не рассчитывала остаться в живых и при аресте повязала красную косынку, которая напоминала красный флаг. Я вернулась домой вся избитая. Здесь узнала печальную весть: Дубков успел вывести ребят в лес, но там его убил предатель.

Весной 1943 г. я стала связной партизанского отряда «Октябрь». Когда отряд ушел в Плисский район, а в Дисненский прибыла 4-я Белорусская партизанская бригада, я стала ее связной, а затем разведчицей. Наши комсомольцы помогали партизанам оружием и боеприпасами. Одни из них остались работать в подполье, другие, как Костя Еленский, Иван Свяцкий, Тамара Шкеленок, Владимир Лимоновский, ушли в партизаны.

Я жила дома, в д. Бушево, в трех километрах от Дисны, и работала на партизан. Ходила в Дисну, Полоцк, Борковичи и приносила необходимые сведения. Сообщала в бригаду, где находятся фашистские сторожевые посты.

В другой раз средь бела дня была сожжена мельница в Дисне. Для проведения этой операции командир отряда И. Ф. Бuваленко направил пятерых партизан. Четверо из них с оружием спрятались в возу с соломой, а пятый, переодетый в женскую одежду, сел на воз и благополучно проехал сквозь вражеские посты. Около мельницы он развернул воз. Здесь партизаны сняли постового, перенесли солому на мельницу и подожгли ее.

Мне было поручено держать связь с Марией Лисовской, работавшей кухаркой в луначарской полиции. Я получала от нее нужные сведения и передавала их Люде, Мелетию или Елене Свяцким, а те — в бригаду. Помогал мне мой шурин Василий Каминский.

Однажды Марию арестовали. Меня тоже чуть не поймали в городе гитлеровцы, однако чудом удалось ускользнуть от них.

Я пришла на явочную квартиру в Дисне к Зинаиде Стомме, отец которой был расстрелян гитлеровцами. На этой квартире я обычно встречалась с Марией Лисовской. Место было удобное для встреч, так как дом находился возле базара. На этот раз в квартире было много людей. Вдруг зашла Мария и говорит: «Спасайся, за мной следят...» Я быстро направилась к выходу, но у калитки меня остановил полицай. Я сказала, что принесла на базар яйца, и показала корзину. Полицейский меня отпустил. Но по базару рыскали другие полицаи. Мне с трудом удалось выбраться из Дисны. Часа через два я уже была в отряде.

Я стала выполнять задания партизанского командования по разведке.

В мае 1944 г. гитлеровцы повели против партизан карательную экспедицию с артиллерией и самолетами. Удержать позиции было нельзя, пришлось отступить в глубину леса, на болото. Связь с Москвой прервалась. Пробовали прорваться, но каратели окружили нас плотным кольцом. Когда гитлеровцы вплотную подошли к моей замаскированной позиции, я пыталась подорваться на гранате, но она не взорвалась. Меня схватили. Я объяснила, что гранату нашла тут же, в яме. Спас документ, выданный партизанами на другую фамилию, когда я ходила в разведку. Поскольку в лесу скрывалось и гражданское население, меня вместе с другими отправили в лагерь. Кочевала я по различным лагерям, несколько раз совершала побеги, но снова попадала в руки немцев. Освободили нас 5 мая 1945 г. Вскоре я возвратилась на Родину.

*Люди нарочанского края: Воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. Мн., 1975. С. 495—498.*

# ВЫЗВАЛЕННЕ РАЁНА

Вызваленне на Міёршчыну прынеслі войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту ў ходзе першага этапу аперацыі «Баграціён». У напрамку Дзісны наступалі часці 6-й гвардзейскай арміі, 154-я стралковая дывізія, 44-я мотастралковая брыгада і 159-я танкавая брыгада фронту.

...30 чэрвеня 1944 г. танкісты 159-й танкавай брыгады і мотастралковы батальён 44-й мотастралковай брыгады пад камандаваннем маёра Лосева пачалі бой за горад. З ходу праз мост удалося праскочыць толькі танку малодшага лейтэнанта Баранава. Пасля гэтага гітлераўцы ўзарвалі мост. Тады танкісты фарсіравалі р. Дзісну ля в. Восцевічы і ўварваліся ў горад з поўдня, прабраліся да моста праз Заходнюю Дзвіну і адкрылі агонь па супрацьлеглым беразе. Чацвёра сутак працягваўся бой, але ўсе спробы гітлераўцаў выбіць танкістаў і мотастралкоў поспеху не мелі. Без сну і гарачай ежы, у акружэнні змагаліся воіны да падыходу 154-й стралковай дывізіі, якая 3 ліпеня пры падтрымцы артылерыі з ходу ўступіла ў бой. Да раніцы наступнага дня Дзісна была поўнасцю ачышчана ад акупантаў.

У баях за горад асабліва вызначыўся камандзір першай танкавай роты 159-й




Схема баявых дзеянняў 34-й асобнай гвардзейскай танкавай Чырванасцяжнай брыгады з 5 па 8 ліпеня 1944 г. Назвы населеных пунктаў даюцца, як у арыгінале



Я. Я. Вербаў



Герой Савецкага Саюза В. А. Бабічаў

Полацкай танкавай брыгады старшы лейтэнант М. А. Кузьмін. А ўсё пачалося з таго, што яго баявая машына пры пераправе праз раку Дзісна ўброд наехала на вялікі падводны камень днішчам і стала нерухомай мішэнню. Як ні стараўся механік-вадзіцель старшы сяржант В. Зубараў зрушыць яго, уключаючы розныя перадачы, гусеніцы да грунту не даставалі.

Старшы лейтэнант М. А. Кузьмін хутка ацаніў перавагу свайго становішча: з ракі, адкуль добра бачны горад, можна было наводзіць танкі на варожыя цэлі. І ён гэта выкарыстаў. Яго танк немцы неаднаразова імкнуліся расстраляць з гармат. А пасля таго як на другую ноч машына М. А. Кузьміна пасля некалькіх спроб усё ж была выратавана з рачнога палону, вада на тым месцы літаральна закіпела ад мінамётнага залпа. За гэты бой М. А. Кузьмін быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза (прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 г.).

У брацкай магіле ў Дзісне пахавана 270 воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі пры вызваленні горада і раёна.

У напрамку Міёраў наступала 9-я гвардзейская Чырванасцяжная дывізія пад камандаваннем палкоўніка Я. Я. Вербава. 26 чэрвеня, фарсіраваўшы Заходнюю Дзвіну ля Бешанковічаў, яна праз Ветрына выйшла на рубеж Жарсцвянка — Барташова (22-і гвардзейскі стралковы полк з дывізіёнам 28-га гвардзейскага стралковага палка). 18-ы гвардзейскі стралковы полк наступаў на Мураўшчыну, 31-ы — на ўсход.

Непасрэдна на Міёры часці 9-й гвардзейскай стралковай дывізіі пачалі наступленне 3 ліпеня ў 16 гадзін. Пры гэтым 18-ы гвардзейскі стралковы полк праз Атокі, Краснае, Наўгароды, Дворнае Сяло выйшаў у раён в. Свярдлы. У ноч на 4 ліпеня ён замяніў падраздзяленні 517-га стралковага палка 166-й стралковай дывізіі на рубяжы Слаўшчызна — Масеўцы — Міснікі.

31-ы гвардзейскі стралковы полк наступаў праз Наўгароды да Дворнага Сяла. 22-і полк накіроўваўся за ім.

Штаб дывізіі знаходзіўся ў в. Канахі.

Раніцай 4 ліпеня 18-ы полк нанёс удар адным батальёнам у міжазёрным дэфіле з поўдня на Міёры, другім — ад Кацілава ўздоўж чыгункі на Наталіна і трэцім — у абход з захаду праз Любінова, Камянполле, Марцінаўцы, Гізуны. Не затрымліваючыся ў Міёрах, да канца дня полк выйшаў на рубеж Захарні — Гір'яты.

31-ы полк вёў баі з дробнымі групамі праціўніка на поўнач ад Загор'я.

У баі за Міёры было ўзята ў палон каля ста салдат і афіцэраў праціўніка, захоплены склад са збожжам, 12 гармат, 6 мінамётаў і 18 кулямётаў, матацыкл, легкавы аўтамабіль, бронемашына, іншая маёмасць. Праціўнік тут страціў да трохсот салдат і афіцэраў. А жалобнай памяццю аб радасных днях вызвалення назаўсёды засталася на цэнтральнай плошчы райцэнтра брацкая магіла, у якой пахаваны 223 савецкія воіны і партызаны.

## СА СПРАВАЗДАЧЫ АКРУГОВАГА КАМІСАРА ПАЎЛЯ ГАХМАНА ГЕНЕРАЛЬНАМУ КАМІСАРУ БЕЛАРУСІ ПРА ЭВАКУАЦЫЮ З ГЛЫБОЦКАЙ АКРУГІ

**9 жніўня 1944 г.**
**г. Бітліц (Верхняя Сілезія)**

28 июня 1944 г. в 4.00 я получил радиограмму, в которой предписывалось начать эвакуацию из округа по согласованию с армией...

28 июня 1944 г. в 8.00 ответственные руководители всех предприятий и немецких учреждений в Глубоком были созваны на совещание в окружной комиссариат. На основании плана эвакуации они были ознакомлены с намеченными мероприятиями. Сводка вермахта и разговор с командиром 391-й охранной дивизии генерал-лейтенантом фон Монтетон давали основание полагать, что составленный план эвакуации может быть осуществлен только по отдельным пунктам. Так, например, предусмотренный планом срок эвакуации 14 дней в связи со сложившейся военной обстановкой едва ли можно было выдержать. Поэтому с самого начала необходимо было намного сократить срок осуществления эвакуации. Руководителям немецких предприятий и учреждений, а также районным сельскохозяйственным руководителям был отдан приказ немедленно начать эвакуацию.

В конце совещания с руководителями немецких предприятий и учреждений был обсужден самый важный и срочный вопрос транспортных средств. Рассчитывать на транспортные средства дорожно-транспортной колонны не приходилось, так как эти транспортные средства полностью были забраны в распоряжение 3-й танковой армии. В распоряжении гражданского управления всего лишь имелось незначительное количество автомашин, так что полностью пришлось рассчитывать на железнодорожный транспорт. Однако по телефону нельзя было связаться с военно-хозяйственной командой в Минске. Непосредственные переговоры с начальником станции в Глубоком оказались безуспешными, так как 3-я танковая армия взяла для собственных целей весь подвижный железнодорожный парк. В это время комендант окружной полиции в Глубоком получил радиограмму от начальника СС и полиции Белоруссии, которой предписывалось собрать все полицейские силы округа и маршевым порядком направить в Молодечно. Так как времени на подготовку к эвакуации не оставалось, то пришлось немедленно приступить к эвакуации. Заместитель коменданта окружной полиции на основании полученного приказа заявил, что после приступления к эвакуации он отведет все полицейские силы из округа в указанное ему место. В ходе длительных переговоров было договорено, что отвод полицейских сил из округов будет затягиваться до тех пор, пока все трудоспособное население и скот из района вместе с постами жандармерии и местной полиции не будут доставлены в Глубокое или в другой указанный пункт. После этого силы коменданта окружной полиции возьмут их под охрану от нападения бандитов на этот обоз.

С самого начала можно было предполагать, что указанный Вами в качестве пункта сбора район Молодечно в связи с бандитской обстановкой и начавшимся отступлением немецких войск можно будет достигнуть только с величайшими трудностями, не говоря уже о том, что движущийся на Молодечно обоз сильно затруднит передвижение войск. В 5.30 утра 29 июня состоялось совещание с обер-квартирмейстером 3-й танковой армии и командиром 391-й охранной дивизии. На совещании выяснилось, что положение на фронте для нас сложилось крайне неблагоприятное, если не критическое, которое с каждым часом все больше осложнялось, так как противник на центральном участке фронта, и в особенности в районе северо-восточнее и восточнее Глубокого, совершил прорывы фронта в нескольких местах. Около 10.00 в Глубокое поступила радиограмма, согласно которой окружной комиссариат должен быть эвакуирован в г. Лиду. С этого времени радиосвязи с Минском, а еще с 9.00 с Вилейкой не было. Силой собственной власти, во изменение пункта 2 радиограммы № 847/44, был отдан приказ, чтобы все районные сельскохозяйственные руководители весь собранный скот и лошадей гнали в направлении на запад через Глубокое — Воропаево — Поставы в Латвию или через Динабург и сдали под квитанцию ближайшему окружному сельскохозяйственному руководителю. На запад были направлены также все немецкие и местные учреждения, а также трудоспособное население.

В это время началось бегство части местного населения из Глубокого и районных центров. Многочисленные отступающие колонны вермахта проходили через Глубокое в западном направлении. Местный персонал окружного комиссариата самовольно покинул работу, так что заготовленные приказы на марш удалось вручить только в единичных

случаях. Отданный коменданту окружной полиции приказ об эвакуации полиции вместе с местной полицией и самообороной и родственниками явился большой помехой для организованной эвакуации, которую планировалось осуществить при любых обстоятельствах. Так как к этому времени местные полицейские со своими родственниками и добром подготовились к эвакуации, то местное население узнало о предстоящей эвакуации и вместе со всеми пожитками и скотом сбежало в лес, избежав тем самым всякого угона и мобилизации со стороны немецких гражданских учреждений. И БКО (Белорусская краевая оборона) по многим наблюдениям окружного комиссариата в большинстве оказалась ненадежной. Во время эвакуации большинство служащих БКО, захватив оружие и боеприпасы и спасаясь от эвакуации на запад, убежало в леса и, по всей вероятности, присоединилось к бандитам. Окружной уполномоченный БЦР (Белорусская центральная рада) во время эвакуации не находился в Глубоком. Насколько известно, он находился в Минске. Учитывая такое обстоятельство, вообще нельзя было рассчитывать на активные действия в целях успокоения населения со стороны БЦР. Командующий БКО Глубокского округа стал совсем беспомощным и присоединился к отступающей полиции. Тем самым районные сельскохозяйственные руководители были лишены всякой возможности согнать в отступающий обоз домашний скот и местную рабочую силу. А поэтому удалось только в основном эвакуировать крупный рогатый скот государственных имений и работающих в немецких учреждениях лиц с их добром. Только незначительная часть остального населения добровольно присоединилась к эвакуируемым обозам, которые организовывались районными сельскохозяйственными руководителями... Крупный рогатый скот из Миорского и Дисненского районов вследствие быстрого отступления полицейских сил не был угнан. Крупный рогатый скот из Браславского района, напротив, был угнан в Динабург...

Гахман, окружной комиссар

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Спр. 943. Л. 121—133.*

## Гісторыя аднаго дня

### З дзённіка І. А. Лапіцкага

31 мая 1944 года — адзін з самых жудасных дзён вайны, які давялося перажыць жыхарам партызанскай зоны на Дзісеншчыне. Раніцай немцы пачалі буйную карную экспедыцыю супраць партызан з удзелам паветраных сіл і сабак. Наступленне пачалося з усіх бакоў адначасова. Партызаны, узятыя ў кальцо, вымушаны былі адыходзіць у лясы. Разам ратаваліся і некаторыя жыхары нашага Мікалаёва. З цяжкасцямі дабраліся мы да дома Судніка ў Слабадзе.

Сядзіба Судніка была ў ціхім месцы, тут вырашылі затрымацца. Карнікі пераправіліся на наш бераг, злучыліся з часцямі, наступаючымі ад Дзісны, з'явіліся ў Слабадзе. Пачуліся блізкія ўзрывы і стрэлы, недалёка ўсчаўся пажар. Намі авалодаў страх. Жонка і дзеці, абняўшыся, стаялі ля вакна. Хутка ўбачылі, як у двары з'явіліся ўзброеныя да зубоў карнікі. Гэта была латышская паліцыя і гестапаўцы. Мы пачулі: «Выходзіць усім!» Усе выйшлі, выпаўз і я. Латыш прыставіў карабін мне ў грудзі і зароў: «Бандыт, уставай!» Я тройчы паспрабаваў устаць і тройчы валіўся на зямлю. Пераканаўшыся ў маім калецтве, фашыст накіраваў карабін на сына: «Юда! Жыд!»

Мужчын і падлеткаў карнікі паставілі ў садзе пад дрэвам. «Расстрэльваць будуць!» — выгукнуў нехта. У гэты час іншыя карнікі з кулямёта стралялі ў бок Антонава, адкуль адстрэльваліся партызаны.

Страляніна з боку Антонава ўзмацнілася, і карнікі вымушаны былі адступіць да ручая, куды сагналі ўсіх затрыманых мужчын і жанчын. У двары Судніка засталіся толькі я і латыш, якому захацелася мёду з вулляў. Але хутка пчолы прымусілі яго ўцякаць, нават выхапленую рамку з мёдам кінуў. Прыйшлося і мне ратавацца ад пчол, паўзці да ручая. Памятаю, скаціўся да вады, змачыў рукой галаву і страціў прытомнасць.

...Толькі позна вечарам вярнуліся жонка з дачкой, адпушчаныя «да асобага распараджэння». Сына пагналі разам з усімі захопленымі мужчынамі.

Мужчын з партызанскай зоны зганялі ў лагеры Дзісны і Дрысы, адкуль многіх вывозілі ў Германію. Адрыяна ўдалося выратаваць толькі цудам. Дзісенскія жандармы ад аднаго прозвішча Лапіцкі шалелі — бандыт. Усё ж дзякуючы жандарму «Астэ» (яго называлі па мянушцы сабакі), які ведаў Ію і добра аб ёй адгукаўся, перакладчыцы Лідзе Сініцы ўдалося атрымаць для Адрыяна накіраванне да ўрача для пацвярджэння наяўнасці туберкулёзу.

У канцы мая ў Мікалаёве пасяліліся нямецкія сапёры, пачалося будаўніцтва моста праз раку. У садзе размясціўся гарадок з палатак. Стук і гоман не змаўкалі ні днём, ні ноччу. Сярод сапёраў было шмат аўстрыйцаў і чэхаў, людзей добрых. Памятаю юнака 18 гадоў, аўстрыйца. Яго я вучыў рускай мове, ён расказваў пра Аўстрыю. Мост ужо заканчвалі, калі гэты аўстрыец прыбег і па сакрэту паведаміў, што савецкія танкі ўжо ля Лужкоў, што ноччу іх атрад пакідае Мікалаёва. Раніцай у двары засталося толькі некалькі грузавых машын ды некалькі салдат, гатовых да ад'езду. За ракой у Галомысле былі ўжо савецкія танкі.

Мы схаваліся ў склепе, дзе знаходзіліся суседзі Атміновічы, Койры, Пачопкі і інш. Немцы ўвесь час сачылі за рухам войск у Галомысле. Калі адзін танк наблізіўся да ракі, яны ўскочылі ў машыну і хутка паімчалі. Па іх некалькі разоў выстралілі з гарматы.

...На трэці дзень у Мікалаёва ўступілі савецкія войскі. У Слабадзе праз брод днём і ноччу яны рухаліся больш тыдня. Немцы бамбілі пераправу і дарогу на Баслакі, палалі пажары. Мы хаваліся ў бліндажы.

Калі рух войск спыніўся, жыццё пачало ўладкоўвацца. Аб'явілі прызыў у армію і на работу.

## Воінскія часці Савецкай Арміі, якія вызвалялі Дзісенскі і Міёрскі раёны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**9-я гвардзейская Чырванасцяжная стралковая дывізія.** Наступала ад Лужкоў праз Ручай (Шаркоўшчынскі р-н), Дворнае Сяло і Свярдлы на Міёры, Пераброддзе і далей у бок Браслава. Камандзір дывізіі гвардыі палкоўнік Я. Я. Вербаў.

**34-я гвардзейская асобная танкавая Віцебская Чырванасцяжная ордэна Суворава брыгада.** З баямі прайшла па тэрыторыі Дзісенскага і Міёрскага раёнаў з 1 па 8 ліпеня праз паселеныя пункты Шпакоўшчына, Копцева, Малькавічы, Дзянісава, Дзямешкі, Страпшчызна, Басяныя, Сілава, Пятрэлева, Мальцы, Рабечын, Папкі, Павяцце, Тычкі, Ідолта, Пустынкі, Каменка, узаемадзейнічаючы з падраздзяленнямі 29-й стралковай дывізіі. Загадам № 019/Н ад 7 ліпеня 1944 г. адзначана, што ордэнам Чырвонай Зоркі ўзнагароджана 13 байцоў і афіцэраў, медалямі «За адвагу» — 12, «За баявыя заслугі» — 12. Камандзір брыгады гвардыі палкоўнік С. П. Садоўскі.

**29-я стралковая Полацкая ордэна Суворава дывізія.** Сканцэнтравалася ля Мётлаў, Мазурына, Улісіна 2 ліпеня 1944 г. Затым наступленне на Слабаду Мікалаёўскую, Дзянісава, Гараўцы, Відокі, Новыя Крукі, Басяныя, баі ля Сілава, Ільмовікаў, Папкоў, Урбанава, Мілашова, Тычкаў. У ноч на 6 ліпеня пачаўся чарговы этап наступлення — на Друю.

**154-я стралковая дывізія.** У першыя дні ліпеня 1944 г. разам са 159-й танкавай брыгадай вызваляла Дзісну, потым наступала на Якубаўшчыну, Палякі, Загор'е, Рыбачкі, Мілашова. Камандзір дывізіі палкоўнік Сачылаў.

**270-я стралковая Дзямідаўская Чырванасцяжная дывізія.** За перыяд з 30 чэрвеня па 15 ліпеня 1944 г. прайшла з баямі тэрыторыю Дзісенскага і Міёрскага раёнаў праз населеныя пункты Шыманшчына, Сазоны, Копцева, Казачкі, Мётлы, фарсіравала р. Дзісна ў Слабадзе ля Мікалаёва, далей рухалася праз Дзянісава, Навінцы, Дзямешкі, Кісялі, Курашы, Супорнікі, Лінаціна, Брыжынкі, Вінагроды, Узмёны, Слабаду, Лявонпаль, Паташню і далей у бок Браслава. Гэтая дывізія фарсіравала Дзвіну і вызваліла Дрысу. Камандзір дывізіі генерал-маёр І. П. Бяляеў.

**159-я танкавая Полацкая ордэна Леніна Чырванасцяжная ордэнаў Суворава і Кутузава брыгада.** Удзельнічала ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Дзісенскага і Міёрскага раёнаў з 30 чэрвеня па 7 ліпеня 1944 г. Вызваляла Дзісну, затым наступала праз Германавічы, Новы Пагост, Аўсянку, Галубоўшчыну. Камандзір брыгады гвардыі палкоўнік І. А. Фёдараў.

**71-я гвардзейская стралковая дывізія.** Рухалася ад Полацка па левым беразе Заходняй Дзвіны, імкнучыся не дапусціць фарсіравання ракі ворагам. Падраздзяленні дывізіі займалі абарону на берагах Заходняй Дзвіны ад Лонкі, Дзісны да Пякоціна, Панізова, Пераслоўкі, Дрыгуч, удзельнічалі ў жорсткіх баях за вышыню 135,9 у ваколіцах в. Слабада разам з часцямі 270-й стралковай дывізіі.

**166-я стралковая Чырванасцяжная дывізія.** З 1 па 3 ліпеня 1944 г. з баямі прайшла па тэрыторыі Міёрскага раёна праз вёскі Стары і Новы Пагост, Барсучына, Пальчахі, Мацюкі, Масеўцы, Міснікі, Пад'ельцы, Кацілава. Потым пазіцыі пад Міёрамі былі перададзены падраздзяленням 9-й гвардзейскай дывізіі, а 166-я стралковая дывізія працягвала наступленне ад Новага Пагоста на Іоды. Камандзір дывізіі генерал-маёр А. І. Светлякоў.

## Дакументы сведчаць

### З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 9-Й ГВАРДЗЕЙСКАЙ ЧЫРВАНАСЦЯЖНАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

**Ліпень 1944 г.**

**§ 1**

...2 июля в 5.00 дивизия выступила на марш, двигаясь по маршруту: Науменки, Блошники, Сквирце, Новое Село, Казачки, м. Лужки, Лопуново. С подходом частей к м. Лужки дивизия получила приказ окружить и уничтожить противника в лесах сев. м. Лужки. По данным штаба 2-го Гв. СК, в лесу сев. м. Лужки находился 5-й латышский полицейский полк в полном составе. Во исполнение приказа командира 2-го Гв. СК дивизия приняла боевой порядок и приступила к прочесыванию леса...

31-й Гв. СП (вышедший из резерва командира 2-го Гв. СК) с рубежа Лапуново обошел лес с запада и, достигнув Красной Горы, начал наступать на восток. Утром 3.07.44 г. части начали совершать марш, двигаясь по маршруту: м. Лужки, Германовичи, Вельке Село, Боярщина, Ручай, в районе Ручай был сделан большой привал. Во время большого привала дивизия получила данные о том, что 5-й латышский полицейский полк удерживает м. Мёры.

## § 2

### Бой за м. Мёры

1. Задача дивизии: совершить марш и к исходу дня 3.07.44 г. сосредоточиться в районе Свердлы, Дворное Село. В ночь на 4.07.44 г. сменить части 166-й СД на рубеже: Славщизна, Масевцы, Мисники. С утра 4 июля перейти в наступление, выбить противника из м. Мёры и в дальнейшем наступать в сев.-зап. направлении, выйти на рубеж Друя.

2. Решение командира дивизии: главными силами обойти озера Мёрское, Осиновка, оз. Воронь с востока и с запада, небольшими отрядами наступать в межозерном дефиле на м. Мёры с юга, окружить и уничтожить противника в м. Мёры.

3. Описание действий: дивизия из района большого привала в 16.00 3 июля выступила в направлении м. Мёры...

Увязав все вопросы взаимодействия внутри своих и со средствами усиления, части дивизии с утра 4.07 перешли в наступление. Боевой порядок дивизии — два полка в линию, один в резерве командира дивизии.

18-й Гв. СП с исходного положения на рубеже Славщизна, безымян. выс. южн. Масевцы, Мисники наносил удар одним батальоном в межозерном дефиле с юга на м. Мёры и одним батальоном наносил удар в обход в направлении Масевцы, Блошки.

31-й Гв. СП одним батальоном с рубежа безымян. выс. южн. Кацилово наносил удар вдоль железной дороги на Кацилово, Наталино и одним батальоном наступал обходом с запада в направлении: Любиново, Каменполье, Марциновцы, Гизуны. В результате применения обходных маневров, сочетая таковые с фронтальными ударами, дивизия успешно разгромила гарнизоны противника, оборонявшиеся на подступах к м. Мёры в населенных пунктах Масевцы, Мацюки, Мерске, Мисники, Кацилово, и, наращивая удар, стремительной атакой 18-го Гв. СП с юга и сев.-востока овладела м. Мёры. Не задерживаясь, части дивизии, продолжая вести наступательный бой, вошли сев. м. Мёры, овладев д. Блошки, Наталино, Гизуны, Жуки. Приведя в порядок личный состав и подтянув артиллерию, части продолжали наступление и к вечеру 4.7 вышли на рубеж: 18-й Гв. СП — Захарне — Гирьяты, 31-й Гв. СП втянулся в лес сев. Загоже, где бой вел с мелкими группами противника. В ходе боя за м. Мёры было взято в плен около 100 солдат и офицеров противника. Остатки разгромленного 5-го латышского полицейского полка беспорядочно группами рассеялись в лесах, которые позже вылавливались нашими подразделениями.

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1066. Воп. 1. Спр. 4. С. 243—245.*

## З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ 9-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

*Боевое донесение № 0128/оп. Штадив 9. Конахи. 4.07.44 г. к 2.00. Серия «1».*

1. Противник под ударами частей дивизии выбит из населенных пунктов на подступах к м. Мёры и остатки разбитых подразделений 5-го латышского полка, обороняющего м. Мёры, отошли в сев. направлении Вильново, Гирьяты; незначительное огневое сопротивление продолжает оказывать из леса сев. Загоже.

2. 9-я Гв. СКД обходным маневром справа — 18 й Гв. СП и слева 31-й Гв. СП выбили обороняющиеся подразделения 5-го латышского полка из населенных пунктов: Мацюки, Мисники, м. Мёры, Блажки, Наталино, Загоже, продолжает вести бой по очистке лесов от противника сев. Загоже.

*Даведка аб стратах і трафеях часцей 9-й Гв. СКД за перыяд 4 ліпеня 1944 г.*

1. Потери частей дивизии: убито 14 (по неуточненным данным), ранено 167 человек.

2. Трофеи: орудий разного калибра — 12, минометов — 6, пулеметов — 18, мотоциклов — 1, бронеавтомобилей — 1 (подбитый), автомашина легковая — 1 (подбита), снарядов — 300 шт., мин — 1000 шт., складов с зерном — 2, скота разного — 100 голов.

3. Уничтожено до 250 солдат и офицеров.

4. Взято пленных 61, из них 2 офицера.

Начальник штаба 9-й Гв. СКД
гвардии подполковник Калугин

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1066. Воп. 1. Спр. 33. С. 133—136.*

## З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ 159-й ТАНКАВАЙ БРЫГАДЫ

*Боевое донесение № 011. Штабриг 159. Кустарник 1 км южнее Метлы. 1.07.44.*

Противник, подбрасывая свои резервы из района Гвозды, Зельки, стремится овладеть г. Дисна, тем самым освободить дорогу, идущую через Дисну на юго-запад и северо-запад, через переправу в северной части Дисны.

В течение ночи противнику удалось подбросить в город до 180 автоматчиков и подтянуть артиллерию на противоположный берег. С утра 1.07.44 противник 3 раза переходил в контратаку, стараясь выбить моих автоматчиков из города. Автоматчики противника скрываются в подвалах и на чердаках каменных зданий.

Противник за 30.06 и 1.07.44 понес боевые потери в живой силе до 600 человек убитыми.

К 16.00 1.07.44 мои потери: сгорело танков 5, подбито — 3, застряло — 5. Из них: Ушачи — 2, Дисна — 2, Двина — 1.

Вышло из ремонта и направлено в район Лужки — 3, в ремонте — 5, следуют из ремонта — 4, выполняли боевую задачу — 40.

Командир 159-й ТКБР гвардии полковник Федоров
Начальник штаба Зайцев

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 3225. Воп. 1. Спр. 12. С. 10—12.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 29-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

2.07.44. Совершив марш по маршруту Навлицы, м. Ветрино, Быковщина, Шпаковщина, Метлы, Дисна, к 13.00 2.07.44 сосредоточились в районах Метлы, Мазурино, Улисно. 302-й СП ведет бой за г. Дисну.

3.07.44. Части дивизии, преследуя отходящие части противника по маршруту Метлы, Слобода Миколаёвска, Денисово, Горавце, Видоки, Круки Нове, Босины, достигли рубежа Дыеминово (возможно, Долгиново) — Ильмовики — Мальце — Чернувце — Силово и отбивают контратаки противника из направления: Дрисса, Леонполь. Контратаки противника успешно отбиты. Противник потерял до 450 человек убитыми и ранеными, 20 повозок с грузом, 25 лошадей, 2 радиостанции, отошел на исходное положение.

Захватили трофеи: пушек — 18, пленных — 15, повозок — 65, лошадей — 40, телефонных аппаратов — 20, 15 т гвоздей, 1 мотоцикл, 2 пантона, 500 болтов и скоб, 200 $м^3$ лесоматериала. В течение дня освобождено 88 населенных пунктов и 150 000 мирного населения.

Уничтожен: саперный батальон 132-й ПД противника и один артиллерийский полк с материальной частью, обозом и штабом.

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 29. Воп. 1. Спр. 5. С. 26—29.*

## З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ 154-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

*Боевое донесение № 001174. Штадив 154. Поляки-Вельке. 5.07.44. 15.00.*

1. Дивизия после совершения марша к 7.00 5.07.44 сосредоточилась в районах: 437-й СП — лес вост. Загоже, 473-й СП — лес юго-зап. Поляки-Вельке, 570-й СП — после освобождения м. Дисна удерживает рубеж сев.-зап. и сев. окраины м. Дисна и далее по берегу р. Зап. Двина до Заборце, 571-й АП — лес севернее Якубовщины.
2. Боеприпасы и продовольствие подвозятся.
3. Потери дивизии за время боя за м. Дисна: убито — 25, ранено — 83 человека. Потери противника — до 130 солдат и офицеров убитыми и ранеными, пленных — 3.
4. Решили: к исходу дня 5.07.44 дивизию сосредоточить в районе Рыбачки, Подгурка, Милашево.

Командир 154-й СД полковник Сочилов
Начальник штаба полковник Гордеев

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1385. Воп. 1. Спр. 17. С. 92.*

### З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ 166-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

*Боевое донесение 0142. Штадив 166. Церешки. 1.07.44.*

Части дивизии, совершив марш и переправившись через р. Дисна в м. Германовичи и Великое Село, достигли к 18.00 1.07.44 рубежа Зеленка, Руда и вышли в соприкосновение на рубеже Погост Старый с противником. На этом рубеже разведкой установлена группа противника: пехота на пяти автомашинах и 3 шт. минометов 81 мм. В 19.00 51-й СП вел огневой бой и перешел в наступление, нанося главный удар с флангов с задачей окружить и уничтожить противника в районе Погост Старый. К 20.40 1.07.44 полк овладел Погостом Старым и продолжает дальнейшее наступление.

Начальник штаба Попов
Начальник оперотделения 166-й СКД
гвардии подполковник Шпаковский

*Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1406. Воп. 1. Спр. 12. С. 2—9.*

### ПА СТАРОНКАХ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ «БАЛЬШАВІЦКАЯ ТРЫБУНА»

**27 снежня 1944 г.**

## Пісьмо на фронт

Пасля сходу сяляне вёскі Гір'яты Чэраскага сельсавета актыўна разгарнулі збор навагодніх падарункаў воінам-франтавікам.

Сяляне пасылаюць на фронт хустачкі, шкарпэткі, сала, каўбасу, мёд. Адначасова многія разам з пасылкамі ўкладваюць пісьмы. Сяляне Мальневіч і Батура напісалі ў сваім пісьме воінам Чырвонай Арміі:

«Прывітанне вам, дарагія байцы і камандзіры Чырвонай Арміі. У сувязі з надыходам Новага года пасылаем вам наш сціплы падарунак і жадаем вам у 1945 годзе канчаткова разбіць фашысцкую гадзіну і ўзняць над Берлінам сцяг перамогі. Мы абавязуемся вас забяспечыць усім неабходным, каб хутчэй закончыць разгром фашызму».

**27 снежня 1944 г.**

## Камсамольцы-агітатары

Вялікую палітмасавую работу сярод насельніцтва праводзяць камсамольцы Перабродскага сельскага Савета. Камсамольцы карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам сярод сялян. Яны сістэматычна праводзяць сходы і гутаркі сярод насельніцтва. Адначасова агітатары праводзяць гутаркі аб падзеях на франтах Айчыннай вайны, аб выкананні дзяржаўных гаспадарчых планаў. У час лесанарыхтовак і лесавывазак камсамольцы выпусцілі спецыяльны нумар сценгазеты, дзе былі адлюстраваны лепшыя людзі, сістэматычна выконваючыя і перавыконваючыя нормы выпрацоўкі.

Пры камсамольскай арганізацыі створаны гурток несаюзнай моладзі па вывучэнню праграмы і статута ВЛКСМ. Асаблівай павагай у сялян карыстаецца камсамолка Юневіч Людміла. Яна штодзённа бывае на сваім участку і сістэматычна знаёміць насельніцтва з апошнімі навінамі.

*В. Сотнікаў, сакратар РК ЛКСМБ*

**27 снежня 1944 г.**

## Аднаўляецца калгаснае жыццё

Калгас «17 Верасня» Лявонпальскага сельсавета да вайны быў перадавым калгасам у раёне. Калгаснікі збіралі высокія ўраджаі, высокапрадукцыйныя жывёлагадоўчыя фермы былі гонарам калгаса і калгаснікаў.

Нямецкія захопнікі разбурылі калгасную гаспадарку. Яны разрабавалі калгаснае дабро, інвентар, знішчылі фермы і пасадзілі на тэрыторыі калгаса памешчыка, які зрабіў сялян батракамі. Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі калгаснікі актыўна ўзяліся за аднаўленне гаспадаркі. Зараз калгас мае ферму буйной рагатай жывёлы, авечкагадоўчую, свінагадоўчую, пчолапасеку. Праўленне калгаса (старшыня т. Панізнік) старанна клапоціцца аб хутчэйшым аднаўленні калгаснай гаспадаркі.

За кароткі час калгас мае да 15 тысяч даходу.

*Дрэдун*

## Землякі на франтах вайны

Нашы землякі змагаліся з ворагам не толькі ў падполлі і партызанскіх атрадах. Удзельнічаў у абароне Брэсцкай крэпасці А. А. Чувікаў, змагаўся пад Масквой І. А. Мацкевіч, ваяваў на Каўказе М. І. Латышаў, прайшлі агонь Сталінграда І. М. Каняхін і В. Дз. Панізнік, зведаў холад карэльскіх камянёў М. І. Комахаў, а пералічыць усіх удзельнікаў вызвалення Прыбалтыкі і краін Усходняй Еўропы проста немагчыма. Але ж сярод салдацкіх лёсаў ёсць зусім незвычайныя.

У. І. Міклушонак нарадзіўся ў в. Прорвы ў вялікай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Чэрасах, апрацоўваў зямлю ў Стэфанове, адсюль у 1939 г. пайшоў у польскую армію. Праслужыў толькі тыдзень, як пачалася вайна. 17 верасня, адступаючы з-пад Любліна, яго полк сустрэўся пад Львовам з Чырвонай Арміяй. Але да сям'і У. І. Міклушонак вярнуцца не паспеў: будаваў ваенныя аб'екты, дарогу, аэрадром. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён стаў байцом польскага корпуса, якім камандаваў генерал Андэрс.

Разам з Качаном з Пестуноў, Шокелем з Цілеўцаў, Ерамеевым з Мілеек, Якубам Мацюком з Мацюкоў і іншымі землякамі У. І. Міклушонак у складзе гэтага вайсковага злучэння праз Іран трапіў у Палесціну. Тут праходзіла ваенная вучоба, пасля якой Уладзімір Іванавіч стаў байцом разліку зенітнай гарматы.

Корпус Андэрса ўвайшоў у 8-ю англійскую армію, якая супрацьстаяла танкавым армадам гітлераўскага генерала Ромеля. Запомніліся У. І. Міклушонку баі ў Лівійскай пустыні, дзе салдаты гінулі не толькі ад куль і снарадаў. Страшнай была спёка, нясцерпнай — смага.

Сапраўднае пекла сустрэў корпус Андэрса пры штурме фашысцкай абарончай лініі ў Італіі па дарозе на Рым. Пад г. Монтэ-Касіна, дзе спыніліся канадскія, індыйскія, новазеландскія, французскія, амерыканскія і англійскія дывізіі, наперад пайшлі палякі, беларусы і ўкраінцы з падраздзяленняў Андэрса.



І. М. Каняхін



М. Ф. Латышаў



У. І. Міклушонак


За нашу Советскую Родину

СССР

★ УДОСТОВЕРЕНИЕ ★

За участие в героической обороне

СТАЛИНГРАДА

Панизник Виктор Дмитриевич

Указом ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР от 22 декабря 1942 г награжден медалью

«ЗА ОБОРОНУ СТАЛИНГРАДА»

★

От имени ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР медаль «За оборону Сталинграда» вручена 24 Августа 1943 г

Г № 34156

М. П.

Пасведчанне В. Дз. Панізніка

Сем доўгіх сутак працягваўся бой. Уладзімір Міклушонак вёў агонь прамой наводкай з зеніткі па наземных цэлях. Ствол гарматы не астываў. Наўкола дым і грукат. Нібы сцяна з асколкаў мін, снарадаў і бомбаў закрыла варожыя пазіцыі. Здавалася, прайсці праз яе жывому чалавеку немагчыма. Але цуд здарыўся. Горад быў вызвалены ад фашысцкіх войск. Толькі корпус Андэрса падчас штурму страціў больш 40 працэнтаў свайго складу. У італьянскай зямлі засталося нямала нашых суайчыннікаў, у тым ліку Марковіч з Гараняў, В. Мышко.

Толькі праз восем доўгіх гадоў вярнуўся У. І. Міклушонак да сям'і. Працаваў у калгасе, зведаў горыч сталінскіх рэпрэсій. Да баявых узнагарод Уладзіміра Іванавіча «За баявыя дзеянні ў Афрыцы», «За ўзяцце Монтэ-Касіна», «За ўзяцце Артоны» дабавілася польская медаль у гонар 50-годдзя абарончай вайны. Уручыў яе ў Глыбокім у 1989 г. консул ПНР.

## Да апошняга дыхання

Калі фашысцкая Германія напала на нашу Радзіму, я праходзіў службу ў фінансавай часці 455-га стралковага палка 42-й стралковай дывізіі ў цэнтры Брэсцкай крэпасці.

22 чэрвеня ў 4 гадзіны 15 мінут раніцы гітлераўскія войскі раптоўна рушылі да нашай граніцы, абрушыўшы на пагранічныя ўмацаванні і Брэсцкую крэпасць тысячы бомбаў, снарадаў і мін. Ад іх разрываў цытадэль над Бугам ператварылася ў вогненнае пекла. Але яе абаронцы не спалохаліся, прынялі ўдар на сябе і смела ўступілі ў бой з ворагам.

Лейтэнант Цыбульскі загадаў мне ўзяць двух байцоў і адшукаць у крэпасці камандаванне палка або яго штаб. Ён размяшчаўся, як было ўстаноўлена, у падвале 333-га стралковага палка, прыкладна ў 250 – 300 метрах. Каб пераадолець гэтую адлегласць, трэба было паўзці, бегчы, прабірацца праз будынкі, якія гарэлі.

З аднаго пакоя даносілася моцная ружэйная перастрэлка. Я асцярожна глянуў у пралом дзвярэй. Наперадзе мільганулі фігуры ў зялёных мундзірах. Прагрымелі выстралы, мы выкарысталі штыкі. Тут жа шэсць гітлераўцаў былі знішчаны. Забралі трафейныя аўтаматы і рушылі далей. Дабраліся да штаба палка і расказалі пра абстаноўку ў нашай групе лейтэнанту Патапаву. Ён сказаў: «Сюды ворагу ходу няма. Крэпасць застанецца нашай. Сувязь трымайце з намі, так і перадайце сваім таварышам». Але перадаць не было каму. Калі на наступны дзень мы дабраліся да свайго падвала, жывога там нікога не



Чувікаў А. А.

было. Памаўчалі, сціснулі зубы і папаўзлі назад. Калі вярнуліся, там ужо была наладжана тэлефонная сувязь з іншымі ўчасткамі абароны.

Каля цэнтральных варот крэпасці з'явіўся фашысцкі танк. «Хто артылерысты?» — спытаў Патапаў. Знайшліся двое: камандзір і старшына. Яны і знішчылі варожы танк.

Праз амбразуру падвала вядзём агонь па фашыстах і раптам бачым, што нехта паўзе ў нашым напрамку. Спынілі агонь. У хуткім часе мы ўбачылі акрываўлены дзіцячы тварык. Гэта была Валя Зенкіна, дачка старшыны 455-га стралковага палка. Маці фашысты ўзялі ў палон, а дзяўчынку (ёй было 12 гадоў) паслалі да абаронцаў крэпасці з запіскай аб здачы ў палон. Валя перадала паперку Патапаву і заплакала. Затым лейтэнант сказаў: «Ад нас ім перадай, што мы, савецкія воіны, у палон не здаёмся». Дзяўчынка стала плакаць яшчэ мацней і сказала, што не вернецца туды. Яна засталася ў крэпасці і даглядала параненых.

Цэнтральная частка цытадэлі над Бугам знаходзілася ў кругавой асадзе ворага. Вады з ракі Мухавец, на паверхні якой плавала шмат трупаў, нельга было дастаць, таму што земляны вал на супрацьлеглым беразе быў заняты фашыстамі. Днём яны адтуль вялі агонь, а ноччу асвятлялі падыходы ракетамі. Абаронцам крэпасці не было чаго есці, не хапала медыкаментаў, перавязачнага матэрыялу. Паміралі параненыя, а дапамагчы ім мы нічым не маглі.

Ва ўмовах поўнага акружэння, у тыле ворага, знаходзячыся ў невыносна цяжкім становішчы, доўгі час змагаўся маленькі гарнізон, абараняючы кожны крок роднай зямлі.

*А. А. Чувікаў,*
*удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці*

* * *

Франтавікі... Іх лёс падобны толькі ў тым, што ўсе яны прайшлі скрозь пекла вайны. Што да канца выканалі свой воінскі абавязак, выстаялі, перадолелі непамерныя цяжкасці, перамаглі. Аднак да той вялікай агульнай перамогі кожны ішоў сваім шляхам. Для І. А. Надзёжкі, жыхара райцэнтра, гэты шлях прайшоў скрозь гарачы напал баёў пры абароне Сталінграда, удзельнічаў ён у Курскай бітве, аперацыі «Баграціён», вызваляў Прыбалтыку, тройчы паранены, узнагароджаны дзевяццю медалямі.

У 1942 г. закончыў ваеннае вучылішча і ў званні малодшага палітрука накіраваны на фронт камандзірам 4-й роты 272-га стралковага палка ў Ста-



А. К. Сіняўскі



А. Я. Бунта


Э. Э. Адашкевіч


А. І. Шаўлюга


М. А. Шокель


П. І. Юхно


Дз. Л. Пацеенак


І. Г. Сарокін


П. І. Міклушонак


Я. І. Белавус


В. А. Грэцкі


У. І. Цітовіч

лінград І. М. Каняхін. А да гэтага ён ужо ўдзельнічаў у баях з ворагам на граніцы. Сталінград запомніўся яму цяжкімі баямі і раненнем, а мужнасць воіна адзначана медалём «За адвагу». Раненне на Курскай дузе, вызваленне Беларусі, раненне ў Прыбалтыцы. Пасля вайны — працятлая праца на Міёршчыне.

Аднак для большасці вясковых хлопцаў з Міёршчыны вайсковая служба пачалася пасля таго, як фронт пракаціўся па нашых мясцінах на захад. І зноў агульнае для ўсіх — прызыў, баявая вучоба, фронт. А потым — канкрэтны асабісты ўклад ва ўсенародную барацьбу з ворагам. Так, А. Я. Бунта з в. Пеступы быў артылерыстам, вёў агонь з 122-міліметровых гармат па Берліну. А. К. Сіняўскі з Вазаўнікоў — аўтаматчык, вызначыўся ў баях пад Дрэздэнам, фарсіраваў Нісу, цяжка паранены ў сярэдзіне красавіка 1945 г. Служыў у Вой-



А. Л. Васілеўскі



С. С. Кісель



І. І. Максімовіч



Ф. В. Мурашка



К. П. Ламанос



С. Д. Сушко



Р. А. Чарвінскі



М. С. Дзямешка

ску Польскім Э. Э. Адашкевіч з в. Бор Дварнасельскага сельсавета. Ён фарсіраваў Віслу, быў паранены. А. І. Шаўлюга з Дворнага Сяла з'яўляўся выдатным кулямётчыкам, з баямі дайшоў да Шаўляя. Пяццю медалямі адзначаны баявы шлях Дз. Л. Пацеенка з Канахоў. Вызваляў не толькі родную зямлю, але і Венгрыю, Румынію, Аўстрыю, Югаславію І. Г. Сарокін — жыхар в. Селішча. Дапамагаў партызанам, служыў у Чырвонай Арміі і Войску Польскім В. А. Грэцкі з Дворнага Сяла. Цяжка паранены ў баях і застаўся інвалідам У. І. Цітовіч з Крыштулёў. Штурмаваў Кёнігсберг М. А. Шокель з Дворнага Сяла. Яшчэ сярод франтавікоў з Дварнасельскага сельсавета вызначыліся ў баях, а затым у мірнай стваральнай працы П. І. Юхно, М. А. Пальчэх, І. І. Дзямід, Я. А. Заяц, І. М. Забароўскі, І. І. Лушчонак, П. І. Маляўка, М. А. Матэленак, П. А. Шокель, П. Ф. Шульга, В. К. Мацюк, Г. М. Малыш і інш.

Танкістам на 1-м Украінскім фронце ваяваў П. І. Міклушонак з в. Прорвы Даўгінаўскага сельсавета. З гэтага ж сельсавета сумленна ваявалі, а потым працавалі ў калгаснай вытворчасці Я. І. Белавус, А. Л. Васілеўскі, С. С. Кісель, К. П. Ламанос, С. Д. Сушко, Р. А. Чарвінскі. Сумленна выконвалі салдацкія абавязкі М. С. Дзямешка, І. І. Максімовіч, Ф. В. Мурашка, П. С. Путронак, У. К. Шук і многія іншыя.

У Завуццеўскім сельсавеце жыў адзін з абаронцаў Ленінграда І. М. Няміра.


П. С. Путронак


У. К. Шук


М. Г. Кастрыца


І. Р. Януць


І. М. Няміра


В. М. Корбут


В. Л. Асетнік


І. К. Шамшур


І. Л. Пятроўскі


Л. І. Пятроўскі


Н. Д. Матэленак


А. Н. Рабец



М. Ф. Сушко



А. А. Драба



В. Я. Лукавіцкі



І. Я. Мінчын



І. К. Дуброўскі



С. А. Кузьмін



Ф. К. Пятроў



Я. Р. Рубін

У 71-м супрацьтанкавым палку змагаўся з ворагам В. М. Корбут з в. Калатушкава, у 384-м стралковым палку — І. Л. Пятроўскі з Атрошкава, у 932-м — Л. І. Пятроўскі. Праявілі сябе сапраўднымі воінамі на дарогах мінулай вайны М. Г. Кастрыца, І. Р. Януць (в. Галомысла), А. У. Свяцкі з Папшулёў, І. П. Лапіцкі і У. М. Кубліцкі з Цвеціна, А. П. Шаўлюга з Кавалёва, В. І. Мятла з Гаёўкі, Д. В. Касаты з Касатых, Л. Р. Бялевіч з Шатравак, С. А. Шакур і У. І. Шугальскі з Лыскі, П. П. Фурс з Галомысла, С. С. Рунда з Рундаў, М. М. Лавейка і С. Л. Пятроўскі з Мётлаў, М. А. Гусак з Сачывак, М. І. Федарэц з Мазурына і інш.

Глыбокі след пакінулі ў лёсе І. В. Вайтовіча з в. Якубава, С. С. Ігнацьева з в. Шантырава, Р. Я. Панкрата з в. Сакалова, А. А. Прэдкеля з в. Арханава, П. Г. Таралакі з в. Мікалаёва і іншых жыхароў Мікалаёўскага сельсавета падзеі вайны.

Штурмаваў Кёнігсберг жыхар в. Пустошка Н. К. Сільмановіч, фарсіраваў Одэр Я. А. Кукуць з в. Белеўцы, прайшлі франтавымі дарогамі шмат вёрст жыхары Новапагосцкага сельсавета В. Л. Асетнік, Я. Ф. Васільеў, Р. Г. Насыр, П. І. Марцінкевіч, В. А. Гірын, С. Ц. Басакоў, В. Ф. Цімафееў, А. К. Пугаўка, А. І. Кунцэвіч, С. Ф. Сырэвіч, В. І. Дубчонак, Г. В. Ляскоўскі, М. І. Кунцэвіч, У. І. Мятла.

Сярод ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Павяцкім сельсавеце Ф. П. Віктараў, А. К. Лапко, П. Ю. Пупін, у Перабродскім — Я. Н. Нікіцін, А. К. Мядзведзеў, І. А. Казачонак, П. І. Афа-



А. А. Тамашэвіч (2-гі рад справа)

насьеў, Ф. Н. Іваноў, С. П. Петракевіч, Ф. Н. Сівіцкі, Л. І. Краўчонак, А. П. Ракіцкі, І. Б. Матэленак, Ц. С. Пушкароў. Пералічыць усіх немагчыма.

Змагаўся з ворагам у партызанах і на фронце І. К. Шамшур з в. Сушкі з Чэраскага сельсавета, нялёгкія франтавыя дарогі за плячыма Н. Д. Матэленка з Чэрасаў, А. Н. Рабца з Малой Кавалеўшчыны, М. Ф. Сушко са Старых Крукоў, В. С. Марозава, Г. М. Калесніка, І. І. Сівага, А. А. Тамашэвіча і інш.

Узнагародамі адзначаны баявы шлях жыхароў раёна А. А. Драбы, І. К. Дуброўскага, С. А. Кузьміна, А. П. Козела, В. Я. Лукавіцкага, І. Я. Мінчына, Ф. К. Пятрова, Я. Р. Рубіна. Дзякуючы намаганням, мужнасці землякоў-франтавікоў мы выстаялі, перамаглі ў Вялікай Айчыннай вайне.

*Л. А. Матэленак*

## Баец французскага Супраціўлення

Здарылася так, што двое людзей з аднымі і тымі ж марамі, з адной і той жа доляй выехалі адзін з Заходняй Беларусі, другі з Заходняй Украіны ў далёкую, чужую краіну. І адна і тая ж шахта ў Паўночнай Францыі паглынула ў сваіх чорных забоях двух маладых мужчын, якія, як і многія іх суайчыннікі, не змаглі здабыць хлеба на захопленай белапалякамі роднай зямлі. Блізасць мовы і славянскай крыві парадніла на чужыне беларуса Аляксандра Дзмітрыевіча Панізніка і ўкраінца Васіля Пятровіча Плішчука.

### Апавяданне былога эмігранта

— Зямлі ў майго бацькі не тое, што ў папа ці пана. Вось і прыйшлося з «раю» на ўсходніх крэсах падацца ў снежні 1929 г. на шахты далёкай Францыі. Многія тады ехалі ў свет на заробкі, шукаць кусок хлеба, ласкавейшую долю.

Ля горада Валанс'ена, што знаходзіцца недалёка ад граніцы з Бельгіяй, па кантракту з кампаніяй «Анза» я працаваў шахцёрам. Многа нас было эмігрантаў: палякаў, беларусаў, украінцаў. Пасля работы мы часта збіраліся разам. Потым стварылі культурна-асветніцкае аб'яднанне імя Тараса Шаўчэнкі. У чэрвені 1936 г. у нас адбылося пасяджэнне, на якім старшынёй аб'яднання быў абраны Такарскі Міхаіл, сакратаром — Васіль Плішчук. А я быў назначаны «скарбнікам», гэта значыць адказным за фінансавыя справы. Усяго ў арганізацыю ўваходзілі 72 чалавекі.

У выхадныя дні наш драматычны гурток ставіў п'есы ў рабочых пасёлках і навакольных гарадах, выступаў наш хор. Увесь даход ад гэтых мерапрыемстваў прызначаўся на дапамогу рэспубліканскай Іспаніі. Камуністычная партыя (а я стаў членам камуністычнай партыі Францыі 22 студзеня 1932 г.)

заклікала нас выканаць свой інтэрнацыянальны абавязак перад іспанскімі рабочымі. У дапамогу Іспаніі мы збіралі грошы, прадукты харчавання, вопратку для дзяцей.

Многія эмігранты вызваліся ў гэты час ехаць добраахвотнікамі ваяваць у Іспанію. Паехаў туды і мой зямляк Уладзімір Мароз. Ён так і не вярнуўся дадому. Загінуў у баі пад Мадрыдам.

Нашы польскія сябры былі першымі з эмігрантаў, каго напаткала гора другой сусветнай вайны. А ў 1940 г. праз наш дэпартамент прайшлі калоны нямецкіх войск.

У той час, калі мы сабраліся ў эвакуацыю, з'явіліся першыя сімптомы маёй хваробы: ад цяжкай працы ў шахтах з невыноснымі ўмовамі захварэў рэўматызмам. Далёка ад сваіх кварталаў нам адысці так і не давялося. Хутка французска-нямецкі фронт перастаў існаваць. Немцы прарвалі абарону. Над галовамі пралятали дзесяткі самалётаў са свастыкай.

Усе дарогі былі перарэзаны гітлераўцамі, і мы вярнуліся назад. Пры акупацыі працягвалі працаваць на шахтах. Гэта афіцыйна. Увогуле праца давала мізэрныя вынікі. На-гара вугалю ішло вельмі мала. Многія з нас зусім адмаўляліся працаваць, зрывалі адпраўку паліва. Але партыя дала рэкамендацыю камуністам не пакідаць сваіх месцаў для падпольнай работы, для дыверсій на шахтах. Французская камуністычпая партыя была аб'яўлена ўладамі распушчанай яшчэ ў верасні 1939 г. Але на самай справе яна працягвала жыць, мабілізоўвала камуністаў і рабочых на барацьбу з фашызмам.

Многія з нашых таварышаў па падполлі аддалі жыццё ў гэтай барацьбе. Так, Уладзімір Юргевіч, Аляксей Гай разам са сваімі сябрамі былі схоплены ў 1943 г. немцамі і загінулі ў засценках гестапа.

15 мая 1941 г. у Францыі было створана масавае патрыятычнае аб'яднанне Нацыянальны фронт. Самай значнай з'явай таго часу было ўзнікненне руху пад назвай «Свабодная Францыя», які ў чэрвені 1942 г. узначаліў дэ Голь.

Не засталіся ўбаку ад падзей, якія разгортваліся тут, і мы, іншаземныя рабочыя. Нацыянальны фронт узмацніў сваю барацьбу з чэрвеня 1941 г., пасля таго як Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. Цяпер фронт барацьбы стаў адзіным.

У маі 1942 г. я ўступіў добраахвотнікам у Польскія ўзброеныя сілы ў Францыі, што ўваходзілі ў адзіны фронт Супраціўлення, больш актыўнымі ўдзельнікамі якога былі францірэры («вольныя стралкі») і партызаны. Я атрымаў кніжку добраахвотніка-валанцёра, дзе значыўся як капрал пад нумарам 1630. І быў байцом шостай роты другога батальёна першага палка.

Францірэры і партызаны былі звязаны з народнай міліцыяй. Нашы арганізацыі друкавалі і распаўсюджвалі падпольныя газеты і часопісы, вялі антыфашысцкую прапаганду, арганізоўвалі новыя ўзброеныя атрады — патаемную армію.

Кожная вестка з Усходу аб перамогах савецкіх людзей над гітлераўскімі захопнікамі ўсяляла ў мяне і таварышаў па падполлі новыя сілы. Думалася, што і наш невялікі ўклад у барацьбу супраць ворага можа быць маленькім раўчуком, які сілкуе магутную плынь вясенняй паводкі.

### Апавяданне яго сябра Васіля Плішчука

Невялікая бялюткая хатка Васіля Пятровіча Плішчука стаіць на віду ў Карпат. Яму і яго жонцы з таго часу, як у 1947 г. вярнуліся на радзіму, так і не давялося сустрэцца са сваім бліжэйшым сябрам па эміграцыі. Таму, калі зайшла гаворка пра Аляксандра, Васіль Пятровіч з радасцю падзяліўся сваімі ўспамінамі:

— У вельмі складаных умовах прыйшлося жыць нам у перыяд 1940—

1944 гг. Але кожны падпольшчык разумеў, што нясе з сабой фашызм. Пра Аляксандра скажу, што ён прыняў вельмі актыўны ўдзел у нашай падпольнай барацьбе. Наша арганізацыя была падзелена на сектары. А сектары складаліся з троек. Так, Аляксандр Панізнік арганізоўваў сярод іх падпольную работу, быў адказным за адзін з сектараў, збіраў грошы сярод рабочых на падтрыманне партыйнай дзейнасці.

У мяне быў схаваны радыёпрыёмнік. І Аляксандр кожны вечар у падвале ўключаў Маскву, запісваў апошнія паведамленні, зводкі з фронту. А мы потым распаўсюджвалі навіны сярод насельніцтва. Яму даручалі і лістоўкі. Яны разыходзіліся па тройках сектара. А назаўтра людзі знаходзілі іх пад парогам сваёй кватэры, у паштовых скрынках.

У нас былі свае падпольныя выданні. Газета на польскай мове «Дзённік людовы», а на ўкраінскай мове выходзіла «Библиотека батьківщини». Яны перажылі вайну і пасля выгнання акупантаў з Францыі пачалі выходзіць легальна. Вялікая заслуга ў тым, што яны выжылі, належыць майму сябру Аляксандру.

У сваёй антыфашысцкай дзейнасці мы падпарадкоўваліся нашаму кіраўніку, які меў партыйную клічку Тарас. Запомніліся прозвішчы радавых байцоў Супраціўлення: Аляксандра Качана, Аляксандра Кандрацюка, Сцяпана Затыльнага, Васіля Палкевіча. Пасля вайны яны вярнуліся дадому.

### Аб чым гавораць дакументы

Строга афармленая партыйная кніжка члена ФКП за 1944 год. Калі яе выдавалі, яшчэ сеяла смерць вайна. Уладальнік такога білета меўся быць расстраляны адразу ж пасля арышту. Нездарма на вокладцы выціснуты надпіс, што гэта членская кніжка «партыі расстраляных», члены якой змагаліся



А. Д. Панізнік

і тысячамі пралівалі сваю кроў для таго, каб жыла Францыя.

Членскую картку за нумарам 295062 атрымаў у 1944 г. і Аляксандр Дзмітрыевіч Панізнік. А вось дакумент, выданы 27 лістапада 1944 г. начальнікам асобнага батальёна савецкіх партызан імя Сталіна ў г. Энен-Льетар.

